№ 3 (409) 21 студзеня 2005 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

**Ці будзем з ураджаем?**
Клімат і прырода. старонка 4

**Кібэрспорт**
Культура новага пакаленьня. старонка 8

**Аляксандар Сыман**
Постаць найлепшага біятляніста Беларусі. старонка 21

**Франц Сіўко**
Праца — як наркотык. старонка 19

ПАЛІТЫКА

## Сінявокая рэвалюцыя

Васількавую рэвалюцыю абяцае **Мікола Статкевіч**. Кааліцыя «Свабодная Беларусь» вылучыла яго кандыдатам на прэззыдэнта. Варыянт перамогі на выбарах без рэвалюцыі не разглядаецца. Старонка 2.

ГАСПАДАРКА

## Зьніжкі не для бедных

Размовы пра стварэньне сеткі дыскаўнтэраў — «эканамічных» супэрмаркетаў — вядуцца даўно. Першы такі маркет «На тыдзень» пачаў працаваць 14 студзеня ў сталічнай Кунцаўшчыне. Першае ўражаньне: ужо «цяплей», але яшчэ ня «горача». Старонка 4.

МОВА

## Звод клясычнага правапісу гатовы

«Каб правапіс быў ня рэбусам, а інструмэнтам, простым для карыстальніка». Група мовазнаўцаў практычна завяршыла сваю працу над новым Зводам правілаў клясычнага правапісу. Праект дасланы на апошнія рэцэнзіі. Мяркуецца, што пасьля надрукаваньня ім будуць кіравацца незалежныя выданьні і скончыцца разнабой. На пытаньні «НН» адказвае **Зьміцер Саўка**. Старонка 17.

# Парнаграфія

Дзіцячае порна: запісы рахункаў беларускай кампаніі «Regpay Co.» прывялі да арышту амаль тысячы кліентаў па ўсім сьвеце. Пра самую буйную ў гісторыі Інтэрполу апэрацыю піша **Алесь Кудрыцкі**. Старонка 3.



Ленін.by

Тэма нумару. Старонка 13

PHOTO.BYMEDIA.NET

З УСІХ СТАРОН

**Як украінскія гэбісты зьмянілі лёс нацыі**

Кіраўнікі СБУ перадавалі інфармацыю аб фальшаваньні выбараў праціўнікам Кучмы, клапаціліся пра бясьпеку лідэраў апазыцыі і дэманстрантаў, удзельнічалі ў псыхалягічнай вайне з чыноўнікамі. **Старонка 10**.

НАШЫ ДЗЕТКІ

**Развагі каля калыскі**

Як выхоўваць дзіця і пры гэтым належаць сабе, захаваць свае сацыяльныя ролі? **Старонка 12.**

НОВЫЯ КНІГІ

**Аляксандар Ельскі**

Працы пісаў па-польску, друкаваўся ў энцыклапэдыях, а ў дадатак быў панам. Для «дыктатуры пралетарыяту» ён стаў пэрсонай нон грата. Новы том Залатой сэрыі «Кнігазбору». **Старонка 9.**

ЛІТАРАТУРА

**Марыя Барадзіна**

Маленькі сокал. Новыя вершы. **Старонка 18.**

**Дык падпісвайся!**

Падпісны індэкс «Нашай Нівы» 63125. Падпіску прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапікі «Белсаюздруку». Цана на месяц — 3820 рублёў на поштах або 3530 рублёў на шапікі «Белсаюздруку». «Наша Ніва» — гэта 24 старонкі без чужога слова штотыдзень. Чытай сваё!

АД РЭДАКЦЫІ

# Лінія Сталіна

АНТ з бээрэсэмаўскім аптымізмам паведаміла краіне, што да «60-годзьдзя вялікай перамогі» ў Беларусі зьбіраюцца аднавіць… «лінію Сталіна». Ля тых абарончых збудаваньняў на міжваеннай савецка-польскай мяжы, паводле ўра-гісторыкаў з АНТ, у першыя дні вайны было зьнішчана чатырыста (?!) нямецкіх танкаў. У адноўленых дотах турысты змогуць пабачыць муляжы савецкіх вайскоўцаў і іх амуніцыю, пастраляць халастымі патронамі з кулямёта, уявіўшы сябе абаронцамі «сьвяшчэнных рубяжоў». Такая сабе адрыжка расейскай моды — там да 60-годзьдзя зьбіраюцца паставіць помнік Сталіну ў Белгародзкай вобласьці.

У лінію Сталіна, што цягнулася ад Балтыкі да Чорнага мора, саветы гахнулі сродкі дзьвюх першых пяцігодак. Лінія Сталіна — гэта ланцуг 24-х УРаў (умацаваных раёнаў), кожны да 180 кілямэтраў у даўжыню і да 30 км у глыбіню. У кожным — доты, падземныя галерэі, склады, водаправод, камандны пункт, кулямёты і гарматы. Штучныя вадаёмы, мінныя палі, павуціньне камунікацыяў. На час іх будаўніцтва НКВД «закрывала» цэлыя раёны ад чужых вачэй. Самі будаўнікі слаба ўяўлялі агульны плян умацаваньняў — апроч сапраўдных, ствараліся дзясяткі фальшывых дотаў.

Лінію Сталіна так і не дабудавалі. Пакт Молатава—Рыбэнтропа перасунуў мяжу на сотні кілямэтраў на Захад, і гэтыя УРы засталіся ў глыбокім тыле. Сталін не зьбіраўся бараніцца на сваёй тэрыторыі. Гіганцкія фартыфікацыйныя збудаваньні, якія вымагалі догляду і абслугоўваньня, толькі блыталіся б пад нагамі ў часе бліцкрыгу па Заходняй Эўропе. Перад вайной зь лініі Сталіна зьнялі ўзбраеньне, умацаваньні пачалі бурыць. На новай мяжы пачалі ўзводзіць «лінію Молатава» (без Рыбэнтропа). Менавіта таму затрымаць немцаў на лініі Сталіна за Койданавам у 1941-м выпадковыя абаронцы, косткі якіх дагэтуль знаходзяць у бэтонных студнях дотаў, не маглі. Вось, дарэчы, плюс агучанай ініцыятывы: пахаваюць нарэшце апошніх непахаваных.

Але запускаць брэнд «лініі Сталіна»? Сталіна, на сумленьні якога мільёны ахвяраў. Сталіна, які бяздарна аддаў Беларусь у рукі нацыстаў, ня выкарыстаўшы сваёй «лініі», які бяздарна паклаў у зямлю мільёны салдатаў. Называць гістарычную памятку Беларусі «лініяй Сталіна» могуць толькі людзі бяз розуму. Або, што называецца, духоўныя нашчадкі Сталіна. Для якіх «ня ўсё толькі кепскае…» і «гэта ж тожа наша гісторыя». Імя Сталіна, як і імя Гітлера, — не для музэйных комплексаў.

**Андрэй Скурко**

# Сінявокая рэвалюцыя


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

18 студзеня БСДП (НГ) «паводле вэрсіі Статкевіча» (пасьля фактычнага расколу партыі даводзіцца ўдакладняць, пра якую яе частку ідзе гаворка) склікала ў сваім офісе на плошчы Мясьнікова прэс-канфэрэнцыю. У невялікім пакоі сабралася з тузін журналістаў, а таксама людзі з Эўрапейскай кааліцыі «Свабодная Беларусь». На стале — стос раздрукоўвак кааліцыйнай заявы, у ёй словы пра тое, што «працэс выпрацоўкі стратэгіі дзеяньняў і вылучэньня адзінага кандыдата зацягваецца». Статкевіч кажа прасьцей: «БТ нас мажа па сьценцы, а мы дагэтуль пра стратэгію думаем».

«Свабодная Беларусь» вырашыла падагнаць апазыцыю сваім прыкладам і вылучыла ў кандыдаты на ролю адзінага лідэра Міколу Статкевіча. Разьлік на тое, што цягам месяца вызначацца астатнія партыі. Падзякаваўшы за давер, Статкевіч зрабіў невялікую прамову, якую ўжо можна назваць перадвыбарнай. «У нас ёсьць Беларускі дом, але ў ім нешта ня тое. Ўражаньне, што гэта — абложаная крэпасьць, з камэндантам і гарнізонам, абкружаная высокімі сьценамі. Трэба гэтыя сьцены ламаць», — заявіў ён. Статкевіч таксама абмаляваў і свае прыярытэты — пераход да парлямэнцка-прэзыдэнцкай рэспублікі, вайсковы нэўтралітэт ды сяброўства ў Эўразьвязе, якога можна дасягнуць «праз пяць-шэсьць гадоў».

Паводле «Свабоднай Беларусі», будучая кампанія мае быць афарбаваная ў колер сьцяга Эўразьвязу, а яе сымбалем мусіць зрабіцца васілёк. «Гэта будзе васільковая рэвалюцыя — яе колерам будзе сіні з залатымі зоркамі. Рэвалюцыя бяз гвалту, але з эўрапейскімі каштоўнасьцямі ў сэрцы», — сказаў Павал Севярынец, што таксама прысутнічаў на прэс-канфэрэнцыі. Мікола Статкевіч нават жартам абмаляваў апакаліптычны сцэнар падзей: міліцыянты ладзяць аблавы на бабулек, што гандлююць фіялкамі ў пераходах, жытнёвыя палеткі масава прапалваюць ад валькоў, а «Славянскі базар» адмаўляецца ад свайго лягатыпу.

У справе вылучэньня кандыдатаў на апазыцыйнае лідэрства сэнсацый пакуль няма — адно «ньюсмэйкерства». Аднак што будзе рабіць Статкевіч, калі зьявіцца відавочна больш моцны кандыдат? «Я гатовы саступіць, але пры адзінай умове — адзіны кандыдат мае быць натхняльнікам выхаду людзей на вуліцы». Праўда, на нечаканасьці ў асобе «супэркандыдата» ён ня вельмі разьлічвае: «У нас тэлевізара няма, калі кандыдат з табакеркі выскачыць — не раскруцім. Трэба на машыну садзіцца і ехаць у рэгіёны».

**Алесь Кудрыцкі**


PHOTO.BYMEDIA.NET

**УЗРОСТ ВЫСЬПЯВАНЬНЯ. Беларускі ліцэй 15 студзеня адзначыў 14-годзьдзе. Месца сустрэчы традыцыйнае — забраны будынак па вул.Кірава. Там сабраліся ліцэісты, бацькі й выкладчыкі, выпускнікі. Падзялілі на ўсіх каравай, запусьцілі ў неба белыя й чырвоныя балёнікі. Пасьля стаялі ланцугом на праспэкце Скарыны, сьпяваючы ліцэйскі гімн. І нават АМОНаўцы, атрымаўшы ў падарунак бел-чырвона-белыя кветкі, з павагай прасілі ліцэістаў разысьціся.**

IN MEMORIAM

# Браніслаў Плотнікаў

Пайшоў з жыцьця Чалавек вялікае душы, Асоба, гаспадар свайго слова, Мужчына, які сьціпла прымаў ганараваньні і годна пераносіў удары лёсу. У 5 гадоў (нарадзіўся 15 сьнежня 1940 г. у Быхаве), ён застаўся без бацькоў, выхоўваўся ў Грудзінаўскім дзетдоме. Далей — школа, рамеснае вучылішча, праца машыністам, войска, вучоба на філфаку БДУ. Усё сваё жыцьцё ён аддаў філялёгіі. Звыш 300 навуковых прац, у тым ліку больш за 30 кніг — спадчына вялікага вучонага, доктара філялягічных навук, прафэсара, ляўрэата Дзяржаўнай прэміі. Браніслаў Плотнікаў быў сапраўдным інтэлігентам. Ён быў таленавіты ва ўсім: песьня беларуская, песьні славянскіх народаў у яго выкананьні ўпрыгожвалі любую вечарыну. Яго жарт, дасьціпнае слова, тост гарманічна дапаўнялі вастрыню навуковага досьведу. Асобная старонка біяграфіі Браніслава Аляксандравіча — яго праца на пасадзе дэкана філялягічнага факультэту БДУ.

Сьпі спакойна, наш дарагі калега, настаўнік, дружа!

**Уладзімер Кароткі**

Рэдакцыя «НН» выказвае спачуваньні блізкім Браніслава Плотнікава. Мы будзем памятаць яго як навукоўца, які ў 1998 годзе абараняў права «Нашай Нівы» выдавацца клясычным правапісам.

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

## EGOізмы

**20 студзеня** ў Чырвоным касьцёле адбудзецца прэзэнтацыя кнігі Сяргея Абламейкі «EGOізмы» з сэрыі «Вострая Брама» віленскага выдавецтва «Наша Ніва». Пачатак а 18-й.

## Цыркуноў у Вялейцы

11 студзеня ў Вялейцы адчынілася выстава мастака Алеся Цыркунова — «Асоба і час». Гледачам прапануецца больш за 50 партрэтаў дзеячаў мінулага — Вітаўта, Скарыны, Ермаловіча, Танка. Праз гэтыя імёны мастак перакінуў мост памяці да жывых сучасьнікаў. Больш пра выставу і гутарку з мастаком чытайце ў наступнай «НН».

АПЫТАНЬНЕ «НН»

# Што такое Ленін

Учора на акне ў мэтро я бачыла яго профіль, умаляваны ў контур чырвонай зоркі. Пад малюнкам — подпіс. Піянеры назьбіралі мэталалому, зь яго пабудавалі вагон мэтро (!), а Ленін тут дзеля таго, што гэта ён стварыў такую беззаганную сыстэму, калі дзеці зьбіраюць жалеза, макулятуру і зграбаюць лісьце на суботніках, замест таго каб іграць на бас-гітары і паліць марыхуану. Леніну — дзякуй за зіму і лета, вясну і восень, Леніну — безьліч хвалебных песень, вершаў і чужога таленту, Леніну — па Леніну на поўны рост у кожнае мястэчка, па бюсьце Леніна ў кожную буйную вёску, Леніну — вуліцы, плошчы і станцыі мэтро. А што такое гэты «Ленін», наўрад ці растлумачыць і той, хто ўпарта замазвае «плошчу Леніна» ў падземнай электрычцы і асадкай вяртае «незалежнасьць» на яе месца.

Ці ведаюць сёньняшнія маладыя, хто гэты безвалосы чалавек з працягнутай рукой, зь якім нам прыйдзецца сумесна жыць яшчэ невядома колькі часу, пакуль экскаватар не падыме яго ўгору і не разгайдае, а працягнутая рука не памахае на вечнае разьвітаньне? Я вырашыла задаць наступныя пытаньні выпадковым і невыпадковым маладым людзям: хто такі Ленін? Больш добрага ці больш дрэннага ён зрабіў для Беларусі?

**Наста вучыцца на другім курсе на філфаку**, Ленін для яе — «герой адной дзіцячай кніжкі, якая неяк тупа па-дэбільнаму называлася: «Дзяцінства Ўльянава» ці нешта падобнае». «Для Беларусі Ленін зрабіў больш добрага, чым кепскага, ня ў

Працяг на старонцы 13.

# Парнагрошы: беларускія карані

Рычарда Бэлаха заўжды паважалі ў яго родным каліфарнійскім мястэчку Рэдонда-Біч. Прафэсійны пажарнік, ён пайшоў на заслужаны адпачынак з мэдалём Адвагі на грудзёх. 54-гадовы вэтэран барацьбы з агнём не забываўся на сваю старую працу і нярэдка завітваў на мясцовую пажарную станцыю. «Хай панастальгуе», — думалі маладзейшыя супрацоўнікі і з усьмешкай назіралі за тым, як сталы чалавек ціха сядаў у кутку ды ўключаў кампутар, каб пацешыцца бясплатным Інтэрнэтам. Яны й не здагадваліся, што ў гэты час Рычард згружаў зь сеціва фота непаўналетніх аголеных дзяўчынак.

Цяпер Бэлаху «сьвеціць» не адзін год турмы — гэтага дастаткова, каб пазаймацца геаграфіяй ды даведацца, дзе знаходзіцца Беларусь — радзіма людзей, якія пастаўлялі яму «бяскрыўдныя інтэрнэт-забаўкі». Пастаўшчыкі, дарэчы, ужо таксама знаходзяцца ў ЗША, дзе чакаюць суду па абвінавачаньні ў злачыннай змове, адмываньні грошай, стварэньні і распаўсюджваньні дзіцячай парнаграфіі.

год. «Regpay Co.» адна за год зарабляла 3 млн даляраў — амаль у 10 разоў больш, чым усе астатнія вэбмайстры краіны разам узятыя.

У 2003 г. падчас аднаго з рэйдаў супраць аматараў дзіцячага порна амэрыканскія спэцслужбы заўважылі, што многія з затрыманых карысталіся паслугамі «Connections». Прыпёрты да сьценкі сьледчымі, прэзыдэнт фірмы Юджын Валентайн расказаў усё пра свае сувязі з «Regpay Co.». Але тут давялося сутыкнуцца з праблемай: цэнтар парнасеткі знаходзіўся ў Беларусі. Калі б кіраўнікоў кампаніі і затрымалі, дык у найлепшым выпадку пасадзілі б гадоў на пяць ці ўвогуле далі б штраф. А экстрадыцыя беларускіх грамадзян зь іх уласнай краіны ў ЗША — справа нерэальная.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Спажывец дзіцячай парнаграфіі — крымінальнік па сваёй сутнасьці.

## Дзеці вэб-буму

Маладыя гады Ягора Залатарова (1979 г.н.) прыпалі акурат на залатыя 1990-я, калі Інтэрнэт прыцягваў да сябе маладыя таленты, нібы Кландайк золаташукальнікаў. Але ў адрозьненьне ад многіх інтэрнэт-бізнэсоўцаў, Ягорка намацаў залатую жылу — дзіцячы парнабізнэс, які абяцаў цалкам дарослыя прыбыткі.

Разам са знаёмымі ён зарэгістраваў у Менску фірму «Regpay Co.». Пад шыльдай высокатэхналягічных інтэрнэт-сэрвісаў гэтая кампанія цішком аказвала паслугі аплаты для ўладальнікаў і карыстальнікаў пяцідзесяці парнаграфічных сайтаў, а яшчэ й сама ўтрымлівала ня менш за чатыры такія вэб-старонкі. Плаціць падаткі ў беларускі бюджэт хлопцы не зьбіраліся, таму вынайшлі наступную схему працы. Замежны аматар порна пераводзіў суму (50 даляраў за месячны абанэмэнт на доступ да сайтаў) на адмысловы кліенцкі рахунак у фірме «Connections» у штаце Фларыда, якая гарантавала яму ананімнасьць і, здымаючы свой працэнт, пераводзіла грошы ў адзін з латвійскіх банкаў, да якога мелі доступ уладальнікі «Regpay Co.».

«Regpay Co.» была мікраскапічнай фірмай, але справы яна «пракручвала» немалыя. Самыя буйныя легальныя грошы ў беларускім Інтэрнэце робяцца на рэкламе. Аб'ём гэтага рынку складае каля 350 000 даляраў у

## Апэрацыя «Ястраб»

Пра зьмест закулісных перамоў паміж спэцслужбамі можна толькі здагадвацца, але «копы» знайшлі паразуменьне з нашымі «органамі». Вядома, што група супрацоўнікаў МУС выяжджала ў ЗША ў рамках расьсьледаваньня, а прадстаўнікі амэрыканскіх праваахоўных органаў прыяжджалі ў нашу краіну. Беларускае аддзяленьне Інтэрполу таксама было «ў курсе». Дзялкоў з «Regpay Co.» вырашылі не пужаць, а злавіць тады, калі яны завітаюць у краіны «цывілізаванага Захаду». Гэтай апэрацыі нават далі асобную назву — «Ястраб» («Falcon»).

У ліпені 2003 г. Залатарова і Бучнёва нейкім чынам удалося завабіць у Францыю. Абед у адной з парыскіх рэстарацый гэтая парачка скончыла ўжо ў кайданках. Яны адчайна абараняліся ў судзе ад экстрадыцыі ў Амэрыку, але 5 студзеня іх пасадзілі на самалёт і накіравалі за акіян пад наглядам ахоўнікаў. Іншы супрацоўнік «Regpay Co.», 29-гадовы Аляксандр Бойка, падобным чынам перамясьціўся з Гішпаніі ў камэру ў Нью-Джэрзі — штаце, пракурор якога распачаў крымінальную справу.

Запісы рахункаў кампаніі «Regpay Co.» прывялі да арышту амаль тысячы кліентаў па ўсім сьвеце, якіх вылічылі па нумарах крэдытак — выявіць імёны іх уладальнікаў дапамагла швайцарская паліцыя. 200 арыштаваных — грамадзяне ЗША, у тым ліку школьны настаўнік з Каліфорніі, афіцэр паліцыі з Бафала, каталіцкі сьвятар з Луізіяны, кіраўнік аддзелу пэдыятрыі адной зь нью-ёрскіх бальніц і нават цыркавы клоўн. Яшчэ некалькі тысяч кліентаў «Regpay Co.» знаходзяцца «ў распрацоўцы». Некаторым зь іх пагражае да 20 год турмы і штрафы ў чвэрць мільёна даляраў. Аўстралійскі камісар фэдэральнай паліцыі Мік Кілці назваў гэтае расьсьледаваньне «самым буйным у гісторыі міжнароднай паліцыі». У судзе знаходзяцца справы 200 аўстралійскіх кліентаў «Regpay Co.». Шасьцёра зь іх ужо зрабілі сабе сьмерць.

## Калегі па цэху

Памыляецца той, хто думае, што справа «Regpay Co.» — агіднае выключэньне. Тыдзень таму ў Нямеччыне затрымалі трох нашых суайчыньнікаў. Абвінавачаньне — распаўсюджваньне дзіцячай парнаграфіі. Самі яны порна не стваралі, а толькі прадавалі доступ да парнасайтаў. Група вяла бізнэс зь Беларусі, а ў Нямеччыну прыехала поўным складам, каб атрымаць грошы. Там парнадылеры зьбіраліся «кінуць якар» — пасьля гучнага затрыманьня каманды «Regpay Co.» займацца «справай» у Беларусі зрабілася небясьпечна. Тым больш што ў Нямеччыне яны займелі падзельнікаў — нешта накшталт «міні-мафіі», якая складалася з эмігрантаў зь Беларусі.

Варта прыгадаць і асобу іншага беларускага грамадзяніна Яўгена Пятроўскага. Ягонае імя ўсплыло ў 2003 г. падчас арышту людзей з «Regpay Co.» — сьцьвярджалася, нібыта Пятроўскі мог мець да гэтай фірмы нейкае дачыненьне. Ён пачынаў сваю кар'еру з махінацый з крэдытнымі карткамі, а потым пераключыўся на парнабізнэс, заснаваў два буйныя сайты ў дамэннай зоне .ru ды ўласную плацёжную сыстэму «Sunbill», якая потым была перайменаваная ў «Billcards». Зь яе дапамогай Пятроўскі дапамагаў уладальнікам парнасайтаў прымаць плацяжы ад кліентаў, атрымліваючы мільённыя прыбыткі. Праз нейкі час Пятроўскі пераключыўся на расейскую сыстэму «CyberPlat», але пасьля скандалу вакол яе сышоў у цень і, паводле чутак, зьехаў з краіны, уклаўшы грошы ў звычайны бізнэс.

## Злачынствы й пакараньне

«Дзіцячага порна ў нас няма!» — так, напэўна, думалі ўкладальнікі беларускіх законаў. Артыкул 173 Крымінальнага кодэксу прадугледжвае максымальны тэрмін пяць год турмы за гвалтоўнае ўцягненьне дзіцяці ў парназдымкі (за негвалтоўнае адвакат можа выпрасіць арышт да шасьці месяцаў). Распаўсюджваньне порнаматэрыялаў (па гэтым артыкуле, хутчэй за ўсё, праходзіла б у беларускім судзе кіраўніцтва «Regpay Co.») — штраф да 10 базавых велічынь (да 50 — калі злачынец кіраўнічая асоба). За выкарыстаньне порна ў асабістых мэтах пакараньня няма.

У ЗША ня робяць адрозьненьня паміж уцягваньнем дзяцей у парнаграфію, яе распаўсюджваньнем і спажываньнем. Пакараньне — буйны штраф ці 15 год турмы, у найбольш сур'ёзных выпадках — да 30 год турмы.

Цалкам магчыма, што нехта ўжо стварае «Regpay-2». Таму амэрыканцы б'юць ня толькі па парнадылерах, але й па спажыўцах — яны спадзяюцца пазбавіць вытворцаў крыніцы даходаў. Каб патэнцыйныя кліенты гэтых сайтаў проста баяліся імі карыстацца. Адсутнасьць у Беларусі крымінальнай адказнасьці за спажываньне дзіцячага порна ня лезе ні ў якія вароты — на сайтах з сыстэмы «Regpay Co.» былі нават здымкі хлопчыкаў і дзяўчынак узростам ад двух гадоў. Спажывец такой «прадукцыі» — крымінальнік па сваёй сутнасьці.

Суд над кіраўніцтвам «Regpay Co.» пачнецца ў Нью-Джэрзі 1 сакавіка. Прагнозы адносна прысуду для парнадылераў — да 30 год турмы кожнаму.

## СЬЦІСЛА

### Помнік Скарыну

мае адкрыцца ў чацьвер у Караляўцы (Калінінградзе). У гэтым горадзе Скарына працаваў пры каралеўскім двары. Помнік паўстаў на грошы беларусаў — эмігрантаў у гэты рэгіён.

### Райс далёкая ад нас

Будучая дзяржсакратарка ЗША Кандаліза Райс назвала Беларусь у ліку «фарпостаў тыраніі», да якіх таксама адносяцца Іран, КНДР, Куба, Зымбабвэ, М'янма. Беларускі МЗС назваў уяўленьні Райс «далёкімі ад рэчаісьнасьці».

### Новы нумар «Arche»

Прысьвечаны рэвалюцыі ва Ўкраіне, беларускім палякам і Амэрыцы пасьля пераабраньня Буша, «Arche» 1-2005 зьявіцца ў продажы ў пятніцу. Рэдакцыя нагадвае аб магчымасьці падпісацца на часопіс. Гэта можна зрабіць на кожнай пошце. Індэкс 00345. Цана за нумар 2360 рублёў.

### «Камсамолка» па-беларуску

Рэдакцыя «Комсомольской правды в Белоруссии» паабяцала зьніжкі рэклямадаўцам, якія даюць рэкляму на беларускай мове. Дапамогу камэрсантам у распрацоўцы рэклямных слоганаў прапануе Рыгор Барадулін. Паводле ацэнак, у краіне ад 30 да 40 фірмаў выкарыстоўваюць беларускую мову ў рэкляме.

### Каб не гадавалі «нефармалаў»

У Віцебску пазбавілі памяшканьняў аб'яднаньні пры ЖЭСах. Афіцыйная вэрсія: клюбы па месцы жыхарства не даюць рады абавязкам і вымагаюць значных высілкаў.

### Візы ў Літву памаладзелі

Урад Літвы зьнізіў узроставую плянку пры выдачы візаў: цяпер бясплатную візу можна атрымаць не з 70 гадоў, а з 65.

### Кручкоўскі ў адстаўцы

Галоўная ўправа Саюзу палякаў Беларусі адхіліла Тадэвуша Кручкоўскага ад кіраўніцтва. В.а. кіраўніка прызначаны першы намесьнік Юзаф Пажэцкі. Адхіленьне суправаджалася чарговым скандалам, паведамляе pahonia.promedia.by: пяцікурсьніца Гарадзенскага ўнівэрсытэту, дзе працуе Кручкоўскі, заявіла, што той нібыта схіляў яе да сужыцьця.

### Сонца бушуе

На Сонцы на мінулым тыдні адбываліся моцныя ўспышкі, якія выклікаюць геамагнітныя буры на Зямлі. Моцную буру астраномы прадказвалі на 19—20 студзеня, на 21-га — умераную. Найбольш пакутуюць ад іх людзі з сардэчна-сасудзістымі захворваньнямі.

**АШ, АР; БелаПАН, svaboda.org**

# Зьніжкі не для бедных

**Працяг са старонкі 1.**


АЛЕСЬ КУДРЫЦКІ

«А па-мойму, цэны тут амаль такія ж, як і на рынку», — мяркуе кабета ў дублёнцы, якая стаіць у чарзе. «Вось, дарэчы, сродак для мыцьця добры адшукала — бяз хлёркі», — паказвае яна знаёмай пачак з парашком. Тая зь цікавасьцю чытае ды кіруецца ў пошукі — тавары выкладзены на высокія стэляжы, сярод якіх трэба блукаць, нібы па калідорах на складзе, пхаючы перад сабой вазок.

Для жыхароў Кунцаўшчыны ды Масюкоўшчыны гэткі прадуктовы лябірынт глядзіцца досыць экзатычна, але, напэўна, збольшага знаёма — многія зь іх бачылі такія крамы ў Польшчы, куды езьдзілі «на закупы», ці ў Нямеччыне, дзе набывалі патрыманыя «фальксвагены» ды «аўды». Кантынгент наведнікаў «дыскаўнтэру» — гэтак званая «сярэдняя кляса» са спальных раёнаў. Здавалася б, супэрмаркет са зьніжкамі ў 10—20%, які, дарэчы, гандлюе ўраздроб, а ня оптам, — гэта крама перш за ўсё для людзей бедных. Але большасьць з тых, хто робіць пакупкі ў супэрмаркеце «На тыдзень», — відавочна не гаротнікі. Чаму?

Сапраўды, пакунак філе селядца тут каштуе рублёў на 200—300 таньней, чым у цэнтральных гастраномах. Але дабрацца да крамы «на сваіх дваіх» — праблема: з аднаго боку супэрмаркету раскінуўся напаўзакінуты прамысловы раён, з другога — чыстае поле. Цягнуцца сюды толькі для таго, каб набыць бляшанку кансэрваванай кукурузы, бессэнсоўна — не акупіш і квітка на аўтобус. А вось таму, хто бярэ прадуктаў на цэлы тыдзень (адсюль і назва крамы), набываць тут сапраўды выгадна, аднак для гэтага патрэбны аўтамабіль. Зьніжкі зьніжкамі, але беднаму ад іх ні холадна ні горача.

Галоўны прынцып працы дыскаўнт-крамаў за мяжой — трымаць мінімальныя цэны. Робіцца гэта з дапамогай вялізных аптовых закупак (чым шырэйшая сетка крамаў, тым большыя аптовыя зьніжкі яна можа атрымаць), спартанскага абсталяваньня (дзе-ніздзе нават набываюць патрыманыя касавыя апараты), а таксама мінімуму пэрсаналу — поўнае самаабслугоўваньне.

У фірмы «Прэм'ергандаль», уладальніка «На тыдзень», разбудова сеткі знаходзіцца яшчэ толькі ў далёкіх плянах. Пакуль тое, па гандлёвай залі сноўдаюць кансультанты ў жоўта-блакітнай уніформе, падказваючы кліентам, на якой паліцы можна адшукаць патрэбныя ім тавары. Наведнікі супэрмаркету праяўляюць якасьці разбэшчаных спажыўцоў — патрабуюць, каб ім тлумачылі, у чым адрозьненьне аднаго гатунку шакаляднага крэму ад другога, нездаволена бурчаць з прычыны малога выбару гатункаў замежнага піва ці ўвогуле адмаўляюцца ля самай касы браць тое, што паклалі сабе ў вазок. Што зробіш — нараджаецца сярэдняя кляса!

Адрозьненьне паміж беднымі людзьмі за мяжой і ў нас у тым, што замежнікі імкнуцца набываць недарагія прадукты, а нашы проста намагаюцца спажываць як найменш усяго, акрамя бульбы з уласнага гароду. Небагатыя беларусы эканомяць, перш за ўсё, не за кошт цаны прадуктаў, а за кошт аб'ёму сваёй вячэры. Таму стварыць сетку сацыяльных супэрмаркетаў накшталт нямецкай «Aldi» ў нас праблематычна: яны аўтаматычна ператвараюцца ў шэраг звычайных гіпэрмаркетаў. Тым больш у Кунцаўшчыне, адкуль няўзброеным вокам можна ўбачыць галоўны дыскаўнтэр краіны — рынак у Ждановічах.

**Алесь Кудрыцкі**

# Ці будзем з ураджаем?

Ня кожны год пасярод зімы прачынаюцца мядзьведзі з барсукамі, а тэмпэратурны рэжым адпавядае, хутчэй, апошняй дэкадзе сакавіка. Што адбываецца ў прыродзе, як адаб'ецца пацяпленьне на прыродзе і на будучым ураджаі? Прагназуе **Сямён Печанко**.

На праваслаўныя Каляды ды-джэй адной з FM-станцый паўжартам аналізаваў народныя прыметы на прадмет іх праўдзівасьці. «Завіруха на Каляды — пчолы будуць добра раіцца» — няма завірухі. «Шэрань на дрэвах — ураджай на хлеб» — няма інею. «Дождж на Каляды — халодная і доўгая восень» — ну вось, хоць нешта спраўджваецца!» — радаваўся ён. Жарты жартамі, але цёплая і маласьнежная зіма сапраўды не абяцае ўраджайнага лета. Ня вымерзьлі шкоднікі, не набрыняе вільгацьцю глеба.

Прырода, падманутая працяглым пацяпленьнем, абуджаецца ад зімовага сну. Жывёльны і расьлінны сьвет прыстасоўваецца да новых кліматычных рэалій. У расьлінах аднаўляюцца працэсы росту і пачынаецца веснавое адрастаньне, на дрэвах і кустарніках зьяўляюцца пупышкі. Спэцыялісты аднаго з айчынных сельскагаспадарчых НДІ маюць некалькі варыянтаў разьвіцьця сытуацыі. Першы прадугледжвае рэзкае пахаладаньне, якое можа прывесьці да вымярзаньня сельгаскультур. Другі — выпадзеньне вялікага слою сьнегу на неастылую зямлю, што справакуе разьвіцьцё захворваньняў расьлін сьнежнымі цьвілямі і каранёвымі гнілямі, а таксама выправаньне. У такім выпадку не дапаможа нават апрацоўка насеньня перад севам спэцыяльнымі хімічнымі прэпаратамі. Трэці варыянт найбольш жаданы: адбываецца паступовае пахаладаньне, падчас якога расьліны праходзяць неабходны працэс загартоўкі, затым адбываецца выпадзеньне сьнегу.

Падобныя зьмены ў прыродзе фіксуюцца ўпершыню за ўсю гісторыю назіраньняў, таму аграрнікі маюць праблемы з дакладным прагназам разьвіцьця сытуацыі.

Гэта датычыла азімых культур. Ня будзе і добрай ярыны, калі цягам рэшты зімы і на пачатку вясны ня выпадзе дастаткова сьнегу, бо фактычна давядзецца сеяць у сухую зямлю. А яшчэ ня варта забываць, што мінулы год быў багаты на хлеб. Зямля павінна адпачыць, і з гэтай прычыны таксама імавернае паніжэньне ўраджайнасьці.

Люты, як чакаецца, будзе адзначаны характэрным для гэтай пары надвор'ем, а мажліва, і трошкі цяплейшы, чым звычайна. Таму на пытаньне, ці будзем з хлебам — а таксама з буракамі і морквою — адказ дасьць люты, калі наробіць плюты.

## Краўчанка аб'ядвае прарасейскія сілы


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

У якасьці гасьцей IX зьезду Народнай грамады (без Статкевіча) вылучалася імпазантная пастава экс-міністра замежных спраў Пятра Краўчанкі. Колішні сябра партыі ў сваім выступе выказаўся на карысьць разьвіцьця расейскага вэктару ў палітыцы: «Сёньня гаварыць, што Беларусь зможа ўвайсьці ў Эўразьвяз, — абсурд». На думку экс-міністра, для нас Эўразьвяз застаецца вельмі далёкай пэрспэктывай, сёньня трэба нармалізаваць дачыненьні з Расеяй. Таксама ён абвясьціў пра стварэньне новай левацэнтрысцкай палітычнай ініцыятывы.

У камэнтары «НН» Пятро Краўчанка растлумачыў, што ініцыятыву павінны складаць не арганізацыі, а асобы — палітыкі з «прарасейскімі поглядамі»: «Натуральна, з захаваньнем беларускага сувэрэнітэту. Гэтая ініцыятыва стварaецца пад прэзыдэнцкія выбары 2006 году. Казаць, хто ў яе ўвойдзе, пакуль рана — яшчэ ідзе перамоўны працэс».

## Шушкевіч і Ляўковіч аб'ядноўваюцца

«Канкурэнты» з БСДГ прыехалі на зьезд Народнай грамады вялікай дэлегацыяй і з адной прапановай — аб'ядноўвацца чым хутчэй. Яны загадзя пагадзіліся на ўсе ўмовы ўваходжаньня, якія вылучаць іх калегі з БСДП, — зьліцьцё партый ці ўліваньне аднoй у другую. Прычына гэтага «згоднiцтва» — партыя пазбавілася юрыдычнага адрасу. Аб'яднаўчы сход прызначылі на 19 сакавіка.

Новым старшынём Народнай грамады на зьезьдзе выбралі кіраўніка Берасьцейскай абласной філіі дацэнта Анатоля Ляўковіча. Намесьнік старшыні Віталь Малашка ў камэнтары «НН» адзначыў, што кандыдатура Ляўковіча сталася вынікам кампрамісу: «У нас былі тры сыходы з партыі, і ніводзін зь іх не закрануў Берасьцейскай вобласьці. Ляўковіч ня столькі канфліктуе з кімсьці, колькі кансалідуе людзей». Грунтам для падтрымкі сталі й «бюракратычныя» здольнасьці новага старшыні: Берасьцейская абласная філія БСДП — адзіная, што мае свае суполкі ва ўсіх раёнах.

Кіраваць партыяй, хутчэй за ўсё, Ляўковічу давядзецца ўсё ж зь Менску.

## Новае аблічча «Народнай волі»

Чытачы «Народнай волі» заўважылі, што з Новага году істотна зьмяніўся дызайн газэты. На пытаньне, чым выкліканы гэтыя зьмены, галоўны рэдактар «НВ» Іосіф Сярэдзіч зьдзівіўся: «Што за пытаньне?! Пошук пастаянна вядзецца». Між тым, як стала вядома «НН», новы


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

дызайн выкліканы яшчэ і ўнутранымі зьменамі — прыходам у рэдакцыю новага супрацоўніка: намесьніцай галоўнага рэдактара стала былая рэдактарка «Белорусской деловой газеты» Сьвятлана Калінкіна (**на фота**).

**Аркадзь Шанскі**

# Энэргетыка чакае рэформы

Апошняя структурная зьмена ў беларускай энэргетыцы адбылася ў 1995 годзе. Тады былі створаны дзяржаўны канцэрн «Белэнэрга», падпарадкаваны Мінэнэрга. Пераўтварэньне было адной з умоў фінансаваньня ЭБРР праграмы шырокамаштабнай мадэрнізацыі энэргапрадпрыемстваў, адной з асноўных мэтаў якой было зьмяншэньне залежнасьці ад паставак газу з Расеі. Але праз некалькі гадоў праграма была паступова згорнута, пакінуўшы па сабе адну рэканструяваную цеплаэлектрацэнтраль, у Воршы. Аналізуе **Міхаіл Чарвінскі**.

## У Швэцыю па вопыт

Залежнасьць ад імпартаваных, у асноўным з Расеі, энэрганосьбітаў, паводле афіцыйных зьвестак, складае каля 85%. Магутнасьці канцэрну «Белэнэрга» працуюць на двух відах паліва — прыродным газе і мазуце. Доля газу ў агульным спажываньні энэрганосьбітаў складае 50%. Перакрыла Расея газавы кранік — і зноў суцэльныя праблемы.

Таму летась самай моднай тэмай у Беларусі было выкарыстаньне мясцовых рэсурсаў і нетрадыцыйных крыніцаў энэргіі. Яшчэ на прэс-канфэрэнцыі ў сьнежні 2003 году гендырэктар канцэрну «Белэнэрга» Сяргей Белы згадаў пра намер выкарыстоўваць драўніну дзеля атрыманьня энэргіі. Спасылаліся на досьвед заходніх суседзяў: у краінах Паўночнай Эўропы і ў Аўстрыі, дзе выкарыстаньне біяпаліва найбольш папулярнае, ад 10 да 20% энэргіі атрымліваецца за кошт узнаўляльных крыніц.

Дзеля вывучэньня швэдзкага досьведу ў гэту краіну адпраўлялася беларуская дэлегацыя на чале з тагачасным міністрам энэргетыкі Ўладзімерам Сямашкам, а пасьля ў Швэцыю накіравалася цэлая дэлегацыя энэргетыкаў на чале з намесьнікам міністра Аляксандрам Сіваком — правесьці перамовы пра інвэстыцыі і закупку абсталяваньня для такіх праектаў.

## Надзеі на лес і ваду

Намесьнік старшыні НАН Беларусі Пятро Віцязь сьцьвярджае, што ў пэрспэктыве выкарыстаньне нетрадыцыйных крыніц энэргіі мусіць забясьпечыць да 20% энэргаспажываньня. Цяпер у Беларусі вядуцца распрацоўкі ў галіне выкарыстаньня сонечнай энэргіі, сілы вады і ветру, але найбольшыя пэрспэктывы — у драўніне ды біягазе. Выкарыстоўваць драўніну ў якасьці паліва мяркуецца лякальна, напрыклад, на прадпрыемствах, дзе маецца піlabiвіньне і іншыя адкіды драўніны, якія маглі б быць спрасаваныя ў пелеты і скарыстаныя для атрыманьня цяпла. Прадугледжваецца таксама магчымасьць экспартных паставак паліва, выраблена з адкідаў беларускай дрэваапрацоўкі. Грошы на гэта, паводле Віцязя, можна знайсьці нават у Расеі і Эўропе.

Эўропа ставіцца да такой ініцыятывы прыхільна — пра гэта сьведчыць рэалізацыя ў Беларусі праекту «Выкарыстаньне біямасы для ацяпленьня і забесьпячэньня гарачай вадой», якім запланавана ажыцьцявіць шэсьць дэманстрацыйных праектаў, зь якіх пяць зьвязаны з пераводам кацельняў на спальваньне адкідаў драўніны, а шосты прадугледжвае стварэньне прадпрыемства па збіраньні, транспартаваньні і перапрацоўцы адкідаў лесанарыхтоўкі для спальваньня ў кацельнях. Адным з ініцыятараў праекту была Эўрапейская эканамічная камісія ААН, у яго фінансаваньні ўдзельнічаюць Глябальны экалягічны фонд, Камітэт па энэргаэфэктыўнасьці пры Саўміне ды прадпрыемствы, якія стануць аб'ектамі праектаў.

Адным з асноўных у постсавецкі перыяд кірункаў разьвіцьця беларускай энэргетыкі была так званая «малая энэргетыка» — аднаўленьне малых гідраэлектрастанцый на рэках. Паводле афіцыйных зьвестак на мінулы год, у Беларусі функцыянавала 22 міні-ГЭС, 16 зь іх былі аднаўлены за апошнія сем гадоў. Апроч таго, будуецца Полацкая ГЭС магутнасьцю 28 МВт ды Гарадзенская ГЭС магутнасьцю 17 МВт.

## Спрэс праблемы

Аднак гэтыя навацыі ня здольныя вырашыць сыстэмных праблем беларускай энэргетыкі. Адчуваецца вострыя брак інвэстыцыйных рэсурсаў для ўзнаўленьня асноўных фондаў, няздольнасьць спажыўцоў аплачваць скарыстаную энэргію, надзвычай вялікая зношанасьць абсталяваньня і нізкая рэнтабэльнасьць энэргетычных прадпрыемстваў. Цяпер зношанасьць абсталяваньня дасягнула мяжы, за якой энэргетыка ўваходзіць у зону павышанай рызыкі і імавернасьці аварый.

Нягледзячы на дастаткова высокі ўзровень рэнтабэльнасьці — 12%, дзейнасьць большасьці прадпрыемстваў энэргетычнага сэктару прызнаецца «недастаткова выніковай». Сярод прычын нізкай эфэктыўнасьці беларускай энэргетыкі — адсутнасьць незалежнага органу для вызначэньня кошту электрычнасьці і цяпла для спажыўцоў, стымулаў скарачэньня выдаткаў, недахоп інвэстыцый і празьмернае рэгуляваньне з боку дзяржавы.

Гэтыя праблемы і мелася вырашыць рэструктурызацыя энэргетычнай галіны. Былі распрацаваныя чатыры варыянты правядзеньня рэструктурызацыі, за ўзор была выбрана мадэль, паводле якой у свой час рэфармавалася энэргетыка Ўкраіны. Меркавалася падзяліць усю энэргетычную галіну паводле відаў дзейнасьці, гэта значыць стварыць асобныя кампаніі па выпрацоўцы, перадачы, размеркаваньні і продажы энэргіі. Працэс рэструктурызацыі павінен быў цягнуцца ад шасьці да дзесяці гадоў. Чакалася, што канцэрн «Белэнэрга» будзе ліквідаваны, а яго функцыі пяройдуць да Міністэрства энэргетыкі.

Гэты варыянт быў ухвалены прэзыдыюмам Савету міністраў і яшчэ ў 2003 годзе вынесены на разгляд Аляксандра Лукашэнкі. Аднак нарады па гэтым пытаньні пастаянна пераносіліся, апошні раз на няпэўны тэрмін.

## Мінусы поўнай аплаты

Прынамсі адна з названых вышэй праблем беларускай энэргетыкі ўжо лічыцца вырашанай. У 2003 годзе аплата за энэргарэсурсы была ўпершыню даведзена да 102,1%, з таго часу энэргетыкі ганарацца поўнай аплатай энэргіі і цяпла ўнутранымі спажыўцамі. Паводле «Маніторынгу інфраструктуры Беларусі», за чатыры гады ў 2000—2004 цэны на газ для насельніцтва вырасьлі ў 83 разы (спажывецкія цэны за той жа час вырасьлі толькі ў пяць разоў).

Што да кошту электрычнай энэргіі, то пасьля таго, як у 2000 г. урад пачаў скарачаць субсыдыі на кампэнсацыю выдаткаў індывідуальных спажыўцоў за кошт прадпрыемстваў, цэны на электрычнасьць для насельніцтва растуць нашмат хутчэй за тэмпы інфляцыі. У выніку за чатыры гады (2000—2004) яны вырасьлі амаль у 21 раз. Пасьля павышэньня кошту расейскага газу ў 2004 годзе так званае «перакрыжаванае субсыдаваньне» (кампэнсацыя нізкіх цэн для індывідуальных карыстальнікаў высокімі цэнамі для прамысловых прадпрыемстваў) было адноўлена, але агульнай тэндэнцыі гэта ўжо не магло зьмяніць.

Адваротным бокам гэтых дасягненьняў можна лічыць трагічную гісторыю, якая здарылася напярэдадні Новага году ў пасёлку Заслонава Лепельскага раёну. Там мясцовы жыхар забіў супрацоўніцу мясцовага ЖЭУ пасьля таго, як заплаціў штраф па складзеным ёю акце. 29-гадовы забойца, інвалід і бацька двух дзяцей, сам здаўся міліцыі ў Віцебску і цяпер знаходзіцца пад сьледзтвам. Падставай для штрафу паслужыў так і ня знойдзены дэфэкт электралічыльніка, у выніку чаго сумы аплаты за электраэнэргію падаваліся супрацоўнікам ЖЭУ падазрона малымі.

Кошт электраэнэргіі для насельніцтва больш не субсыдуецца дзяржавай. Пры гэтым беларуская энэргетыка застаецца ў дзяржаўнай уласнасьці. Крытычная залежнасьць ад расейскіх энэрганосьбітаў не пераадоленая, а праграмы зьмяншэньня гэтай залежнасьці нельга назваць ні маштабнымі, ні рэалістычнымі.

**Міхал Чарвінскі**

### Дынаміка цэнаў на газ і электраэнэргію для насельніцтва ды спажывецкіх цэнаў







Дыяграмы падрыхтаваныя аўтарамі «Маніторынгу інфраструктуры Беларусі» паводле зьвестак Міністэрства статыстыкі і аналізу.

# СЬЦІСЛА

## ПДВ выклікаў крызіс

У новым годзе на гуртовыя склады Беларусі перасталі паступаць расейскія прадукты. Беларускія ўлады вінавацяць у праблемах расейскіх падаткавікоў, што не падрыхтаваліся да новага парадку спагнаньня ПДВ па краіне прызначэньня.

## Тут будзе горад-сад

Улады Віцебшчыны пастанавілі да 2010 г. стварыць 303 аграмястэчкі. Ужо сёлета па два-тры такія гарадкі зладзяць у кожным раёне. Аграмястэчка — гэта «добраўпарадкаваны населены пункт» з разгалінаванай інфраструктурай: дзіцячымі садкамі, амбуляторыямі, сталоўкамі ды юрыдычнымі канторамі. Ядрамі гэтых выспачак цывілізацыі будуць райцэнтры альбо калгасныя сядзібы. Сярэдні кошт аграмястэчка — 10 млрд рублёў.

## Акцызы на літры

У студзені вытворцы гарэлкі ды лікёра-гарэлачных напояў пяройдуць на выкарыстаньне новых акцызных марак. Налепкі зь беларускім гербам увялі яшчэ ў саваківу. Некаторыя вытворцы прыдумалі спосаб эканоміць — наклейвалі на вялікія пляшкі больш танныя акцызныя маркі, прызначаныя для пляшак меншага аб'ёму. Каб выключыць махінацыі, на новых акцызных марках будзе ўказаны намінальны аб'ём тары.

## Чыстабуд

Менгарвыканкам аб'явіў вайну неахайным будаўнікам. Цяпер гаспадарам будпляцаў давядзецца ў прымусовым парадку выдзяляць грошы на абсталяваньне мыек для колаў грузавікоў. Таксама трэба будзе набываць кантэйнэры для вывазу адкідаў ды абгароджваць месца будоўлі мэталічнай сеткай, а не бэтонным плотам — каб было больш сорамна за бруд.

## Кніга скаргаў

Прэзыдэнцкі дэкрэт №2 абавязаў усіх індывідуальных прадпрымальнікаў займець кнігу заўваг і прапаноў. Кнігі, якія будуць выдаваць і рэгістраваць у падатковай, трэба прад'яўляць кліентам па першым запатрабаваньні. Ігнараваньне дэкрэту абыдзецца ад чатырох да дзесяці базавых велічынь ці прыпыненьнем на паўгоду дзеяньня ліцэнзіі.

## «Азот» бяз газу

Праваліўся тэндэр гарадзенскага «Азоту» на закупку прыроднага газу. Прапановы на пастаўку 600 млн кубоў паліва, патрэбных прадпрыемству ў 2005 г., падала толькі адна кампанія — расейская фірма «Газойл». «Газойл» нават не падаў цаны газу — на момант падачы заяўкі на тэндэр Беларусь ды Расея спрачаліся наконт «газавага» кантракту. «Азот» плянаваў знайсьці новага пастаўшчыка, які б прапанаваў больш выгадныя ўмовы, чым яго стары партнэр «Газойл».

## Рост рынку музыкі

Упершыню за 4 гады легальныя продажы музыкі ў сьвеце вырасьлі на 1% да $32,1 млрд. Асабліві рост прыпадае на інтэрнэт-крамы зь лічбавай музыкай і ДВД. Праз сэрвісы дармовых mp3 файлаў у Інтэрнэце аб'ёмы продажаў аўдыёпрадукцыі падалі.

## Эўрабізнэс ідзе на ўсход

Цэнтар эканамічных і бізнэс-дасьледаваньняў (Лёндан) апублікаваў рэйтынг прыцягальнасьці рэгіёнаў Эўразьвязу для бізнэсоўцаў. Найпэрспэктыўнымі названыя Прага, Будапэшт і Братыслава. «Маладыя эўрапейскія тыгры» апярэдзілі «старую Эўропу» — з 223 разгледжаных рэгіёнаў першыя 15 месцаў належаць новым сябрам ЭЗ.

**АК; БелТА, БелаПАН, АФН**

## КУРСЫ ВАЛЮТ

**на 20 студзеня:**
1 амэрыканскі даляр — 2 173 рублі
1 эўра — 2 846,30
1 латвійскі лат — 4 088,43
1 літоўскі літ — 824,12
1 польскі злоты — 695,89
1 расейскі рубель — 77,17
1 украінская грыўна — 409,19

**Паводле Нацбанку**

# Павал Севярынец стварае хрысьціянскую дэмакратыю і шукае кварцы і халцэдоны

Павал Севярынец пакінуў лідэрства ў «Маладым Фронце» Зьмітру Дашкевічу і Сержуку Бахуну, піша кнігі і стварае Хрысьціянска–дэмакратычную партыю. У сваёй кнізе «Нацыянальная ідэя» Павал Севярынец прапануе адказы на галоўныя пытаньні, якія наш час ставіць перад нацыяй і чалавекам. З палітыкам гутарыць **Вераніка Дзядок**.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**ТРЫ ГАЛАВЫ «МАЛАДОГА ФРОНТУ». Павал Севярынец (у цэнтры) зь пераемнікамі. Зьлева — Сяржук Бахун, справа — Зьміцер Дашкевіч.**

**«НН»: Павал, чым ты цяпер займаешся?**

**Павал Севярынец:** Я працую над раманам пра абуджэньне ў Беларусі. Галоўны герой раману — беларус ва ўзросьце Хрыста. Гэты раман стане сапраўднай бомбай. Як і належыць, раманам скончаецца мая «творчая эвалюцыя»: я ўжо выдаў дакумэнтальную кнігу «Пакаленьне «Маладога фронту», цяпер рыхтуецца да друку зборнік эсэ пра нацыянальную ідэю.

## Прынесьці мараль у палітыку

**«НН»: А якія посьпехі ў палітычнай сфэры?**

**ПС:** Займаюся стварэньнем хрысьціянска-дэмакратычнае партыі. Я стаўлю за мэту надаць старэйшаму пакаленьню імпэту і веры, якія ўласьцівы моладзі. Сытуацыя ў Беларусі ідэнтычная ўкраінскай: у абедзьвюх краінах 42% за рэакцыю і 52% за дэмакратыю. Аднак пры гэтым у Кіеве ўвесь народ на Майдане, а ў нас на вуліцы выходзяць дзьве тысячы чалавек, хоць у нас няма падзелу на захад і ўсход. Дэмакратыя — гэта ідэя большасьці, і задача дэмакратычных сілаў у Беларусі — рэалізацыя памкненьняў большасьці. Калі б усе начапілі аранжавыя ці бел-чырвона-белыя ці сінія з зоркамі стужачкі — было б тое ж, што ва Ўкраіне.

**«НН»: Ці ёсьць у Беларусі лідэры, гатовыя ўзяць на сябе адказнасьць, калі людзі ўсё ж масава выйдуць на вуліцу?**

**ПС:** Сярод дзесяці мільёнаў беларусаў ёсьць багата такіх людзей. Звычайна вулічныя трыбуны вылучаюцца стыхіяй, калі іх ня вылучыць палітычны асяродак. Я пазнаёміўся з адным такім — прадпрымальнік, энэргічны, ведае эканоміку, разьбіраецца ў палітычных працэсах. І чым не кандыдат у прэзыдэнты гэты бізнэсовец?

Павал ішоў на чале вулічных дэманстрацый 1990-х, пісаў на крымінальныя тэмы ў розных газэтах, самастойна распрацаваў і правёў мноства адукацыйных курсаў пад маркай «Шоў Беларушчыны», агулам шэсьць з паловай месяцаў правёў у няволі, арыштоўваўся больш за 45 разоў. «За кратамі пачуваешся, як у манаскай кельлі, калі можна сам-насам размаўляць з Богам безь вялікіх перашкод звонку. Для мяне кожная адседка — гэта духоўнае кшталтаваньне», — кажа ён.

На мінулых парлямэнцкіх выбарах балятаваўся па Віцебска-Горкаўскай акрузе №17, аднак быў зьняты зь перадвыбарнае гонкі. Акруговая камісія палічыла, што ў радыёзвароце да слухачоў палітык дапусьціў «паклёп на адрас вышэйшых асоб у дзяржаве», — Павал тады заявіў, што ў дзяржаве мае месца «карупцыя і бюракратыя на ўсіх узроўнях улады».

У 2001 годзе Павал хрысьціўся, ходзіць у праваслаўную царкву.

**«НН»: Які сэнс ствараць партыю ў сёньняшняй сытуацыі, калі партыі не ўплываюць на палітыку, выцясьняюцца з прававога поля?**

**ПС:** У Беларусі партыі ня могуць уплываць на палітыку праз выбары, як у традыцыйнай палітычнай сыстэме. Таму партыя ці рух у такой сытуацыі — гэта проста групы людзей, якія паставілі сабе на мэце зьмяніць уладу. Партыя будзе створана на базе вернікаў з актыўнай палітычнай пазыцыяй, а такіх у Беларусі сотні тысяч. Адным з прынцыпаў партыі будзе шматканфэсійнасьць, для Беларусі гэта асноватворна — канкурэнцыя, а не змаганьне канфэсій.

**«НН»: Чым Ваша партыя будзе адрозьнівацца ад іншых кансэрватыўных партый?**

**ПС:** Імкненьнем унесьці хрысьціянскія прынцыпы ў палітыку. Беларусь пачалася, калі сюды прыйшло хрысьціянства, ведала росквіт, калі быў рэлігійны росквіт, і адсюль абсалютна зразумела, што адрадзіць яе можна толькі праз хрысьціянства. Хрысьціянская дэмакратыя запатрабаваная сёньня. Яна абараняе сям'ю і традыцыйныя каштоўнасьці. Хто ў нас займаецца абаронай сям'і, змаганьнем са страшным злом алькагалізму?

## Перастаць піць

**«НН»: Але для гэтага ёсьць царква. Магчыма, табе проста трэба стаць прапаведнікам?**

**ПС:** Кожнаму сваё месца, дзе яму Бог прызначыў быць. Я быў пакліканы ў палітычную сфэру, у гэтай сфэры я і працягваю сваю дзейнасьць. А посьпех такой партыі палягае яшчэ і ў тым, што гэта будзе рэальная духоўная альтэрнатыва. Бо рэжым не грунтуецца на духоўнасьці, дзяржаўная ідэалёгія пабудаваная на праваслаўным атэізьме. Палова беларусаў дэкляруюць, што вераць у Бога.

**«НН»: А калі б сёньня большая частка мужчынскага насельніцтва Беларусі перастала спажываць алькаголь, гэтага было б дастаткова, каб зьмянілася краіна?**

**ПС:** У нас дзяржава выкарыстоўвае для папаўненьня бюджэту нізкія цэны на гарэлку і яе вялізную вытворчасьць, а потым гэтыя грошы выдаткоўваюцца на мэдыцыну, адукацыю і выцьвярэзьнікі. Але такая дзяржава нежыцьцяздольная. Калі б людзі сьвядома перасталі піць і цьвяроза вырашалі праблемы на працы і ў сям'і, Беларусі не пазналі б. На мужчынах ляжыць адказнасьць за зьмену сытуацыі ў краіне. Пакуль мужыкі будуць такія забітыя, не прычакаем добрай долі. Палова кантынгенту на Акрэсьціна — мужыкі, якіх здалі іхныя жонкі за п'янства. Яны ж на жонак яшчэ і скардзяцца: як так, што жонка здае мужа ў разьмеркавальнік…

> Для папаўненьня бюджэту трымаем нізкія цэны на гарэлку, а потым гэтыя грошы выдаткоўваем на мэдыцыну, адукацыю і выцьвярэзьнікі. Але гэта глупства!

**«НН»: А што могуць зрабіць жонкі для зьмены сытуацыі?**

**ПС:** Жонкі могуць уплываць на сваіх мужоў. Цяпер яны, на жаль, занятыя тым, што цягнуць асноўныя мужчынскія функцыі. Беларускія жонкі — і трактар «Беларусь», і кухонны камбайн. І гэта трагедыя беларускага грамадзтва. А шчасьлівыя сем'і ў Беларусі — вынятак.

## Ідэал нацыі

**«НН»: Чым ты будзеш займацца, калі зьменіцца сытуацыя ў Беларусі?**

**ПС:** Яна будзе мяняцца вельмі доўга. За апэратыўнымі зьменамі, праграмай-мінімум, мы мусім імкнуцца рэалізаваць ідэал, які быў закладзены ў гэтую краіну Госпадам Богам пры стварэньні беларускай нацыі. Ідэі нацыянальнага і маральнага адраджэньня павінны аваладаць мільёнамі беларусаў, а потым адбудзецца экспансія беларускай культуры, духоўнасьці і палітыкі на Ўсход і на Захад. Працы будзе неўзаранае поле.

**«НН»: А хто можа сказаць, як выглядае гэты ідэал?**

**ПС:** Ідэал Беларусі можна вычытаць у Бібліі. У кнізе «Нацыянальная ідэя» ў мяне ёсьць такі радок: «У якім бы месцы Беларусі вы ні знаходзіліся, вазьміце Біблію і знайдзіце гэтае месца ў Сьвятым Пісаньні». Ідэал нацыі — гэта духоўна абуджаны народ, які эвангелізуе іншыя народы.

**«НН»: Ці маеш ты некалі вярнуцца да сваёй спэцыяльнасьці — геалёгіі?**

**ПС:** Геалёгія застаецца адной з маіх сфэр цікавасьці. Камусьці ж трэба будзе пасьля займацца зямлёй і яе глыбінямі. Я маю даўні праект: раскруціць у Беларусі свой нацыянальны сымбаль — ювэлірныя камяні. У Беларусі багата камянёў, якія маглі б стаць такім мілым хатнім сувэнірам. Чэхі, напрыклад, маюць гранат, літоўцы — бурштын, у нас гэта маглі б быць кварцы ці халцэдоны.

**«НН»: Першае, што б ты зрабіў, каб стаў прэзыдэнтам?**

**ПС:** Выступіў бы да народу з хрысьціянскім казаньнем па ўсіх каналах. Сымболіку памяняем потым, а «напачатку было Слова»…

**«НН»: Ці ёсьць для цябе нейкія асабістыя вынікі гэтых трынаццаці гадоў незалежнасьці?**

**ПС:** Я сапраўды адчуваю, што жыву ў незалежнай дзяржаве, і незалежнасьць набірае канкрэтныя абрысы і вагу. У гэтым няма ролі прэзыдэнта, гэта гістарычная заканамернасьць. Беларусі Бог дае незалежнасьць, і ніхто яе скасаваць ня можа.

# А яны яшчэ ваююць

Колькі гадоў таму пад Верхнядзьвінскам былі адкапаныя парэшткі двух загінуўшых у вайну салдат. Косткі даставілі ў ваенкамат, дзе выявілі, што яны належаць савецкаму і нямецкаму вайскоўцам. Разьдзяліць косьці на «свае» і «варожыя» было немагчыма, і гэта спарадзіла канфлікт, піша **Антон Бубала**.

Чатыры гады парэшткі праляжалі ў гаражы ваенкамату: начальства ніяк не магло вырашыць, якім чынам зладзіць пахаваньне. Зьвярнуліся ў Раду вэтэранаў, старыя ваякі гатовыя былі «свайго» пахаваць з аркестрам, а «фашыста» выкінуць сабакам.

Тым часам у Менску нехта са скульптараў шукаў, дзе б прымяніць вынашаную ідэю помніка — сымбалю прымірэньня праціўнікаў пасьля сьмерці. Толькі ж уладныя людзі зноў-такі адмахнуліся ад прапанoў грамадзкіх дзеячаў выкарыстаць такі ўдалы момант дзеля вырашэньня перасьпелага пытаньня. Функцыянэры дагаворваліся да таго, што гатовы прадаць ці нават аддаць «за так» праблемныя парэшткі ў любы іншы раён, які на гэта дасьць згоду.

Урэшце пад напорам грамады косьці былі пахаваныя пад простым драўляным крыжам на новых грамадзкіх могілках. Незвычайная магіла сталася першай на гэтым «пляцы нябожчыкаў». Грошай на помнік не знайшлося. Зварот (зноў-такі грамадзкасьці) у нямецкае пасольства нічога ня даў, бо адтуль бюракраты-пэданты запатрабавалі анкетныя зьвесткі пра загінуўшага гітлерца: хто ён ды адкуль, колькі меў гадоў, ці была ў яго фраў…

У сьпісе помнікаў магіла была пазначана нэўтральна — як «іншае пахаваньне часоў вялікай айчыннай вайны».

А ўвосені 2004 году стараньнямі мясцовага аддзяленьня Таварыства аховы помнікаў на магіле паўстала стэла. Надпіс на ёй паведамляе: «Чыесьці ваяры і нечыя сыны, у адной магіле парадніліся яны».

З нагоды набліжэньня юбілею Перамогі акцыя па ўсталяваньні новага помніка апынулася дарэчы. Гэта адразу ўцяміў і ідэалягічны аддзел райвыканкаму. Значнасьць акцыі павышала і тое, што частку грошай на выраб стэлы, як выявілася, сабраў савет вэтэранаў — былыя ўдзельнікі вялікай айчыннай скінуліся з падораных ім да 60-годзьдзя вызваленьня «прэзыдэнцкіх рублёў».

У той час, калі ўжо зацьвярджаўся сцэнар адкрыцьця помніка, вэтэраны дазналіся, што стэла знаходзіцца ня дзе інакш, як на той «праблемнай» савецка-нямецкай магіле. Урэшце старшыня савету афіцыйна паведаміў, што «нашых там ня будзе». І сапраўды, іх там і не было. Яны, відаць, усё яшчэ ваююць. Ужо зь нябожчыкамі.

*Верхнядзьвінск*

# Асьвяцілі храм Маці Божай Бялыніцкай

16 студзеня ў Бялынічах (Магілёўшчына) асьвяцілі храм Бялыніцкай Божай Маці, які будавалі цягам чатырох гадоў. Са старой праваслаўнай царквы сюды перанесьлі копію цудатворнага абраза Маці Божай Бялыніцкай, які лічыцца сьвятыняй і для каталікоў, і для праваслаўных.

Гісторыя бажніцы — гісторыя дзясяткаў праваслаўных цэркваў у Беларусі. Напачатку гэта быў каталіцкі храм, адзін з найпрыгажэйшых на нашых землях, пабудаваны на сродкі канцлера Сапегі. У час хрысьціянскіх сьвятаў у мястэчку зьбіраліся тысячы паломнікаў. У 1761 г. у Рыме Папа Бэнэдыкт XIV урачыста каранаваў абраз, з таго часу касьцёл стаў эўрапейскай знакамітасьцю, тут стала жыў папскі нунцый, а ў Бялынічы пацягнуліся пілігрымы. У 1857 г. храм згарэў, а праз два гады на ягоным месцы быў пабудаваны новы. Але праіснаваў ён нядоўга: у 1876 г. яго перарабілі пад праваслаўную царкву, якую ўжо ў 1960-х зьнесьлі.

Больш аптымістычная гісторыя абраза Маці Божай Бялыніцкай, зь ёй зьвязана назва гораду: калі яго прынесьлі ў XIII ст. манахі Кіева-Пячорскай лаўры, у Сьвятаільінскім храме ўдзень і ўначы адбываліся набажэнствы. Падчас усяночнага чуваньня адбыўся цуд: ад абраза пачалі разыходзіцца яркія промні і сьвятло зазьзяла. У памяць аб гэтай падзеі мястэчка атрымала назву Бялынічы — Белыя Ночы.

З абразом зьвязана цікавая легенда. Падчас вайны з Расеяй, у 1660 г., манахі кляштару кармелітаў — з 1596 году абраз знаходзіўся ў каталіцкім кляштары — вырашылі вывезьці абраз з усім серабром і касьцельным начыньнем у Кракаў. Мінаючы Ляхавіцкую фартэцыю ў Наваградзкім ваяводзтве, законьнікі былі так затрыманы невядомай ненатуральнай сілай, што коні ніяк не маглі далей пайсьці.

Генэрал Ляхавіцкай фартэцыі Станіслаў Міхал Юдзіцкі прыняў абраз у фартэцыю. Праз нейкі час маскоўскае войска аблажыла замак і беспасьпяхова штурмавала яго тры месяцы, у той час як насельнікі замку дзень і ноч маліліся перад абразом. Пазьней абраз такім жа чынам выратаваў фартэцыю ад швэдаў.

**Алесь Белагубаў, Магілёў**



**ТАНДЭТНАЯ МУРАЎЁЎКА паўстала ў Бялынічах замест найпрыгажэйшага сабору. Адкрываў новы храм дэпутат ад Бялынічаў Уладзімер Канаплёў.**

PHOTO.BYMEDIA.NET

## СЬЦІСЛА

### Люк выратаваў

Адчынены люк закінутага каналізацыйнага калодзежу выратаваў жыцьцё жыхарцы Віцебску. Яна сарвалася з гаўбца 6-га паверху — і трапіла галавою акурат у напоўнены даверху сьмецьцем люк.

### Энэргетыкі безь сьвятла

Бяз вулічнага асьвятленьня доўгі час застаецца гарадзкі пасёлак Арэхаўск. Пасёлак завінаваціў «Энэргагляду» некалькі мільёнаў рублёў. Не асьветлены нават падыходы да школы і крамаў. І гэта пры тым, што Арэхаўск зьяўляецца пасёлкам першынца беларускай электраэнэргетыкі — БелДРЭС. Адзін з абвешчаных дзяржавай сацыяльных стандартаў — начное асьвятленьне вуліц — на Аршаншчыне не спрацоўвае.

### Малітва не дапамагла

Напярэдадні перагаласаваньня другога туру на прэзыдэнцкіх выбарах на Украіне прыхаджане Сьвята-Міхайлаўскага сабору ў Воршы маліліся за посьпех аднаго з кандыдатаў. Сярод вернікаў распаўсюджвалася «малітва верных дзяцей кананічнае Украінскае праваслаўнае царквы за раба Божага Віктара Януковіча». Малітвы, зьвернутыя да арханёла Міхаіла, «рабу Віктару» не дапамаглі.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

### Палачане — найлепшыя знаўцы мовы

Вучні полацкіх школ і прафтэхвучэльняў удала выступілі на абласной прадметнай алімпіядзе, атрымаўшы 26 дыплёмаў рознай вартасьці. Найбольшага посьпеху дасягнулі ў беларускай мове — шэсьць дыплёмаў. Трымайцеся, госьці, агульнабеларуская алімпіяда па беларускай мове пройдзе ў Полацку з 28 сакавіка да 2 красавіка.

**Васіль Кроква, Полацак**

### Пагроза «Дружбе»?

Пад Жыткавічамі рамонтная брыгада знайшла пад трубою нафтаправоду «Дружба» «міну»: штосьці накшталт кавалка гаспадарчага мыла з уткнутай жалязякай. Адзін з рабочых зьвярнуў увагу на падабенства да толавай шашкі. Выклікалі адмысловцаў, якія пацьвердзілі, што гэта сапраўды выбухоўка, але пратэрмінаваная амаль на чвэрць стагодзьдзя і таму цалкам бясьпечная. Афіцыйная вэрсія: шашка была прынесена некалі пад нафтавыя трубы веснавой паводкай. Вось толькі адкуль?

### Магістрат у апарата

Гомельскія ўлады вырашылі наладзіць віртуальнае камунікаваньне з гамельчукамі. Вэб-пляцоўкай будзе сайт гарвыканкаму.

**Сяргей Балахонаў, Гомель**

### Беларуская музыка ў горадзе над Дняпром

Усё прасьцей стала набываць у Магілёве беларускую музыку. Сёньня ў цэнтры места ёсьць як мінімум тры пункты продажаў. Гады тры таму даводзілася замаўляць у «Маладым фронце» ці прасіць сяброў, каб прывезьлі зь Менску. Сёньня ў цэнтры вялікі карычневы шапік ля чыгуначнага вакзалу з 35 назвамі для выбару. Яшчэ — павільён «ЭлКом» на рагу Лібкнехта і Ленінскай з 25 дыскамі. Прычым займаюць яны ганаровае месца і выстаўленыя на вітрыне на поўны памер, таму зьяўляецца ўражаньне, што беларускай музыкі тут нават больш за іншую. Зусім недалёка адсюль, у краме «Галяктыка», для выбару маецца 15 беларускіх CD. Беларуская музыка ёсьць і ў іншых крамах, напрыклад, у «Візыце» ля ЦУМу, у шапіку ля Тэатральнага скверу, праўда, выбар там меншы. Ды й, на жаль, па ранейшаму мала музыкі на касэтках, хоць ня ўсе яшчэ маюць CD-прайгравальнікі.

**Тумаш Марцыбылін, Магілёў**

# Ад Армагедону да кібэрспорту

Я на ўскраіне Менску, інтэрнэт-кавярня «Voodoo4». Яна ня мае дачыненьня да магіі ці рэлігіі. Проста так называлася адна кібэрспартовая каманда. Кібэрспорт — гэта замкнёнае асяродзьдзе, зацятае й прафэсійнае.

**АНДРЭЙ РАСІНСКІ**

Кожная тэхнічная навіна ў сфэры відовішчаў адразу агаломшвае, уводзіць у дзіўны іншы сьвет, вяртае да старажытных часоў дзяцінства. Так было зь першым кінасэансам, калі людзі зачароўваліся немагчымым і амаль што сапраўдным жыцьцём, так было з тэлевізіяй, так сталася і з кампутарам.

Калі я ўпершыню дарваўся да кампутарных гульняў, то зламаў мышку, зацята змагаючыся з бандамі павукоў, оркаў і шалёных прывідаў у сутарэньнях і лябірынтах. У мяне быў шок — ня столькі ад таго, што я пашкодзіў дзяржаўную маёмасьць, якой употайкі карыстаўся, колькі ад таго, што праз гэта быў больш ня здольны пераходзіць з аднаго ўзроўню гульні на другі.

Але я і не падазраваў, што надзвычай хутка кампутарныя гульні стануць чымсьці большым, чым проста забавай.

Першым тэарэтыкам віртуальнай рэчаіснасьці і першым непераўзыдзеным кампутарным гульцом быў зусім ня бацька кібэрнэтыкі Норбэрт Вінэр і нават ня хіпі-разумнік з Сыліконавай даліны. Ім зьяўляўся сьціплы заснавальнік Ордэну езуітаў брат Ігнаці Лаёла.

Распрацаваныя кіраўніком Ордэну «Духоўныя практыкаваньні» прапануюць нам якасную віртуальную рэчаіснасьць у манаскім убраньні і кампутарную гульню на захапляльную рэлігійную тэму.

Кожны дзень прысьвячаецца пэўнай Сьвятой Гісторыі. Надзвычай відовішчны — «Армагедон». Вам трэба прыняць удзел у апошняй бойцы Сьвятла і Цемры.

Якая можа быць дыспазыцыя варожых сілаў? Якія колеры? Якія адценьні? Як яны зьмяняюцца ў часе? Якая фактура ў трэцяга крыла пятага дэмана? А якая ягоная пятка?

Калі зрок насычаны, пераходзім да слыху: хрыпы, крыкі, трубны голас. Пахі — сера, ладан, фіміям, дрыготкі пах палахлівага манахасуседа.

У нейкі момант вобразы выходзяць з-пад кантролю: адэпт сапраўды бачыць, чуе, нюхае, дакранаецца й б'ецца — у імя Госпада і сілаю Яго.

І ўсё гэта без аніякага апаратнага забесьпячэньня! Дакладней, з хардам і софтам пад адной чарапною каробкай. Але такое экстатычнае абсталяваньне даступнае далёка ня кожнаму.

У ХХ ст. сытуацыя радыкальна зьмянілася.

Я на ўскраіне Менску, інтэрнэт-кавярня «Voodoo4». Яна ня мае дачыненьня да магіі ці рэлігіі. Проста так называлася адна кібэрспартовая каманда.

Колеры аранжыку й фіялету, а ў белай залі сёньняшнія гульцы ўжо змагаюцца зь віртуальнымі кампутарнымі пэрсанажамі: стрэлы зброі — бліскавіцамі на экранах. Магутныя кампутары ажыўляюць схаваныя ўяўленьні.

> Ёсьць свае траўмы: вачэй, рук, сьпіны — праўда, не такія, як у іншым спорце. Ёсьць майстэрства і прафэсійная дзейнасьць. Ёсьць зацікаўленасьць.

— Беларуская кібэркультура, — тлумачыць мне Зьміцер, вядомы пад нікам «Арханёл» ці «Арч», — гэта дзьве, нават тры субкультуры. Па-першае, гэта людзі, якія сядзяць у чатах, там размаўляюць на свае тэмы. Другі напрамак — кампутарныя гульні. Некаторыя застаюцца аматарамі і гуляюць проста дзеля цікавасьці.

А некаторыя, нарэшце, становяцца прафэсіяналамі. Так пачаў разьвівацца кампутарны спорт, якому ў сьвеце болей за 10 гадоў, а ў Беларусі — гады 3—4.

Хаця ў кібэрспорце ёсьць і кампутарны футбол, і кампутарны хакей, на спаборніцтвы выносяцца тактычныя гульні, калі адна вайсковая каманда абстрэльвае другую каманду, ці стратэгічныя, калі змагаюцца цэлыя «дзяржавы» са сваёй тэрыторыяй, насельніцтвам, эканомікай. Пашыраныя гульні — гэта тактычныя «Contrle Strike» (у нас самая папулярная), «Quake» і стратэгічная «War Craft».

— У гульні «War Craft», — удакладняе «Арханёл», — вы можаце гуляць за людзей, эльфаў ці за нячыстую сілу.

Мне прыходзіць у галаву, што, пэўна, Ігнацію Лаёлу гэта не спадабалася б.

— А ці нельга гуляць проста супраць кампутара?

— Гэта не цікава. Яго можна вылічыць, і ён ніколі не прыдумае таго, што прыдумае чалавек.

Век кібэрспартоўцаў — ад 15 да 20 гадоў. Ёсьць і старэйшыя, 40-гадовыя гульцы, якія прыходзяць на чэмпіянаты, там бачылі нават старога дзядка, але яны аматары. Кібэрспорт вымагае часу. І кампутарны спорт — гэта ў значнай ступені замкнёнае асяродзьдзе, магчыма, не такое жорсткае, як рэлігійны ордэн, але ня ў меншай ступені зацятае й прафэсійнае.

Нельга проста так прыйсьці ў інтэрнэт-клюб — і адразу ўвайсьці ў кола кампутарных спартоўцаў. Трэба паказаць высокую клясу гульні. Трэба надаваць гэтаму шмат высілкаў. Трэба быць на спаборніцтвах. Трэба вучыцца ў майстроў.

— Так я паліць пачаў, — кажа Зьміцер. — На перапынках каманды абмяркоўвалі гульню ў пакойчыках для паленьня. Я і далучыўся.

20-гадовы Зьміцер пасьпеў прайсьці шлях ад звычайнага аматара да арганізатара гульняў. Спачатку ён проста пісаў у «Кампьютерную газету» пра гульні. Пачаў іх вывучаць. Пачаў гуляць і ўдзельнічаць у чэмпіянатах. Арганізаваў свой інтэрнэт-партал па гульнях. Паколькі на гульні ішла львіная доля часу, прыпыніў вучобу. Арганізаваў чэмпіянат з 75 камандаў. І сутыкнуўся з нашымі асаблівасьцямі.

«Беларуская эканоміка — вельмі адмысловая эканоміка. У нас неразьвіты рынак рэклямы і, адпаведна, няма спонсараў. Нармальнае разьвіцьцё затармажваецца».

А вось у Паўднёвай Карэі ёсьць два тэлеканалы, якія трансьлююць кампутарныя гульні. Кампутарны спорт, асабліва калі ведаць яго правілы, надзвычай відовішчны. Вытворцы кампутарнай тэхнікі лічаць за гонар падтрымліваць кібэрспорт, дапамагаць камандам. Гэта ўсё трансьлюецца праз мэдыі, папулярызуецца — і таму кампаніям гэта вельмі выгадна.

Дарэчы, кампутарныя гульні зь лёгкасьцю пераўтвараюцца і ў іншыя масмэдыйныя творы. Так фільмы «Mortal Combat», «Лара Крофт — раскрадальніца магільняў» павырасталі з кампутарных гульняў, а, у сваю чаргу, фільмы «Чужыя» і «Тэрмінатар», ня кажучы ўжо пра «Зоркавыя войны», ператвараюцца ў гульні-стралялкі з пачварамі і робатамі.

Але й традыцыйныя кампутарныя гульні квітнеюць. Разьвіты мэдыйны рынак падтрымлівае, заахвочвае, узмацняе цікавасьць да кампутарнага спорту, і спонсары адчуваюць карысьць ад такой неназойлівай ускоснай рэклямы. Мэдыі, іхняя ўсюдыіснасьць і адкрытасьць гарантуюць бум кібэрспорту.

Кібэрспорт — гэта раскоша інфармацыйных грамадзтваў.

У Беларусі яшчэ ня так. Спонсары папросту не зацікаўленыя даваць грошы на спаборніцтвы, бо не ствараецца розгаласу, а галоўныя інфармацыйныя рупары краіны, здаецца, не разумеюць, пра што ўвогуле ідзе гутарка.

Даецца ў знакі й неразуменьне іміджавай рэклямы. Так, тутэйшаму грашадаўцу вельмі карціць павесіць на эмблему каманды свой нумар тэлефону з усімі выхаднымі зьвесткамі і слоганамі, у той час як на Захадзе абыходзяцца сьціплаю назвай кампаніі, якая афішуе сябе акуратна, паміж радкоў, але дзейсна.

І ўсё ж такі, навошта патрэбны кампутарны спорт?

«А навошта патрэбны спорт?» — гучыць пытаньне ў адказ. Кампутарны спорт — гэта і інвэстыцыі, і каталітычнае разьвіцьцё тэхналёгій, і прэстыж краіны.

Так, у Кітаі добра разьвіты кампутарны спорт — і кітайцы хацелі б уключыць яго ў наступныя алімпійскія спаборніцтвы.

Залатыя кубкі ў інтэрнэт-кавярні — гэта заслугі беларускіх спартоўцаў, якія ня толькі някепска выступілі ўнутры краіны, але добра зарэкамэндавалі сябе й на міжнароднай арэне.

Я прашу, каб мне бліжэй паказалі якую-небудзь гульню. Зьміцер сядае за кампутар — і трапляе ў тактычную гульню «Contrle Strike». Вайсковец, агент, бегае ў лябірынце пустынных завулкаў, хаваецца за сьценамі, страляе ў ворагаў.

Спачатку гэта не падаецца нечым разнастайным, але пакрысе нават назіраньне зацягвае, бо міжволі далучаешся да дзеяньняў гульца, шукаеш варыянты, спрабуеш зрабіць выбар і правільны ход. Куды паварнуць? Як стрэліць? Куды схавацца?

«Прыкры мяне!» — крычыць хлопчык-гулец суседу, але позна, ужо зрабіў няправільны крок — і па экране паляцелі чырвоныя пырскі й шкуматочкі.

Пасьля некаторага ступару я заўважаю, што гэта нейкае чорна-белае бачаньне, усё падзелена на Сьвятло і Цемру — з крывёю і забойствамі. Дый увогуле, ці не ўплывае кампутарная гульня шкодна на псыхіку?

— Я так і думаў, што вы задасьце гэтае пытаньне, — заўважае «Арханёл». — Амэрыканцы замяралі агрэсіўнасьць — высьветлілі, што адбываецца ўсё наадварот. Агрэсіўнасьць падае, псыхіка ўзмацняецца. Праўда, ёсьць невялічкі адсотак людзей, у якіх агрэсіўнасьць павялічвалася, але гэта ненармальныя людзі. Яны паўсюль ёсьць.

Гульцы працягваюць зацята змагацца — страляць, хавацца, выпрацоўваць стратэгіі, ухіляцца ад куль. Іхняй псыхіцы яўна нічога не пагражае.

Я ўжо сыходжу з інтэрнэт-кавярні.

— А якая асабістая вам карысьць ад кібэрспорту?

— Ніякай, — адказвае Зьміцер. — Гэта прафэсійны спорт. Ёсьць свае траўмы: вачэй, рук, сьпіны — праўда, не такія, як у іншым спорце. Ёсьць майстэрства і прафэсійная дзейнасьць. Ёсьць зацікаўленасьць. Гэта спорт.

Што ж, гэта спорт. Віртуальнасьць прайшла шлях ад «Духоўных практыкаваньняў» Армагедону да кампутарнага спорту. Яна патрабуе стрыманасьці і высілкаў. І яна здольная прынесьці славу пераможцам і ласку іміджам.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**20-гадовы Зьміцер прайшоў шлях ад звычайнага аматара да арганізатара гульняў. Спачатку ён проста пісаў у «Кампьютерную газету» пра гульні. Пачаў гуляць і ўдзельнічаць у чэмпіянатах. Арганізаваў свой інтэрнэт-партал па гульнях. Паколькі на гульні ішла львіная доля часу, прыпыніў вучобу. Арганізаваў чэмпіянат з 75 камандаў.**

# Не магу жыве на вуліцы не хачу

Шансон замест року. FM–этэр застаўся бяз радыё англамоўнага року. 16 студзеня кіраўніцтва радыё «Рокс–М» зьмяніла свой фармат з «сур'ёзнай музыкі для дарослых» на «расейскі шансон». Варыянты беларускамоўнага фармату ці джаз–фармату і не разглядаліся, паведамляе Сяргей Будкін.

«Рокс» фармаваў густы той часткі моладзі, якая аддавала перавагу англамоўнаму року перад расейскай папсой. Дзяжурная фраза «роксаўскага» ды-джэя ў адказ на слухацкую заяўку: «Алёну Апіну не паставім, паслухайце песьню гурту «Айрасьміт».

Паводле слоў кіраўніцтва, зьмяніць фармат іх змусіў загад аб 75%-м напаўненьні этэру беларускай музыкай. На думку праграмнага дырэктара «Роксу» Зьмітра Аўсяньнікава, песьні «Лэд Зэпэлін» не спалучаюцца са сьпевамі Дарафеевай, што адбіваецца на якасьці этэру і размывае аўдыторыю. Каб зрабіць этэр больш адэкватным, кіраўніцтва і вырашыла круціць Газманава. «Рокс» сышоў у бок «шансону», каб зьменшыць рызыкі і выжыць: «Аўдыторыя зьменіцца толькі якасна, колькасна застанецца такой жа», — марыць сп.Аўсяньнікаў. Гэта значыць 5% фанаў року зьменяць 5% аматараў Шуфуцінскага.

Ці разглядала станцыя варыянты пераходу ў незанятыя нішу беларускамоўнага радыё (тут табе і 75% лёгка вызначаць), джаз- ці клясык-радыё, якія існуюць у Маскве ці Вільні? Адказвае ды-джэй «Роксу» Адам Старповіч: «Станцыі джаз-накірунку стварыць цяжка. Бо ў Беларусі для такой станцыі ня знойдуцца рэклямадаўцы. Гэтак, аналягічная станцыя нядаўна збанкрутавала ў Варшаве. Што да клясыкі, тое самае». На ягоную думку, мог бы існаваць у нас рок-н-рольны фармат».

На пытаньне, чаму магчымасьць пераходу ў незанятую нішу беларускамоўнага радыё нават не разглядалася, частковы адказ можна знайсьці ў тым, хто ўласьнік «Роксу». «Расейскае радыё» і «Рокс» маюць аднаго кіраўніка і адзіную інфармацыйную службу.

Цікавая карціна на «роксаўскім» форуме, дзе сталыя прыхільнікі радыёстанцыі разьвітваюцца зь любімымі ды-джэямі і праграмамі. Адзін з буйных рэклямадаўцаў, які ўжо пяць год працуе з «Роксам», таксама разьвітаўся з гэтым радыё (як ён мне растлумачыў, «з прычыны непрадказальнасьці новай аўдыторыі»). Ходзяць чуткі пра сыход і некаторых ды-джэяў.

Пытаньне вызначэньня фармату стаіць цяпер перад усімі пятнаццацьцю FM-станцыямі. Усе топчуцца на адной дзялянцы, і, здаецца, ніхто з радыйнікаў не ўсьведамляе, што выйсьце — і ў творчым, і ў камэрцыйным пляне — магло б быць у пераходзе на нейкі новы, незаняты фармат. Але ж гэта культурнае наватарства, і ніхто ня хоча рызыкаваць.

ДЫСКАГРАФІЯ

## Чертополох




Атмараві. (р) 2004, аўтарскае выданьне

Музыка беларускага аўтара, які пераважна жыве ў Нямеччыне, зацягвае спакваля. Стылістыка — электронны расейскамоўны рок, густа замяшаны на ўсялякіх усходніх (ці стылізаваных пад Усход) матывах. Збольшага гэта перадаецца з дапамогай нясьпешнага, мэдытатыўнага выкладаньня матэрыялу, свайго роду адасобленай, сузіральнай вакальнай манеры, якая выклікае асацыяцыі з голасам Эдмунда Шклярскага зь вядомага «Пікніка».

Чым больш слухаеш гэты дыск, тым больш ён падабаецца. Хоць пэўная аднастайнасьць мае месца. Пры гэтым адначасова можна казаць і пра трывалую стылёвую зьнітаванасьць музыкі. Практычна ўсё запісана самім Атмараві, удзел сэсыйных запрошаных музыкаў мінімальны. Тэксты песень зусім не прымітыўныя, то бок «нефарматныя», што толькі радуе, паколькі дае падставы спадзявацца: музыка Атмараві ўдзельнічаць у выкананьні вызначаных 75 этэрных адсоткаў наўрад ці будзе. Таму што ўдзел у цяперашніх ратацыях для беларускага выканаўцы — гэта ўжо амаль канчатковы яму прысуд.

Аднаго не зразумеў: чаму на вокладцы альбому з такой вось назвай зьмешчаны здымак расьліны няхай і вельмі прыгожай, але зусім не дзядоўніку?

**Дзядоўны Слухач**

## 100 дорог




«J_МОРС». (р) 2004, «Green Music»

Першы ў гісторыі беларускай музыкі інтэрнэт-сынгл. Задума цікавая, бо ў выглядзе ўласна кампакт-дыска сынгл гэты ў продаж не паступаў, а яго зьмест разам з вокладкай можна згрузіць выключна з Інтэрнэту. Загалоўная песьня сьмела ўпісваецца ў лік найлепшых здабыткаў калектыву: голас Уладзімера Пугача ўсё ж мае пэўнае чарадзейства, што напэўна адчулі на сабе многія фанаткі «Марсоў». Далейшыя чатыры творы сынглу ўспрымаюцца як ня надта абавязковы даважак, накшталт славутай гандлёвай «нагрузкі» савецкіх часоў. Далібог, ня варта было гэтак блякла перапяваць «Траву ля дому» гурту «Зямляне»: трыб'ют атрымаўся ніякі. Яшчэ тры вядомыя творы з ранейшага рэпэртуару «J_МОРС» перарабілі розныя сі і ды-джэі. Вось чаго я не магу аніяк зразумець, чаму айчынныя музыкі так захапляюцца міксамі, бо часьцей за ўсё яны псуюць арыгіналы. У адрозьненьне ад песень-арыгіналаў, у якіх шанцаў на даўгалецьце ўсё ж звычайна куды больш… У тым ліку не без дапамогі Інтэрнэту. Праўда, у тым выпадку, калі канкурэнты якога вірусу не падсунуць…

**Здарожаны Слухач**

СЬЦІСЛА

### Манэргейм па-беларуску




У прыватным выдавецтве «Колас» выйшла кніга Вэйо Мэры «Маршал Фінляндыі Карл Густаў Манэргейм».

Біяграфію славутага маршала для сэрыі «Постаці гісторыі» пераклаў зь фінскай Якуб Лапатка. Як зазначыў выдавец Зьміцер Колас, надалей ён мае намер працягнуць сэрыю перакладамі біяграфіяў маршала дэ Голя, Юзафа Пілсудзкага.

### Кніга пра гарадзенцаў

У Горадні выйдзе зборнік, прысьвечаны нацыянальна-вызвольнаму руху 1985—1994 г. Так вырашыла мясцовая суполка ГА «Вэтэраны Адраджэньня». Традыцыі паэткі Ларысы Геніюш і Аляксея Карпюка ў канцы 1980-х падхапіла новае пакаленьне адраджэнцаў — Мікола Маркевіч, Мікола Таранда, Кастусь Жынь. Да зборніка будуць прыкладзены фатаздымкі, бюлетэні, дакумэнтальныя сьведчаньні.

### Новы альманах

Літаб'яднаньне «Наддзьвіньне» выводзіць гісторыю ад 1925 г. — калі паэт Алесь Дудар стварыў у Полацку суполку «Маладняку». З тых часоў і традыцыя выдаваць альманахі. Пры канцы 2004 г. зьявіўся чарговы. У нумары творы 25 аўтараў.

### Калляднае сумоўе

16 студзеня полацкая рада ТБМ і бібліятэка мікраараёну Марыненка наладзілі калядную вечарыну. Дзеці з грэка-каталіцкай суполкі падрыхтавалі інсцэніроўку паводле матываў батлейкі. Краязнавец з Дрысеншчыны Антон Бубала чытаў вершы, сьпяваў полацкі рок-гурт «Індра». Завяршыў вечарыну слайд-фільм наваполацкага барда Зьмітра Пугачэўскага.

### 66 млн эўра для Дон Кіхота

На сёлетняе сьвяткаваньне 400-годзьдзя раману Сэрвантэса «Дон Кіхот», прызнанага кнігай усіх часоў і народаў, гішпанскі ўрад выдаткуе 66 млн эўра. Яны пойдуць на спэктаклі, экспазыцыі і г.д. Шквал турыстаў чакаюць у гарадку Вільянуэва-дэ-лёс-Інфантэс (225 км на поўдзень ад Мадрыду), дзе пачынаецца дзеяньне раману. Можна будзе зрабіць тур па «мясьцінах баявой славы» ідальга — маршрут пройдзе праз 105 вёсак.

### Музэй Чэрчыля

У лютым у Вялікабрытаніі адчыніць дзьверы першы музэй Уінстана Чэрчыля. Экспанатамі стануць 150 асабістых рэчаў Чэрчыля, шматлікія дакумэнты і фатаграфіі.

### «Залатыя глёбусы»

У Галівудзе названы ляўрэаты прэміі «Залаты глёбус» — прэлюдыі да «Оскара». Найлепшай драмай названы фільм Марціна Скарсэзэ «Авіятар», а Леанарда Ды Капрыё, які граў там галоўную ролю, — найлепшым акторам. За рэжысуру ўзнагароджаны Клінт Іствуд («Дзяўчына на мільён даляраў»). Найлепшай актрысай — Хілары Суонк, за галоўную ролю ў тым фільме. Найлепшая камэдыя — фільм Аляксандра Пэйна «Убок». За музыку да фільму «Элфі» ўзнагароджаны Мік Джагер з «Ролінг Стоўнз».

**АЛ, ВК, АВ; БелаПАН, Gazeta.pl**

# Чытаньне паэмаў

Аляксандар Ельскі. Выбранае. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2004.



Аляксандар Ельскі.

За саветамі цэлая плеяда беларусазнаўцаўператваралася ў людзей зь легенды. Сярод іх і Аляксандар Ельскі (1834—1916). Працы пісаў па-польску, друкаваў у часопісах і энцыкляпэдыях, а ў дадатак быў панам… Натуральна, што для эпохі «дыктатуры пралетарыяту» стаў пэрсонай нон грата.

Але не сказаць, што ягоных працаў не чыталі гісторыкі мастацтва ці эканомікі. Добра чыталі, бо шмат чаго «пазычылі». Самы сьвежы прыклад грэблівага стаўленьня акадэмічнае гістарыяграфіі да Ельскага — 3 том «Гісторыі Беларусі» (2004). Пераліку прац Ельскага ў кнізе няма. Але на с.199 чытаем: у 1758 г. у Слуцку была заснавана славутая «пэрсярня» (трэба «пэрсіярня»). Зьвесткі — з тэксту кантракту, які 24 студзеня 1758 г. Міхал Казімер Радзівіл (Рыбанька) падпісаў з «пэрсыдзскай, турэцкай, кітайскай, рознай матэрыі і працы майстрам» Янам Маджарскім. Апублікаваў кантракт А.Ельскі. Аднак аўтар акадэмічнага артыкулу не ўлічыў, што слуцкая мануфактура шаўковых паясоў была заснаваная раней, а з Маджарскага пачалася яе слава.

Варта зацеміць, што аўтары артыкулаў у энцыкляпэдычных даведніках пра слуцкую ткальню, урэцкую гуту ды іншае таксама ня лічаць патрэбным спасылацца на свайго папярэдніка. І гэтым адрозьніваюцца ад яго. Дбайна пералічваючы працы сваіх папярэднікаў, А.Ельскі знайшоў у Міхала Балінскага згадку пра ўрэцкую гуту ў XVII ст., а нам кажуць, што яна заснавана ў XVIII ст. Мала таго, ён знайшоў інвэнтар 1744 г., у якім маецца «апісаньне абсталяваньня, варштатаў і інструмэнтаў» яшчэ і фаянсавай майстэрні на Ўрэччы. Да таго ж ён знайшоў «паведамленьні пра адлііку на Ўрэччы гармат і званоў». Немалым адкрыцьцём А.Ельскага ёсьць і тое, што ўрэцкая шкляная гута існавала не ў мястэчку Ўрэчча, як паведамляюць нам даведнікі, а ў двары Ўрэчча: «на высечаных участках і папялішчы» гуты «заснавалі фальварак Заградзьдзе». Цяпер Заградзьдзе — вёска за вёрст сем ад Урэчча, у Паўстынскім сельсавеце Слуцкага раёну, астравок каталіцызму ў праваслаўным атачэньні.

У кнізе А.Ельскага — кабінэтнага работніка і падарожніка, чалавека дапытлівага і назіральнага — я сустрэў назвы дзесяткаў паселішчаў Піншчыны, Случчыны, Ігуменшчыны, Меншчыны і Наваградчыны, у якіх таксама пабываў. Чытаньне нарысаў А.Ельскага для мяне як чытаньне паэмаў. І нават тое, што перакладчыкі Хранова назвалі Хрэнавым, Балгавічы — Булгавічамі, Кель — Келяй, Мядзьвежына — Мядзьведзінам, не замінае мне чуць у гэтых назвах музыку.

Музыка назваў набывае асаблівую чароўнасьць, калі спалучаецца са сьвятлом, якое ідзе адтуль — з XIX ст. І тая ж Старыца, якую ты абхадзіў, паўстае перад табою з карчмою і яе гаспадаром Абрамам Іцкам… І твае Пінск, Лагішын, Слуцак паўстаюць у іншым сьвятле. І не чужыя табе Менск, Тураў, Заслаўе, Наваградак, Мір, Шчорсы, Зембін і Ракаў. І нават пра тваю малую радзіму А.Ельскі піша…

Табе было што пачытаць. І ты мог пераканацца ў слушнасьці слоў Антона Луцкевіча, што ў асобе А.Ельскага «сышоў у магілу апошні прадстаўнік таго кірунку, да каторага ў свайм часе прыналежаў Марцінкевіч, Тапчэўскі, Дыбоўскі», ідэоляг «шляхоцкага дэмакратызму», што А.Ельскі сваёй дзейнасьцю злучаў працу нашаніўцаў і беларускі рух пачатку XX ст. «з цэлай плеядай даўнейшых працаўнікоў на роднай ніве».

І хоць аўтары прадмовы Ўладзімер Казьбярук (ён яшчэ і ўкладальнік, і перакладчык) ды Кастусь Цьвірка абмінулі гэты сюжэт, ты ўсё ж падзякуеш ім, а таксама Натальлі Мазоўцы і Генадзю Кісялёву за гадзіны прыемнага і карыснага чытаньня.

**Анатоль Сідарэвіч**

# Як украінскія гэбісты зьмянілі лёс нацыі

Кіраўнікі СБУ перадавалі інфармацыю аб фальшаваньні выбараў праціўнікам Кучмы, клапаціліся пра бясьпеку лідэраў апазыцыі і дэманстрантаў, удзельнічалі ў псыхалягічнай вайне з чыноўнікамі, піша «Нью-Ёрк Таймс».

Служба бясьпекі Ўкраіны (скарочана СБУ), спадкаемца колішняга КДБ, налічвае 38 000 супрацоўнікаў і не зьяўляецца маналітнай — там ёсьць прыхільнікі як прарасейскага, гэтак і празаходняга накірунку. Улетку 2004 г. яе кіраўнік Леанід Дзяркач быў адпраўлены ў адстаўку пасьля скандалу ў сувязі з продажам радарных сыстэмаў хусэйнаўскаму Іраку. Прэзыдэнт Кучма прызначыў кіраўніком СБУ генэрала Ігара Сьмяшка, празаходне арыентаванага супрацоўніка вайсковай контравыведкі. Ягонае прызначэньне было ацэненае як імкненьне афіцыйнага Кіева падсаладзіць адносіны з Захадам пасьля «радарнага скандалу».

Многія генэралы СБУ даўно ненавідзелі прэм'ера Януковіча і ягоны данецкі клан, шчыльна зьвязаны з былымі арганізаванымі злачыннымі групоўкамі. Аднак за тыдзень перад выбарамі асабістая сустрэча зь Януковічам выклікала ў начальніка СБУ Ігара Сьмяшка такое расчараваньне, што ён падаў у адстаўку і прысягнуў, што ніколі ня будзе працаваць з прэм'ерам. Кучма не прыняў адстаўкі. Незадаволенасьць сілавікоў Януковічам узмацнілася, калі стала ясна, што прэм'ер гатовы ўжыць маштабныя махінацыі, абы перамагчы. Кіраўніцтва СБУ разглядала пытаньне аб калектыўнай адстаўцы, але вырашыла змагацца за захаваньне законнасьці, застаючыся на сваіх пасадах.

Уначы 21 лістапада група генэралаў сабралася ў кабінэце кіраўніка СБУ — яны ўжо ведалі, што будзе абвешчаны фальш пра перамогу прэм'ера Януковіча. Сёньня супрацоўнікі СБУ адзначаюць, што дзеяньні кіраўніцтва СБУ былі вядомыя другому боку — хаця б з прычыны існаваньня ў структурах расейскіх агентаў.

23 лістапада на загад Януковіча ўкраінская пракуратура і МУС выступілі з заявай пра асуджэньне апазыцыі і гатоўнасьць «пакласьці канец любой беззаконнасьці». Пад заявай паставілі і прозьвішча кіраўніка СБУ. Генэрал Сьмяшко быў гэтым разьюшаны, і за гадзіну зьявілася заява СБУ, дзе дэзавуяваўся подпіс Сьмяшка пад супольнай заявай сілавікоў і заяўлялася, што грамадзяне маюць права ажыцьцяўляць палітычныя свабоды, а палітычныя спрэчкі павінны вырашацца толькі мірным шляхам. Гэтыя словы генэрала імгненна былі перададзеныя вядучымі агенцтвамі сьвету. Гэта быў сыгнал, што ў сілавых структурах Украіны, якіх лічылі ляяльнымі да ўладаў, няма адзінства.



**ІГАР СЬМЯШКО, кіраўнік СБУ, — тыповы рыцар плашча і кінжала — выявіўся аранжавым усярэдзіне.**

Далей адбылася неафіцыйная сустрэча кіраўнікоў СБУ і Віктара Ющчанкі, у выніку якой лідэр апазыцыі атрымаў ахову з васьмі байцоў элітнага спэцпадразьдзяленьня, а кіраўнік СБУ — ліст спрыяньня за подпісам Ющчанкі. Генэралы пагадзіліся заявіць, што яны — не на баку якога-небудзь канкрэтнага кандыдата, а на баку закону. У тую ж ноч Ющчанка зьявіўся на Майдане разам за пяцьцю кіраўнікамі СБУ. Гэта быў сыгнал для іншых. Гэткім жа сыгналам былі і інтэрвію адстаўных генэралаў СБУ, якія сказалі, што іх жонкі і дзеці знаходзяцца на Майдане.

27 лістапада, калі стала ясна, што дэманстранты гатовыя змагацца на вуліцах Кіева, нягледзячы на маразы, Кучма сабраў нараду, на якой прысутнічалі Януковіч, палітыкі з усходу Ўкраіны і кіраўнік МУС Мікола Білаконь. Януковіч выставіў Кучму патрабаваньні: прызначыць дату інаўгурацыі, абвясьціць надзвычайнае становішча і разагнаць дэманстрантаў.

Прэм'еру адказаў Сьмяшко: «Вось Білаконь, кіраўнік МУС. Вы, як кіраўнік ураду, пісьмова загадаеце яму разблякаваць урадавыя будынкі? Вы гэта зробіце?» Януковіч змаўчаў. «Вось вы і адказалі, — працягваў Сьмяшко. — Вы гэтага ня зробіце. Давайце ня будзем вярзьці лухту. Ва ўжываньні сілы няма сэнсу».

Тады і Кучма загаварыў з сваім пратэжэ ледзяным тонам. «Вы занадта асьмялелі, Віктар Фёдаравіч, — сказаў ён. — Вам бы варта было паказаць сваю сьмеласьць на Майдане Незалежнасьці».

Кучма выйшаў пазваніць і вярнуўся са здымачнай групай дзяржаўнага ТБ. Януковіч кінуў асадку і пайшоў.

28 лістапада спэцслужбы ўратавалі краіну ад праліцьця крыві. А 10-й вечара ў брыгадзе Ўнутраных войскаў прагучаў сыгнал трывогі. Больш за 10 тыс. салдатаў Унутраных войскаў кінуліся да грузавікоў. Большасьць была ў касках, з дубінкамі і шчытамі. Тры тысячы былі ўзброеныя. Многія — у чорных масках. Паводле слоў іх начальніка, генэрал-лейтэнанта Сяргея Папкова, праз 45 хвілін ім раздалі амуніцыю ды сьлязісты газ. Хто даў ім загад, застаецца няясным. Паўнамоцтвы на гэта мелі толькі тры асобы — Кучма, Януковіч і Медзьведчук.

Інфармацыя пра трывогу была перададзена камандаваньню СБУ, якое праінфармавала апазыцыю, сваіх афіцэраў на Майдане Незалежнасьці і амэрыканскае пасольства. Палкоўнік СБУ, які падтрымліваў сувязь з арганізатарамі дэманстрацый, павінен быў сустрэць войскі і папярэдзіць афіцэраў, што разгон дэманстрантаў безь пісьмовага загаду незаконны. Ён таксама меўся папярэдзіць іх, што аддзелы СБУ вядуць назіраньне за Кіевам і ўсе дзеяньні будуць зьняты на відэа, а пасьля прадстаўлены ў якасьці доказаў.

Сілавікі і Цімашэнка сустрэліся ў будынку службы вайсковай выведкі. Паводле слоў Цімашэнкі, яна са зьдзіўленьнем назірала за тым, як сілавікі тэлефануюць і папярэджваюць МУС, што «яны на баку народу і абароняць людзей, што калі войскі МУС увойдуць у горад, ім прыйдзецца мець справу ня толькі зь бяззбройнымі людзьмі, але і з арміяй» ды спэцназам разьведкі.

Урэшце Папкоў здаўся. «Ён сказаў, што толькі выконвае загады», — паведаміла Цімашэнка. Грузавікі спыніліся на шашы. А праз пару хвілінаў прагучаў адбой трывогі.

**АП**

# Зрабі паўзу. Напішы пра садавіну

Пакаленьне Пу, якое вырасла на байках аб вялікай Расеі, але апранаецца ў «Армані». Фэномэн «twixters» — субкультура людзей ад 18 да 30 гадоў, якія не жадаюць мець сталай працы і жывуць за кошт бацькоў. Люстрацыя ва Ўкраіне й Польшчы. **Лёлік Ушкін** аглядае замежную прэсу.

Перш за ўсё хачу засьведчыць слушнасьць старога журналісцкага тэзісу: найлепшы сюжэт дае само жыцьцё. Хіба Натальля Геваркян, калюмніст «Газеты.ру», нарадзіла супэркалёнку «Калядная гісторыя» без эмацыйнага штуршка, які яна атрымала падчас палёту з Парыжу ў Маскву? У самалёце кампаніі «Air France» ёй давялося пазнаёміцца з «залатой пуцінскай моладзьдзю». Падчас бордынгу «идущие вместе» дасталі пасажыраў салёну базарамі пра тое, які круты Пуцін. Аднак як толькі стуард абвясьціў, што ўзьніклі праблемы з прыладамі і трэба пачакаць, пакуль спэцыялісты яшчэ раз усё праверяць, «патрыёты» ламануліся вонкі.

«Яны так пабеглі першымі, гэтыя адвязныя тусовачныя дзеткі, якія толькі што кідалі патрыятычныя рэплікі за свайго крутога прэзыдэнта і за ягонае публічнае нахабства [...]. Гэта было пуцінскае пакаленьне, якое вырасла на байках аб вялікай Расеі і аб тым, што комплекс разбуранай імпэрыі мусіць быць пераадолены любой цаной. Пустыя ўнутры, апранутыя ў «Армані», заскокам у Парыж, абавязкова ў першай клясе, нашпігаваныя пры гэтым своеасаблівым уяўленьнем аб вялікасьці сваёй радзімы, узброеныя ксэнафобіяй і марай аб праве расейца пасьля увесь сьвет у ж...».

Цікава, як праз некалькі гадоў маладая беларуская эліта будзе весьці дыялёг з пуцінскімі бэбі?

Трэба прызнаць, што беларуская мадэль generation X усё больш адпавядае заходнім трэндам. Часопіс «Time» зрабіў тэмай апошняга нумару фэномэн «twixters». Гаворка ідзе пра субкультуру людзей ад 18 да 30 гадоў. Сацыёлягі адзначаюць, што ўпершыню ў гісторыі гэтая страта грамадзтва займае дзіўную пазыцыю: яны не жадаюць мець сталай працы, жывуць за кошт бацькоў, маюць нестабільныя сэксуальныя адносіны. Нарадзіўся стыль Пітэраў Пэнаў — людзей, якія вырашылі ніколі ня быць дарослымі. Сацыяльная машына, якая ў мінулым рабіла зь дзяцей дарослых, больш не працуе.

Сытуацыя падобная на беларускую.

У глябальным фармаце журналісцкая тусоўка адыходзіць ад тэмы цунамі. Апошняй зарніцай стаў цудоўны артыкул Закі Ляеэдзі ў францускай «Liberation». Ён разважае на тэму, пры якіх умовах рэгіянальная падзея можа набыць плянэтарны рэзананс. І выводзіць наступную формулу: «Ангажаванасьць у падзею прадстаўнікоў розных народаў, плянэтарнае адзінства падзеі, мабілізацыя афэктаў і мэдыйны малюнак».

Украіну і Польшчу яднае рэдкае для гэтых краін адзінства тэм. І там і там размаўляюць пра люстрацыі.

У артыкуле «Бандытаў за краты» аўтарка «Дзеркала тыжня» Вольга Дзьмітрычава доўга думае, перасьледаваць ці не прадстаўнікоў кучмаўскай адміністрацыі, і прыходзіць да высновы: «Калі мы ня станем сьведкамі публічных судовых працэсаў над тымі, хто дабіў краіну дзеля свах карысных



AP

фінансава-палітычных мэт, хутчэй за ўсе, так і застанецца».

Зь ёй фактычна пагаджаецца «Wprost», зрабіўшы тэмай нумару тэчкі спэцслужбаў. Тое, што палякі пасьля круглага стала не расказалі праўду аб сваім супрацоўніцтве з рэжымам, зрабіла зь іх зомбі камунізму. Напрыканцы журналісты прапануюць цікавую мадэль разрыву зь мінулым: «Вельмі шкада, што за некалькі гадоў не знайшлося ніводнага сьмельчака, хто б паўтарыў жэст Раскольнікава і публічна расказаў аб сваім рамане са службай бясьпекі. Калі б зьявіўся хаця б адзін такі чалавек, за ім пайшлі б іншыя. Такая мадэль аўталюстрацыі прывяла б да аўтэнтычнага народнага адзінства».

Увогуле на старонках сусьветнай прэсы — дыктат папсы; вось, напрыклад, галоўныя тэмы вядучых нямецкіх штотыднёвікаў: «Чаму карысна спажываньне садавіны?» («Stern»), «Поп-ікона Айнштайн — у чым прычына ягонай геніяльнасьці?» («Spiegel»), «Як мюнхенскай паліцыі пашчасьціла знайсьці забойцу нейкага мадэльера, дзякуючы сьлядам ДНК» («FAZ»).

Відавочна, што дамінаваньне папсы — толькі паўза. Ніякіх сумневаў, што наступны тыдзень прынясе нам шмат спэкуляцый на тэму другой інаўгурацыі Буша-юніёра. Па другое, на носе 50-я гадавіна вызваленьня Асьвенцыму, 80-я — стварэньня НСДАП і 60-годзьдзе Перамогі.

Тэма вайны ўжо сёньня на вуснах у француза: Ле Пэн справакаваў гучны скандал, заявіўшы ў інтэрвію штотыднёвіку «Rivarol», што гітлераўская акупацыя была амаль гуманістычнай. Яшчэ больш капаюцца ў мінулым брытанцы. Усё праз выхадку **прынца Гары (на фота)**, які заявіўся на паці з нацысцкай павязкай. Акрамя ўсяго, свастыка на рукаве касьцюма Гары справакавала палеміку пра гістарычныя кантакты прадстаўнікоў віндзорскай манархіі з нацыстамі і пра перавагі рэспублікі.

Мне спадабаліся прарэспубліканскія аргумэнты калюмніста «Observer» Дэвіда Аарановіча, які даводзіць што толькі дзесяць асоб у Англіі (прынц Гары, каралева, арцыбіскуп, прэм'ер-міністар і шэраг іншых) ня могуць публічна насіць павязку са свастыкай. Калі б на месцы Гары быў нехта іншы, ніхто б нават не пачухаўся. Проста каралі, маркізы і дафіны — закладнікі свайго паходжаньня. Аарановіч піша: «Цана, якую асоба, народжаная ў каралеўскай сям'і, плаціць за тое, каб быць прадстаўніком манархіі, занадта вялікая. Асоба пазбаўлена вольнага выбару. Ім (прадстаўнікам сямейства Віндзор) патрэбен эквівалент «Фронту вызваленьня жывёл». Яго баевікі маглі б адчыніць залатую клетку, у якую пасадзілі Гары, і сказаць: цяпер ты вольны, рабі ўсё, што хочаш — жаніся, працуй...

Адным словам, скандал пераходзіць на праблему паліткарэктнасьці. Дзякуй богу, што, заявіўшыся на вечарыну, прынц Гары сп'яна ня ляпнуў: «І ня толькі ўсё дрэннае зьвязана зь імем Адольфа Гітлера».

# Уменьне трымаць язык за зубамі

Колькі расейскіх шпегаў дзейнічае ў Літве? Віленскае выданьне «Летувас рытас» мае адказ: сотня. Прычым спэцслужбы стараюцца сабе завесьці агентаў у войску, палітычных партыях і інстытуцыях, зьвязаных з Эўразьвязам ды NATO. Праблема шпіёнства аналізуецца ў артыкуле «Маскоўскія шчупальцы не адпускаюць Літвы».



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Расейскія шпегі — найчасьцей дыпляматы, бізнэсмэны, журналісты і турысты — цікавяцца літаральна ўсім: палітычнымі працэсамі, партыямі, палітыкай, вайсковай справай. Не застаецца па-за ўвагай і літоўская актыўнасьць на міжнароднай арэне. Міністар аховы краю Гедымінас Кіркілас паведаміў «Летувас рытас», што журналістаў бюро расейскага Першага каналу, якія папрасіліся да яго на інтэрвію, прыватна цікавіў выключна літоўскі кантынгент у Аўганістане.

Летась Літва дэпартавала за шпіянаж пяць расейскіх дыпляматаў, а нядаўна газэта пісала пра кіраўніка дэпутацкага футбольнага клюбу — літоўца расейскага паходжаньня. Праца ў клюбе — ягоная адзіная крыніца даходаў. Але скуль тады грошы на арганізацыю гучных прыёмаў для дэпутатаў-футбалістаў? Спрабуючы пасябраваць з палітыкамі, дэпутат завёў сабе кабінэт у будынку парлямэнту. Можна дапусьціць, што дэпутат таксама быў агентам расейскай выведкі.

Як засьцерагчыся ад усяго гэтага? «Летувас рытас» мае рэцэпт: «Трэба быць асьцярожнымі — многія чыноўнікі і палітыкі ня ўмеюць трымаць языка за зубамі і ахвотна дзеляцца з расейцамі інфармацыяй, напрыклад, падчас абедаў».

Журналісты штотыднёвіка «Лайкас» пагутарылі з афіцэрам контрвыведкі, які распавёў, што з таго часу, як у Шаўлях зьявіліся пілёты NATO, у горадзе актывізавалася дзейнасьць расейскіх рэзыдэнтаў і агентаў выведкі. «У горадзе пачалі даваць канцэрты зоркі расейскай эстрады, часьцей прыяжджае цырк, значна павялічылася колькасьць расейскіх турыстаў і журналістаў», — заклапочаны афіцэр.

**Алесь Пяткевіч**

# Узьлёт антыпартыйнае партыі

Рух нямецкіх «зялёных» нарадзіўся ў 1970-х. 25 гадоў таму, 13 студзеня 1980 г., было абвешчана аб стварэньні палітычнае партыі. За 25 гадоў з антыпартыйнае партыі колішнія скандалісты выраслі ва ўдзельнікаў урадавай кааліцыі. Ёшка Фішэр больш ня ходзіць у кедах на пасяджэньні ўраду.



## Пагроза для дэмакратыі

Ужо ўвесну 1977 г. у Заходняй Нямеччыне складаліся сьпісы абаронцаў навакольнага асяродзьдзя і працаўнікаў атамнай энэргетыкі, а ў кастрычніку 1979 «зялёныя» ўпершыню трапілі ў ландтаг, адбылося гэта ў зямлі Брэмэн.

Напачатку некаторыя прадстаўнікі «сур'ёзных партый» бачылі ў перадвыбарных сьпісах зялёных «пагрозу для дэмакратыі». Але ўжо праз тры гады пасьля заснаваньня партыі стракатая група ў кедах і бэзавых камбінэзонах, з сымбалічнымі сланечнікамі і галубамі міру, увайшла ў бундэстаг. Яны дэманстравалі, за што яны выступаюць, прыцягнуўшы ў бонскі ўрадавы квартал засохлую елку са Шварцвальду і вялізны глобус: абарона навакольнага асяродзьдзя і антыатамная палітыка, трэці сьвет, роўнасьць полаў і мір.

Першыя дэпутаты ад «зялёных» — сярод іх цяперашні міністар замежных спраў Ёшка Фішэр — хацелі выкарыстаць парлямэнт як прастору для палітычных памкненьняў грамадзянскіх ініцыятыў. З таго часу «зялёныя» адмовіліся ад многіх сваіх палітычных мэтаў, навучыліся ісьці на кампрамісы і з «пагрозы для дэмакратыі» ператварыліся ў цалкам салідную экалягічна-ліберальную партыю. Бютыкофэру больш падабаецца іншае азначэньне: маўляў, ягоная партыя з «канфрантацыйных зялёных» зрабілася партыяй «канструктыўных зялёных».

## У парлямэнце і ўрадзе

«Зялёным» хутка давялося пераканацца, што ў якасьці маленькай апазыцыйнай партыі яны, як бы ні стараліся іх дэпутаты, мала што могуць зрабіць. Адзіным посьпехам у іхным паслужным сьпісе была забарона на ўвоз у Нямеччыну марскіх чарапах. У сваім палітычным бясьсільлі «зялёныя» часта паварочвалі свае сілы супраць самых сябе. Змаганьне ўнутры партыі паміж «рэалістамі» і «фундамэнталістамі» скончылася перамогаю рэалістаў, згрупаваных вакол Ёшкі Фішэра.

Па выбарах 1987 году «зялёныя» — не ў апошнюю чаргу праз атамную катастрофу ў Чарнобылі — здолелі павялічыць колькасьць месцаў у парлямэнце з 5,6% да 8,3%. Але на выбарах у бундэстаг у 1990 годзе, падчас ліхаманкі вакол узьяднаньня падзеленай Нямеччыны, «зялёныя» паставілі на памылковы лёзунг. Яны казалі: «Усе гавораць пра Нямеччыну. Мы гаворым пра клімат». Узяць пяціадсоткавы бар'ер удалося толькі ва ўсходніх землях. У 1994, пасьля аб'яднаньня з усходненямецкімі «зялёнымі» і «Зьвязам-90», партыі ўдалося зноў прабіцца ў парлямэнт, набраўшы 7,3% галасоў. Летась на выбарах у Эўрапарлямэнт «зялёным» аддалі свае галасы ўжо амаль 12% выбарцаў.

## «Калісьці мы станем такімі, як яны, і не заўважым гэтага»

Усе гэтыя гады сярод «зялёных» была пашырана боязь занадта прыстасавацца. «Калісьці мы станем такімі, як яны, і не заўважым гэтага», — казаў адзін з ідэйных лідэраў зялёных Губэрт Кляйнэрт у пачатку 1980-х. Прыстасаваньне стала відавочным, калі Ёшка Фішэр, зрабіўшыся ў 1998 міністрам замежных спраў, адзеў пашыты на замову гарнітур-тройку. У 1985 у якасьці міністра навакольнага асяродзьдзя зямлі Гесэн ён яшчэ прымаў прысягу ў кедах.

За 25 гадоў з антыпартыйнае партыі, як яе называла адна з заснавальнікаў Пэтра Келі, колішнія скандалісты выраслі ва ўдзельнікаў урадавай кааліцыі і, паводле слоў лідэра партыі Райнгарда Бютыкофэра, «удзельнічаюць у вызначэньні таго, што ёсьць сучасным, што ёсьць прагрэсіўным».

**АП; паводле Stern.de**

## СЬЦІСЛА

### У ЭЗ можа зьявіцца ўласная грын-карта

На думку Эўракамісіі, Эўропа мусіць ад практыкі выдачы кароткатэрміновых працоўных візаў перайсьці да сыстэмы, што практыкуецца ў ЗША. Гэта дазволіць заключаць кантракты з замежнымі работнікамі на пэрспэктыву. Згодна з прапанаванай схемай замежнік, які атрымае грын-карту ў адной краіне, зможа свабодна перамяшчацца ў межах усіх дзяржаў Зьвязу. Паводле дэмаграфічных прагнозаў Эўракамісіі, колькасьць працаздольнага насельніцтва ў Эўропе да 2030 году зьменшыцца на 20 млн.

### Цімашэвіча на прэзыдэнта Польшчы

Паводле генэральнага сакратара Саюзу лявіцы дэмакратычнай Марка Дыдуха, цяперашні маршалак сойму — найбольш адпаведны кандыдат на пасаду прэзыдэнта ад левых. Паводле апошніх апытаньняў грамадзкай думкі, 16,7% палякаў гатовы аддаць свае галасы за гэтага вэтэрана посткамуністычнае польскае палітыкі.

### Юшчанку Нобэлеўскую прэмію

Ініцыятыўная група украінскіх прафэсараў вылучыла кандыдатуру Віктара Юшчанкі на атрыманьне Нобэлеўскай прэміі міру за 2005 год. Ініцыятары прапануюць усім ахвотным да 1 лютага дасылаць лісты з гэтай прапановай у Нобэлеўскі камітэт. У ініцыятыўную групу ўвайшлі рэктар Кіева-Магілянскай акадэміі Вячаслаў Брухавецкі, рэктар Львоўскага ўнівэрсытэту імя Івана Франка Іван Вакарчук ды інш. Права вылучаць на гэтую прэмію маюць прафэсары ўнівэрсытэтаў і шэраг міжнародных арганізацый.

### Тытунёвым канцэрнам пагражае разарэньне

Дзьве тысячы курцоў падаюць у суд супраць вытворцаў тытуню, абвінавачваючы іх у нанясеньні шкоды свайму здароўю, піша «Жэчпасполіта». Акцыю арганізавала Польскае таварыства спрыяньня здароўю і навучаньня здароваму ладу жыцьця. Кожны з ахвотных запоўніў тыповы пазоў у суд з патрабаваньнем кампэнсацыі ў памеры ад 40 да 80 тыс. злотых (11 000—22 000 даляраў) і даверанасьць, каб таварыства прадстаўляла ягоныя інтарэсы ў судзе. Адпаведныя формы былі надрукаваны ў рэгіянальнай прэсе. Калі суд задаволіць пазоў, гэта разарыць вытворцаў цыгарэт. «Папяросы — апошні прадукт з тых, што прадаюцца ў цывілізаваных краінах, які пры ўжываньні «згодна з інструкцыяй» выклікае рак!» — абураюцца прыхільнікі здаровага ладу. Яны прыводзяць прыклад ЗША, дзе тытунёвыя канцэрны адлічваюць мільярды даляраў у фонд, які ідзе на лячэньне хвароб, выкліканых паленьнем.

### Украіна: пражытачны мінімум

Парлямэнт Украіны пераадолеў вэта прэзыдэнта Кучмы на павышэньне пражытачнага мінімуму на 70 грывень — да 432 грывень (больш за 80 даляраў).

**АП, МБ; gazeta.pl, korrespondent.net**

# Развагі каля калыскі

Як выхоўваць дзіця і пры гэтым належаць сабе, захаваць свае сацыяльныя ролі? Адказы шукае маладая мама **Тацяна Шчаўрук**.



## Маналёг першы: адвага

Як мы рэагуем на зьяўленьне ў нашым жыцьці немаўляці?

Зрэшты, што такое — наша жыцьцё? Што ў ім самае значнае і ці гатовы мы чымсьці ахвяраваць дзеля малога?

Адна мая знаёмая ўзяла шлюб адразу пасьля школы, закахаўшыся ў старэйшага на дзесяць гадоў мужчыну. Аднак здарылася трагедыя — памерла малое. А тут яшчэ муж пачаў раўнаваць, і хоць хутка зьявілася другое дзіця, жанчына вярнулася да бацькоў. Давялося пачынаць з нуля. Адукацыі, апрача школьнай, ніякай, працы таксама. Але яна рэалізавала сваю даўнюю мару, паступіла ў інстытут на эстраднае аддзяленьне. Было нялёгка — па ўзросьце выходзіла старэйшая за ўсіх аднакурсьнікаў. Да яе ставіліся з усьмешкай: куды ўжо, маўляў, табе? Але яна аказалася моцнай натурай. Вучылася, увесь час падпрацоўвала, і дзіцем увесь час займалася, а потым зьехала ў Маскву — далей працаваць, вучыцца. Марыць здымацца ў кіно. Спадзяюся, што ўсё ў яе ўдасца.

Другая мая сяброўка таксама рана выйшла замуж. Амаль дзесяць гадоў з мужам і двума дзецьмі туліліся ў пакойчыку ў дзьвюхпакаёвай кватэры разам зь дзядамі. Яна і вучылася, і мужу працаваць дапамагала. Колькі гадоў таму перабраліся ў двухпавярховы катэдж пад горадам, дзе нават ёсьць кабінэт, гасьцёўня з камінам ды басэйн на двары. Сяброўка выглядае шчасьлівай — і жонкай, і маці — і марыць пра трэцяе дзіцё.

Але ёсьць сярод маіх знаёмых і сем'і, якія жывуць «дзеля сябе». Забавы, рэстараны, тусоўкі. З раніцы яны зарабляюць грошы, а ўвечары — расслабляюцца. Пагаварыць зь імі можна хіба пра дыеты, саўны, касмэтычныя салёны, трэнажорныя залі, пра паездкі на мора, адзеньне ды ўпрыгажэньні. Пра ўсё, акрамя дзяцей. Заводзіш размову, у іх робіцца абыякавы выгляд: «Мы яшчэ маладыя — пасьпеем», «Няма асобнай кватэры», «Шкада цікавай працы» альбо наагул «А навошта?».

Дзеці ня ўпісваюцца ў іх уладкаванае кола жыцьця, у якім прысутнічае страх штосьці згубіць. А можа папросту ў іх няма здольнасьці і адвагі ўзяць на сябе адказнасьць... перадусім за ўласнае жыцьцё.

Са зьяўленьнем дзіцяці зьяўляецца пачуцьцё адказнасьці. А ты толькі потым і чакаеш сустрэчы з гэтай *вельмі сымпатычнай асобай* і думаеш пра тое, як *яна* цябе ўспрымае. І чым больш расьце тваё пачуцьцё любові, тым больш будзеш старацца жыць дзеля яе.

А ўсе страхі, паверце, пераадольныя — і грошы можна зарабіць, і кватэру зьняць, дый час на самаадукацыю заўжды знойдзецца.

Дадайце сюды радасную ўсьмешку, якая зьяўляецца, калі выназіраеце за вашым прыгожым «гномікам», шмат новых уражаньняў — і выйдзе партрэт шчасьлівага, упэўненага ў сваіх сілах чалавека ў атачэньні здаровенькіх дзетак.

## Маналёг другі: інтуіцыя

Вось і заснула маё дзіцятка. Таму ёсьць нейкі час падумаць пра нашы зь ім узаемаадносіны.

Дарослыя часьцей за ўсё выхоўваюць дзіця «пад сябе». Яны лічаць, што лепей ведаюць, калі і што трэба рабіць, і таму вельмі часта пачынаюць абмяжоўваць дзяцей. Перш за ўсё, кожная мама павінна памятаць, што яе дзіця не такое, як яна, і не такое, як другія дзеці. Маці трэба навучыцца «не замінаць».

Апроч таго, у кожнай жанчыны ёсьць інтуіцыя, якая дапаможа знайсьці адказ на любое пытаньне. Тым больш гэта патрэбна ў становішчы, калі бабулі тлумачаць «па-свойму», сяброўкі — па-свойму, дактары — па-свойму. Напрыклад, у пытаньні, ці доўга працягваць карміць грудзьмі, мае бабкі зь цёткамі вохкаюць: «Што ты сабе думаеш?! Гэта ж чым далей, тым цяжэй будзе». Сяброўкі радзяць рабіць так, як паступалі самі. Дактары... Зь імі найцяжэй. Літаральна кожны мае свой пункт гледжаньня і на тое, як карміць, і з чаго пачынаць прыкорм.

Вось маладой маці тут і спатрэбіцца якраз тая інтуіцыя.

Але і з унутраным «я» таксама галоўнае не памыліцца. Перш чым вырашыць, ці сказаць «няможна», трэба спачатку прыслухацца да сябе, да сваіх пачуць-

> Усе страхі пераадольныя — і грошы можна зарабіць, і кватэру зьняць, дый час на самаадукацыю заўжды знойдзецца.

цяў, а затым паразважаць, як паўплывае ваша рашэньне на станаўленьне характару дзіцяці, на разьвіцьцё ягонай памяці, фантазіі і г.д.

Напрыклад, вы прачыталі ў кнізе, які павінен быць рэжым дня, і цяпер вашай дачцэ (ці сыну) трэба спаць, але яна (ён) нечым вельмі засяроджана занятая. Якое выйсьце з гэтай сытуацыі? Варта спыніць захапляльны працэс ці даць магчымасьць дагуляць? Кожная маці вырашае сама. Прычым, на жаль, як сабе зручней, часам забываючыся, што, можа, у гэты момант яе дзіця выходзіць на новы ўзровень разуменьня жыцьця і рэчаў… Вось адчуць, наколькі такі момант ёсьць каштоўным, і дапамагае наша інтуіцыя.

## Маналёг трэці: увага

Для немаўляці самае важнае — гэта быць побач з маці, адчуваць яе цяпло, любоў, увагу. Маці ў гэты час адыходзіць ад усіх сацыяльных роляў і ўжо не належыць сабе. Адна справа, калі ты не абцяжарана працай, вучобай, ды яшчэ ёсьць побач бабулі.

Ці ёсьць прыклад мусульманскага Ўсходу. У радзільным доме разам са мной у палаце ляжала аўганка Лайла. У яе нарадзілася дзяўчынка, і кабета ўвесь час пытала ў мяне, што зь ёй рабіць. Я вельмі дзівілася: «У цябе — трэцяе дзіця, ты павінна ведаць пра ўсё лепей за мяне». Яна і растлумачыла, што згодна зь іх традыцыямі парадзіха на працягу сарака дзён аднаўляе сілы і ўвогуле не займаецца дзіцем. Яго прыносяць толькі карміць. Таму даглядалі і рабілі ўсё астатняе па доме маці са сьвякрухай.

Але ў нас не Аўганістан. Трэба ўпраўляцца самому. Безумоўна, вельмі цяжка, перадусім маральна. Такой жанчыне, акрамя роляў маці ды жонкі, трэба быць яшчэ і дачкой, і сяброўкай, і прафэсіяналам, ды наагул трэба заставацца проста прыгожай жанчынай.

А як усё пасьпець? Адныя мае знаёмыя вырашылі праблему, наняўшы няньку, якая робіць усю працу, набывае прадукты, гатуе і гуляе зь дзіцем на двары. Такім чынам, зьяўляецца шмат лішняга часу.

Іншыя аддаюць дзяцей у прыватны садок, здараецца, што муж бярэ адпачынак па доглядзе малога, і тады жанчына не «выпадае» з сацыяльнага кола. Але ў такіх вырашэньнях ёсьць значныя мінусы. І галоўны зь іх — маці мала бавіць часу са сваім дзіцем.

Мая сяброўка знайшла выхад: яна па гадзінах расьпісвала, калі ёй што зрабіць трэба. Трэба навучыцца вылучаць галоўнае і бачыць як далёкую, так і блізкую пэрспэктыву. І ня трэба ўпадаць у адчай, калі вы ня здолелі зрабіць тое, што заплянавалі. Першы крок заўсёды цяжкі. А потым ужо галоўнае не спыняцца.

**КОШТЫ**

На платныя прыватныя абвесткі (для прыватных асобаў) на стар. 16

**Рэклямныя расцэнкі:**
— да 20 словаў (тэкставы модуль) — 4100 руб.

За кожныя наступныя 20 словаў (тэкставы модуль) — 4000 руб. Афармленая абвестка з улікам кошту арыгінал-макету за 1 $см^2$ — 650 руб. Абвесткі палітычнага характару і ад грамадзкіх арганізацыяў аплачваюцца паводле рэклямных расцэнак для камэрцыйных абвестак.
Каб замовіць платную прыватную абвестку, трэба пераказаць грошы праз пошту на разьліковы рахунак: УНП 101115521. Рэдакцыя газэты «Наша Ніва», вул.Калектарная, 11. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвэстбанк», код 764.
На зваротным баку блянку паштовага пераказу ў сэктары «Для пісьмовых паведамленьняў» запісваецца дакладна й чытэльна тэкст абвесткі, тэлефон для сувязі і абавязкова дадаецца сказ: «За рэклямныя паслугі».

Даведкі праз т. (017) 284-73-29

# Ленін-вызваліцель

Расея на парозе XXI ст. пакутліва, марудна, але разьвіталася са сваёй камуністычнай ракаўкай, у якой праседзела восем дзясяткаў гадоў. Напэўна, незваротна. Цяпер словы «Расея» і «бальшавізм» ужо ня тоесныя. На зьмену, гэтаксама пакутліва й марудна, прыходзіць нешта іншае, акрэсьліць якое я не бяруся. Але відавочна, Ленін — ужо не нацыянальны расейскі герой. І ягоны маўзалей сёньня — адно турыстычная забаўка. Недарэмна адпалі дыскусіі адносна яго лёсу. Мяркуючы па расейскіх мэдыях сёньня, Ленін — грэшны харызматык, які заклаў падваліны найноўшае Расеі, замардаваў мільёны людзей і скараціў яе тэрыторыю. Такім чынам, бачаньне ягонае ролі ў расейскай гісторыі пакрысе набывае цалкам іншае трактаваньне, чым тое, што існавала за саветамі.

А хто ж такі Ленін зь беларускага гледзішча? Пытаньне зусім няпростае для нас, тых, хто па-ранейшаму жыве ў полі культуры, наскрозь прасякнутай духам саветызму і некрытычнага стаўленьня да камуністычнае спадчыны. Мы жывём у тым самым сьведамасным асяродку, што быў тут і да «перастройкі».

Ленін, насуперак домыслам ахвочых гісторыкаў, у Беларусі ніколі ня быў (у адрозьненьне ад цара Мікалая II, напрыклад). Адпаведна, ягонае стаўленьне да нас фармавалася пераважна зь літаратуры й пэрыёдыкаў. Напрыклад, зь нямецкіх газэт, якія ён чытаў у кавярнях на эміграцыі. Прыпушчаю, што гэтае стаўленьне Леніна было скажоным. Акурат на гады ягонае эміграцыі й бурапеннае закалотнае дзейнасьці прыпадае нечуваны ўзьлёт Беларушчыны. Па-нашаму выдавалася ўжо колькі пэрыёдыкаў, пашыралася кніжніцтва, паўстаў драматычны тэатар. Беларусы гуртаваліся па ўласных арганізацыях і партыях. Маштаб гэтага руху звонку выглядаў куды большым, чым тут зь сярэдзіны. Адпаведна, прыступіўшы да развалу імпэрыі, Ленін вырашыў: «Лепей перасаліць, чым недасаліць», — і на карысьць Беларусі.

У сваім артыкуле «Крытычныя нататкі паводле нацыянальнага пытаньня» ў 1913 г. ён пісаў: «Прагрэсіўным зьяўляецца абуджэньне масаў ад фэадальнае сьпячкі, іхная барацьба супраць усялякага прыгнёту, за сувэрэннасьць народу, за сувэрэннасьць нацыі. Адсюль безумоўная абавязанасьць марксіста адстойваць самы рашучы дэмакратызм ва ўсіх галінах нацыянальнага пытаньня…». Гэта было напрадвесьні радыкальных зьменаў усяе эўрапейскае гісторыі. А вось ужо напярэдадні самога бальшавіцкага перавароту, у кастрычніку 1917 г., ён піша: «Нацыянальнае й аграрнае пытаньні — гэта карэнныя пытаньні для дробнабуржуазных масаў Расеі ў цяперашні час. (…) Пралетарыят адзіны можа весьці барацьбу па абодвух пытаньнях, …бо ўпершыню масы сустрэлі б не бязьлітасны прыгнёт сялян панамі, як пры царызьме, …а гарачае спачуваньне, доказнае ў справе, неадкладныя й рэвалюцыйныя захады супраць памешчыкаў, неадкладнае аднаўленьне поўнае свабоды для Фінляндыі, Беларусі, для мусульманаў і г.д.». Гэткім чынам, ужо напярэдадні «кастрычніцкае рэвалюцыі» Ленін запраграмаваў стварэньне беларускае апрычонае дзяржаўнасьці. А праз пэўны час пасьлядоўна адстойваў яе на практыцы.

Урэшце, сама ідэя поўнае беларускае незалежнасьці й Дзень Волі сталі магчымымі ў выніку найперш бальшавіцкага перавароту 1917 г. і рэвалюцыйнага тэрору, якога жахнуліся ўсе народы. Многія сучасьнікі менавіта ў гэтым бачылі прычыну імклівага пашырэньня ідэі незалежнасьці Беларусі, што бачылася альтэрнатываю хаосу.

А па-другое, замірэньне Леніна зь немцамі ды іхнімі хаўрусьнікамі ў сакавіку 1918 г. само па сабе пакіда-

> Каб Ленін ня кінуў Расеі ў крывавы колазварот рэвалюцыі, беларусаў чакаў бы лёс нашых братоў на Смаленшчыне.

ла беларусам права на самавызначэньне: «Для вызначаных абласцей зь іх ранейшае прыналежнасьці Расеі ня будзе вынікаць аніякіх абавязаньняў у дачыненьні да Расеі». У тое міжчасьсе й паўстала БНР. Расея ленінская пакідала Беларусь на вытвор лёсу. Невыпадкова ўжо ад тае пары на акупаванай немцамі тэрыторыі на вачах паўстала беларускае школьніцтва, загучалі беларускія казаньні ў сьвятынях, завіравала грамадзкае жыцьцё. Неймаверна, каб гэтак склаўся беларускі лёс за царом ці за часамі Керанскага.

Разам з тым масы беларускіх бежанцаў і разагітаваных палітыкамі жаўнераў з маракамі лёгка падпадалі пад уплыў сьвядомае беларус-

> Ідэі сацыяльнае роўнасьці, закінутыя паплечнікамі Леніна ў беларускую ніву, ліквідавалі станавы, а ўрэшце й непераадольны маёмасны падзел паміж беларусамі. Да 1991 г. беларусы сталі кансалідаваным народам.

кае інтэлігенцыі й уцягваліся ў працэс будаваньня ўласнае сацыялістычнае дзяржавы — БССР. Менавіта Ленін адстойваў перад паплечнікамі ідэю поўнае незалежнасьці савецкіх рэспублік, востра крытыкуючы сталінскую «аўтанамізацыю». На жнівеньскім пленуме Палітбюро ЦК Сталін прапанаваў савецкім рэспублікам увайсьці ў склад Расеі на правах аўтаноміі. ЦК Кампартыі Беларусі быў супраць (!) і выказаўся за захаваньне існуючага стану. Ленін неадкладна піша ліст у Палітбюро «Аб утварэньні СССР», у якім падкрэсьлівае, што РСФСР павінна прызнаць сябе раўнапраўнай зь іншымі рэспублікамі і «разам і нароўні з усімі» ўвайсьці ў новы саюз.

У цыдулцы, адрасаванай Каменеву, у кастрычніку 1922 г. Ленін піша: «Т.Каменеў! Вялікарасейскаму шавінізму абвяшчаю бой не на жыцьцё, а на сьмерць». У выніку такое рашучасьці Леніна ў 1922 годзе паўстаў насамрэч фармальна раўнапраўны саюз Беларусі, Расеі, Украіны й Закаўказьзя з правам вольнага выхаду з СССР кожнага з суб'ектаў.

Такім чынам, можна канстатаваць: каб Уладзімер Ульянаў ня ўздыбіў падбітай Расеі й ня кінуў бы яе ў крывавы колазварот рэвалюцыі й войнаў, справа нацыянальнага вызваленьня беларусаў была б амаль немагчымаю. Ва ўмовах адноснае дэмакратыі й лібэралізму бальшыню беларусаў пакрысе напаткаў бы лёс нашых братоў на Смаленшчыне й Браншчыне, дзе беларускасьці не знайсьці й зь лятарняю ўдзень. Кола сьвядомае беларушчыны было б зьвужана да неправаслаўных асьветна-культурных асяродкаў аматараў, дыспэрсна расьсеяных па абшарах краю. Каб Ленін не ўсталяваў міру ў Берасьці, у тутэйшага люду заставаліся б ілюзіі адносна вяртаньня сюды Расеі і, адпаведна, яны паралізавалі б нацыянальную волю да Свабоды. Каб ня ленінская авантура з паходам на Варшаву ў 1920 г., каб не бальшавіцкі тэрор, каб не бязбожны перасьлед вернікаў, у беларускіх масаў захоўваўся б сантымэнт да Расеі, нават і бальшавіцкай. Сам факт існаваньня ўласнае савецкае дзяржаўнасьці, фактычна падоранай Леніным, і досьвед унутранага культурнага й гаспадарчага будаўніцтва кансалідаваў нашу нацыю, зрабіў яе такой, якая яна ёсьць сёньня. Ідэі сацыяльнае роўнасьці, закінутыя паплечнікамі Леніна ў беларускую ніву, прарасьлі рознымі кветкамі, а перадусім ліквідавалі станавы, а ўрэшце й непераадольны маёмасны падзел паміж беларусамі. У 1991 г. беларусы былі гамагенным, кансалідаваным народам, што ўваходзіў разам у новую эру. Атэістычная прапаганда й поўная сэкулярызацыя амаль дапічэнту сьцерлі й канфэсійныя адрозьненьні між намі, што ўспрымаюцца сёньня адно як права асабістага культурнага выбару пры 70 адсотках індыфэрэнтнага да рэлігіі грамадзтва.

Нас абмінулі самыя жорсткія баі грамадзянскае вайны, якую разьвязаў быў Ленін у Расеі, абмінула ягоная высылка інтэлігенцыі ў 1922 г., расстрэлы закладнікаў і г.д. Таму, зважаючы на рэаліі беларускае гісторыі 1917—1924 г., то бок да сьмерці Леніна, варта зазначыць, што ягоная роля ў стварэньні нашае дзяржаўнасьці, сацыяльным разьняволеньні выключная.

Цікава, што менавіта на гэты пэрыяд нашае гісторыі прыпадае росквіт нашае мастацкае культуры, паўстае ўнікальны фэномэн Віцебску. Наўрад ці гэта было б магчымым пры татальных рэпрэсіях. Таму невыпадкова БССР на доўгія гады была ідэальным узорам для Заходняе Беларусі. Таму й да сёньня беларусы ня могуць вычуваць шчырае непрыязнасьці да Леніна. А бадай, і не павінны.

**Гары Куманецкі**




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

АПЫТАНЬНЕ «НН»

## Што такое Ленін

**Працяг са старонкі 2.**

прыклад Сталіну, — кажа Наста. — Ён зрабіў нэп, а пра нэп я глядзела прыкольны фільм: спэкулянты, валютчыкі… жывенька так». Помнікі Наста прапануе пакінуць, «калі яны ня кідаюцца ў вочы». А лепш іх пераплавіць у трактары, лавачкі і ліхтары.

**Сястра Насты Хрысьціна вучыцца ў дзявятай клясе расейскамоўнай гімназіі ў Заводзкім раёне** (яна кажа, што ў беларускамоўнай клясе вучацца поўныя лахі і рагоча). Ленін Хрысьціне падабаецца «як мужчына». Яна ня ведае, хто ён, бо не захапляецца гісторыяй, але ведае, што ён быў «круты». «Ён тыпу быў бальшавік, але ў душы яму гэта ня трэба было», — кажа Хрыся. Для Беларусі ён рабіў толькі добрае, «выдаваў толькі добрыя ўказы і дэкрэты». Помнікі Хрысьціна разбураць ня раіць: «Хай стаяць. Усё ж Ленін ёсьць Ленін. Ён быў больш за народ, чым усе астатнія, хто зь ім жыў». Крыху падумаўшы, Хрысьціна вырашае, што помнікі трэба зьвезьці ў адно месца і адкрыць там фан-клюб Леніна.

**Алег з другога курсу БДУІР** лічыць, што Ленін — філёзаф, для Беларусі зрабіў шмат добрага, «гэты чалавечак рэальна мысьліў, інакш, чым астатнія, і для народу». Помнікі Алег зьвёз бы ў грандыёзны парк.

**Антон, другакурсьнік з журфаку**, лічыць, што «Ленін — гэта чалавек, які «ўгробіў» Расею, сам таго не жадаючы, перавёў яе ў каменны век». Для Беларусі Ленін таксама рабіў толькі кепскае, але што — Антон не памятае. «А помнікі няхай стаяць, маечкі з надпісам «СССР» таксама нядаўна былі ў модзе, а гэта з таго ж шэрагу».

**Алег вучыцца на філфаку, курс другі.** Ленін — гэта лысы чувак, і зусім невядома, што ён увогуле рабіў, паколькі Алега тады яшчэ не было. «Замест помнікаў Леніну, відаць, трэба паставіць помнікі прэзыдэнту… Ну, як хоць я адказаў?»

**Сьвета вучыцца ў беларускамоўнай клясе Лідзкай сярэдняй школы**, сёлета сканчае 11 клясу (яна скардзіцца, што ад моўнага прыярытэту клясы — адна назва, усё роўна большасьць прадметаў па-расейску). Ленін — кіраўнік СССР, лысы з казьлінай барадой. Зрабіў больш кепскага, чаго кепскага — няясна. Замест яго помнікаў трэба паўсюль наставіць помнікаў Скарыну.

**Яе сястра Таня вучыцца на журфаку, на другім курсе**. Толкам для Беларусі нічога Ленін не рабіў. Помнік трэба пакінуць адзін, для гісторыі, астатнія паздымаць.

**Для Андрэя зь пятага курсу педагагічнага ўнівэру** Ленін — адзін з савецкіх лідэраў, вялікага розуму, але малога пачуцьця. З помнікаў, лічыць Андрэй, трэба сьцябацца. Размалёўваць іх, рабіць зь імі пэрформансы, каб выклікаць адваротнае стаўленьне, чым тое, на якое разьлічвалася пры іх узьвядзеньні.

**Тэда Лі**

## Як глядзеў на Леніна беларускі марксіст Антон Луцкевіч?

Цьвёрда засвоіўшы з тэорыі Карла Маркса яе эвалюцыйную сутнасьць, ён ведаў, што сацыялізм немагчымы без адпаведнага ўзроўню разьвіцьця прадукцыйных сілаў грамадзтва і ўзроўню культуры працоўных клясаў. Другі бок у марксізьме (дакладней — у палітычнай практыцы раньняга марксізму), тое, што Эдуард Бэрнштайн назваў элемэнтамі блянкізму, А.Луцкевіч ігнараваў. Затое блянкізм (і пра гэта пісаў Георгі Пляханаў) у якасьці марксізму паднесьлі бальшавікі на чале зь Леніным. Кастрычніцкі пераварот, учынены імі, пярэчыў самому духу марксізму, не вынікаў зь яго, быў нясьпелым пладом, спароджаным вялікаю навальніцаю — сусьветнаю вайною. Луцкевіч быў адным з марксістаў, якія зьвярнулі ўвагу на тое, што кастрычніцкі пераварот ня ёсьць наступствам «закончанае *гаспадарчае эвалюцыі*». Вітаючы НЭП і нацыянальную палітыку, распрацаваную Леніным на пачатку 1920-х, Луцкевіч усё ж сумняваўся ў даўгавечнасьці і сацыяльна-палітычнага экспэрымэнту, ініцыяванага бальшавікамі, і самога СССР, бо яны не былі вынікам эканамічнай, культурнай і дзяржаўна-прававой эвалюцыі. Ягоны артыкул «Вялікі экспэрымэнтатар» можна паставіць у адзін шэраг з працамі Карла Каўцкага і Розы Люксэмбург, у якіх таксама неаптымістычна вымалёўваліся пэрспэктывы савецкага рэжыму. Ёсьць у Луцкевіча і праца «Дзьве дарогі», таксама напісаная на пачатку 1924 г. — адразу пасьля сьмерці прэзыдэнта ЗША Вудры Ўілсана. Луцкевіч параўноўвае падыход двух выдатных дзеячаў да нацыянальнага пытаньня і адзначае, што Ленін і Ўілсан ішлі да аднае мэты дзьвюма рознымі дарогамі. Цікава адзначыць, што праз дзясяткі гадоў практычна да тае ж высновы прыйшоў і адзін з самых прыкметных марксісцкіх сацыёлягаў і эканамістаў нашага часу Імануэль Валерстайн. І апошняе. Калі ў 1929 г. Сталін пачаў сваю «рэвалюцыю зьверху», якая цалкам адмаўляла ленінскі «аграрна-каапэратыўны сацыялізм» і нацыянальную праграму, Луцкевіч стане жорсткім крытыкам гэтага курсу. А НЭП і задуму СССР як саюзу раўнапраўных рэспублік будзе называць геніяльнымі ідэямі Леніна. Калі чытаеш Луцкевіча, дык выносіш думку: калі б гэтая палітыка праводзілася бальшавікамі ў 1918 г., Луцкевіч перайшоў бы на іх бок. Зрэшты, ён сам прызнаваўся, што ў 1918 г. гатовы быў увесьці ў БНР савецкую канстытуцыю пры ўмове прызнаньня самастойнасьці Рэспублікі.

**Анатоль Сідарэвіч**

# «Вялікі экспэрымэнтатар»

## АНТОН ЛУЦКЕВІЧ

Памёр Ленін…

Памёр «вялікі экспэрымэнтатар», памёр чалавек, які адважыўся павясьці народныя масы бязьмежнае Расеі найпрасьцейшай і найкарацейшай дарогай да *сацыяльнае рэвалюцыі*.

Так многа ўсюдых гаворыцца аб сацыяльнай рэвалюцыі! Сацыялісты гавораць аб ёй як аб далёкім, але няўхільным дні «вялікае расплаты», калі работнікі ўсяго сьвету возьмуць у свае рукі вытвар іх жа ўласнае працы — усю прамысловасьць, абапертую сяньня на капіталістычным ладзе і дзеля гэтага засуджаную на катастрофу. Буржуазія гаворыць аб сацыяльнай рэвалюцыі зь нянавісьцяй і страхам, але й яна ня можа запярэчыць няўхільнасьці замены капіталізму грамадзкай гаспадаркай, толькі не прадстаўляе сабе магчымым выбух яе ў хуткім часе. Бо і адны і другія прывыклі ўсе перамены ў грамадзкім жыцьці разглядаць *эвалюцыйна* і перакананы, што народы сьвету чакае яшчэ вельмі доўгі пэрыяд *насьпяваньня* сацыяльнае рэвалюцыі, якая павінна выбухнуць тады, калі *расьцьвіўшы* і *перацьвіўшы* капіталізм згубіць апраўданьне свайго існаваньня, як неадпавядаючы вымогам вытворчасьці.

Але мы ня ведаем ні ў якой галіне грамадзкага жыцьця такое «ідэальнае эвалюцыі». Дасьпеўшыя плады, праўда, спадаюць з дрэва і бязь ветру; але наляцеўшая навальніца страсае часта і недасьпеўшыя, і зусім сырыя…

Такая навальніца праляцела на нашых вачох над усенькім сьветам, устросшы яго да самых фундамэнтаў. У сувязі з сусьветнай вайной пачало валіцца тое, што пры нармальных варунках яшчэ доўгія гады павінна б было «дасьпяваць».

У першы чарод пачалі валіцца *манархіі*: манархічная ўлада, абапертая на волі адзінкі — «памазаньніка божага», — ужо даўно перажыла тыя часы, калі дзеля тых ці іншых прычын існаваньне яе аб’ектыўна было апраўдана. Як дасьпеўшы і нават перасьпеўшы плод, яна і павінна была першая стацца ахвярай сусьветнае завірухі. І там, дзе ўлада манарха, як у Расеі, на пагляд, была найпаўнейшая, дзе яна найбольш рэзка разыходзілася з вымогамі новага жыцьця, што зарадзілася і бурліла ўжо ў гушчы народнай, — там развал манархіі адбыўся ў найбольш рэзкай, найбольш катастрафічнай форме.

А адначасна з развалам царызму ў Расеі, Нямеччыне, Аўстрыі — пачынаецца развал і саміх гэтых *дзяржаваў*. Наперадзе ўсіх і тут ідзе Расея, стаўшаяся *астрогам народаў,* паняволеных сілай аружжа. І адзін за адным вызваленыя народы выходзяць з гэнага астрогу — дзеля самастойнага, ні ад кога не залежнага дзяржаўнага жыцьця.

Мімаволі думка наша зварачаецца назад — да таго вялікага ў гісторыі ўсіх народаў мамэнту, дзясятыя ўгодкі якога выпадаюць сёлета: да мамэнту выбуху *сусьветнае вайны*.

Напярэдадні гэтага мамэнту ўлада расейскага цара здавалася такой магутнай, моц Расейскае дзяржавы — такой нязломнай, што нават найбольш гарачыя рэвалюцыянэры і незалежнікі спасярод «інародцаў» прадстаўлялі сабе мамэнт рэвалюцыі і вызваленьня паняволеных народаў яшчэ дужа-дужа далёкім. Дый пры *нармальным* ходзе выпадкаў такі пагляд быў, безумоўна, абаснаваны. Але ваенная навальніца перавярнула ўсё ўверх дном, і тое, на што нармальна трэба б было чакаць доўгія дзясяткі гадоў, адбылося за тры ваенныя гады…

*Эвалюцыянізм* у палітычна-дзяржаўным жыцьці як быццам збанкрутаваў. Вайна, узварушыўшы да дна ўсё жыцьцё народаў, *далёкае і немагчымае зрабіла блізкім і магчымым.*

Але вайна закранула ня толькі палітычна-дзяржаўнае жыцьцё: яна асабліва жорстка ўстрасянула эканамічнымі асновамі жыцьця ваюючых і нават нэўтральных гаспадарстваў, яна высунула на першы плян пытаньні *сацыяльнага характару*. А лёгкасьць, зь якою адбыўся цэлы рад палітычных рэвалюцыяў, збудзіла сярод рэвалюцыянэраў думку: ці ў гэтай агульнай пераацэнцы цэннасьцяў не пара заняцца пераацэнкай і пагляду на рэвалюцыю *сацыяльную?* Мо гэтая другая рэвалюцыя акажацца таксама блізкай і магчымай, якой аказалася рэвалюцыя палітычная?

Як бы жыцьцё яго ні разьвязала, сьлед вялікага расейскага экспэрымэнту ніколі не загіне ў гісторыі змаганьня Працы людзкое за вызваленьне з-пад улады Капіталу. Ужо гэта адно ўвекавечвае імя Леніна.

І вось знайшліся людзі, якія пастанавілі зрабіць спробу: *зьдзейсьніць цяпер,* у нашы дні, усё тое, што клясычны марксізм адкладаў на далёкую будучыню, разглядаючы *сацыяльную рэвалюцыю* як вынік закончанае *гаспадарчае эвалюцыі*. Замест адбудоўваць з вытваранага вайной хаосу капіталістычную Расею, якая б ізноў узлажыла капіталістычнае ярмо на шыі працоўных масаў, гэтыя людзі, здабыўшы дзяржаўную ўладу, надумаліся на руінах капіталістычнае манархіі распачаць будаваньне нечага зусім новага, небывалага, непрактыкаванага: *будаваньне сацыялістычнае рэспублікі,* у якой зьдзейсьнілася б максымальная праграма сацыялістаў усяго сьвету. А правадыром гэтых сьмелых экспэрымэнтатараў, іх ідэйным кіраўніком быў *Уладзімер Ульянаў-Ленін.*

І пачалася рэалізацыя ідэі сацыялізму — *воляй інтэлекту рэвалюцыйных народных масаў,* не аглядаючыся, ці настаў «абвешчаны праз пракракаў» марксізму час на гэта.

У бясспыннай, цяжкай, напружанай барацьбе клаў Ленін фундамэнты пад сваю будоўлю. У працягу шасьцёх гадоў гэты бясспрэчна геніяльны чалавек ня раз памыляўся. Але кожын раз, як бачыў свае абмылкі, меў адвагу сільных людзей прызнацца да іх і шукаць новых дарог. І мы бачым пачатак знамянітага «НЭПу» (новае эканамічнае палітыкі), бачым рашучы паварот у нацыянальнай палітыцы і прызнаньне справы тварэньня нацыянальных культур і нацыянальных рэспублік асновай усяго дзяржаўнага будаўніцтва Саюзу Сацыялістычных Радавых Рэспублік.

Куды завядуць сьмелых экспэрымэнтатараў гэтыя новыя дарогі? Да «Саюзу Сацыялістычных Радавых Рэспублік Эўропы» ці нават усяго сьвету, як аб гэтым летуцеў Ленін? Ці да поўнага развалу спробы рэалізацыі сацыялістычных ідэалаў, да «старога карыта» — да ўзнаўленьня капіталізму і царызму ў адбудаванай у даваенных межах «единой, неделимой» Расеі, аб чым не перастае сьніць наяве ўся мнагатысячная расейская заграгічная эміграцыя? Вось пытаньне, за разьвязку якога на нашых вачох адбываецца барацьба ня толькі ў межах Расеі, але і на ўсенькім сьвеце, дзе ўжо зварухнуліся работніцкія масы, збуджаныя чырвоным заравам з Усходу.

Але як бы жыцьцё яго ні разьвязала, сьлед вялікага расейскага экспэрымэнту, нават у прыпадку поўнае няўдачы яго, ніколі не загінуў бы ў гісторыі змаганьня Працы людзкое за вызваленьне з-пад улады Капіталу. І ўжо гэта адно *ўвекавечвае* імя Леніна як у памяці яго ідэйных супраціўнікаў, так і ў памяці тых, каго ён меў адвагу павясьці па шляху крывавае барацьбы да аканчальнага і поўнага вызваленьня.

**Друкуецца паводле: «Змаганьне», 1924, 27 студзеня, дзе апублікаваны ўпершыню бяз подпісу.**



WWW.WHITEHOUSE.GOV

**Луцкевіч параўноўваў падыходы прэзыдэнта ЗША Вудры Ўілсана і Ўладзімера Леніна да нацыянальнага пытаньня і адзначаў, што яны ішлі да аднае мэты дзьвюма рознымі дарогамі.**



# Пашана да чужых

Помнікі ленінскага культу стаяць побач з адноўленымі хрысьціянскімі храмамі. Так у свой час захоўваліся паганскія капішчы — нават пасьля стагодзьдзяў хрысьціянства. Беларусы заўсёды з пашанай ставіліся да боствў, нават да чужых і зрынутых.

Беларусь — кананічная тэрыторыя ленінізму. Разумееш гэта, калі глядзіш на расьцяжкі, якія зьявіліся над праспэктам Скарыны ў Менску напярэдадні чарговай гадавіны кастрычніцкага перавароту 1917 году, — «7 лістапада — 84-годзьдзе Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі». Нават у Расеі, дзе гэтая рэвалюцыя зьяўляецца часткай нацыянальнай гісторыі, дзень 7 лістапада даўно атрымаў новую, вольную ад ідэалёгіі назву. У Беларусі ж, здаецца, час спыніўся. Але толькі здаецца, бо, каб зразумець фэномэн беларускага ленінізму, недастаткова звароту толькі да гістарычных ці ідэалягічных катэгорый. Хаду гісторыі нельга спыніць. Ужо 13 гадоў не існуе Савецкага Саюзу, у беларускіх школах дзеці вывучаюць зусім іншую гісторыю па іншых падручніках, у якіх ужо ёсьць разьдзелы, прысьвечаныя найноўшай гісторыі — гісторыі незалежнай Беларусі. Ідэалёгія таксама зьмянілася, прычым на дзяржаўным узроўні. Але ва ўсёй Беларусі надалей стаяць на плошчах помнікі Леніну, а вуліцы носяць яго імя. Прычыны жывучасьці ленінскіх сымбаляў — у кульце ягонай асобы, які быў створаны вакол яго, кульце сапраўды рэлігійным па сваёй сутнасьці.

Савецкая ўлада ад самага пачатку свайго існаваньня пачала вайну супраць рэлігіі, якая, паводле Леніна, зьяўляецца опіюмам для народу. Бальшавікі разумелі, што недастаткова толькі зьнішчыць храмы і духавенства. Замест зьнішчанай рэлігіі трэба было даць людзям

# Самы беларускі пэрсанаж

Нам засталася спадчына — тысячы вобразаў правадыра рознага маштабу

**СЯРГЕЙ ХАРЭЎСКІ**

*Мы прыйшлі ў дзіцячы сад,*
*Бачым Леніна пагляд.*
*«Добры дзень, дзядуля Ленін!» —*
*Павітацца кожны рад.*

Мы багата чаго не зрабілі за гады сваёй незалежнасьці. Сярод іншага — не асэнсавалі ўласнае мастацкае спадчыны савецкіх часоў. За 80 гадоў культурнага будаваньня пад кіраўніцтвам камуністаў была створана велізарная маса артэфактаў, што й да сёньня дэтэрмінуе беларускае жыцьцё. Помнікі Леніну й драбнейшым ягоным паплечнікам, творы мастацтва й кніжныя развалы ў бібліятэках, назвы паселішчаў і вуліцаў (толькі ў Менску: станцыя мэтро «Плошча Леніна» й вуліца Леніна, вуліца Ўльянаўская, фабрыка імя Крупскай і г.д.) па-ранейшаму моцна вызначаюць каардынаты нашага быцьця.

Вобраз Уладзімера Ўльянава, то бок Леніна, зьявіўся ў беларускім мастацтве яшчэ пры ягоным жыцьці. Нашы народныя майстры яго ляпілі, ткалі, выціналі, выразалі з дрэва, выкладалі з саломкі, птушыных пёраў і нават зь ячнае шкарлупы. Гісторыя данесла да нас славутыя ў народзе імёны разьбяра Хрушчова й ткачыхі Серады, якія першымі ўславілі вобраз завадатара бальшавіцкага перавароту ў Расеі. А слынны скульптар Аляксандар Грубэ яшчэ ў 1922 г. стварыў першы ў нашай культуры вялікі манумэнт «Ленін на трыбуне», праз два гады — бюст правадыра для Краснапольля. Нават будаўніцтва маўзалею для Ўльянава не абышлося безь беларускіх майстроў, якіх адмыслова завезьлі ў Маскву.

Ужо па сьмерці «правадыра пралетарыяту» даніну ягонае памяці аддалі ўсе нашы скульптары, ад Азгура й Бразера да Арлова й Глебава. А помнік Леніну працы Манізера, пастаўлены ў 1933 г. перад Домам ураду, стаўся ня толькі адным зь першых у СССР, але й сапраўдным шэдэўрам у сваім жанры.

Стваральнікамі культу Леніна былі й найлепшыя нашы графікі 1920-х гадоў — Анатоль Тычына, Павал Гуткоўскі, Ібрагім Гембіцкі, Ахола Вало. Перадусім яскравым прыкладам сынтэзу можна лічыць кнігу Міхася Чарота «Ленін» у аздобе Тычыны.

Першы жывапісны партрэт Леніна ў 1926 г. напісаў Валянцін Волкаў, адразу трапіўшы ва «ўсесаюзныя» клясыкі. Ад таго часу лененіяна, ва ўсіх відах і жанрах, расла ў Беларусі ў геамэтрычнай прагрэсіі. Аднак толькі па вайне маштаб выяў Леніна пачаў нагадваць эгіпцкае мастацтва, дзе вакол фараона-гіганта валтузяцца стафажам чалавекападобныя карузлікі.




П.ГУТКОЎСКІ. ПЛЯКАТ «ЛЕНІН» ДЛЯ ЧАСОПІСУ «МАЛАДНЯК», 1924.

Да сярэдзіны 1980-х гадоў ці ня кожны сябар беларускага Саюзу мастакоў прысьвяціў Леніну свае работы. Каталёгі тагачасных выставаў стракацяць ягонымі вобразамі ва ўсіх відах і жанрах выяўленчага мастацтва. Наша клясыка. Калі стыль барока, што ахапіў у нас эпоху ад XVI да XIX ст., можна сьмела ўважаць за самы беларускі, то Ленін — самы беларускі пэрсанаж XX ст.

Росквіт і заняпад гэтага «правадырнага» жанру прыпадае на часы брэжнеўшчыны. У Беларусі ўрэшце ён мінімізаваўся да паасобных скульптурных работ і алегарычных карцін. Мастакі зазвычай некрытычна паўтаралі прыёмы, што былі прытарнаваныя да недасяжнае велічыні асобы.

Нам засталася спадчына — тысячы вобразаў правадыра рознага маштабу. Адзін іх просты пералік ня ўлез бы ў цэлую газэту. Ёсьць сярод іх і насамрэч выбітныя творы. Напрыклад, трыпціх Канстанціна Касмачова «Незабыўнае», ілюстрацыі Васіля Шаранговіча да паэмы Маякоўскага «Ўладзімер Ільліч Ленін» ці габэлен Міхала Савіцкага й Аляксандра Кішчанкі «Ленінізм» для ЦК КПБ. Мы маем калясальны пляст беларускага мастацтва, па аб'ёме зь якім нішто ня можа параўнацца. Ён непараўнальна большы, чым, напрыклад, усё, што было прысьвечана мастакамі «дакастрычніцкаму» пэрыяду нашае гісторыі. На подзіў, мы гэтак і не займелі сваёй хрэстаматыі ленініяны — адмысловых кніг, альбомаў, каталёгаў. Тое, што ёсьць у расейцаў, украінцаў, а нават і ў латышоў.

> У нацыянальны музэй Ленініяны трэба сабраць і шэдэўры, і кур'ёзы, рэчы з саломкі й золата, тканыя дываны й мэталаканструкцыі.

Што рабіць з усім гэтым даробкам цяпер?

Зьнішчаць? Але ж мы не талібы. Пахаваць па лёхах і гарышчах? Ніякага сэнсу, бо гэта не разьвязвае праблемы разуменьня. Пакінуць усё на сваіх месцах? Не выпадае, бо сёньняшняя РБ — не БССР.

Відавочна, што найлепшыя, з гледзішча эстэтыкі, творы, вартасьць якіх вымяраецца ўласна мастацкімі крытэрамі, мусяць быць зьмешчаны ў мастацкія музэі. Яны добра вядомыя адмыслоўцам. І стаўленьне да іх мусіць быць адно як да выбітных твораў выяўленчага мастацтва, каштоўных, напрыклад, жывапісным ладам альбо кампазыцыйнай канструкцыяй. Некаторым, значным з гістарычнага гледзішча (напрыклад, усе даваенныя рэчы), самае месца ў адпаведных экспазыцыях краязнаўчых музэяў. Нешта, з разраду ананімных шаблёнаў, час распрадаць-раздарыць, як прыкольныя сувэніры або інтэр'ерны стылёвы антураж.

Бальшыню ж беларускае ленініяны даўно пара згрэбсьці ў тэматычныя паркі. Напрыклад, пры канцы былога праспэкту Леніна ў Менску альбо на левым беразе Прыпяці, паміж Мазыром і Калінкавічамі. Выключна камэрцыйныя былі б праекты. Са сьвятламузычнымі фантанамі й экстрэмальнымі атракцыёнамі.

Але перадусім варта стварыць нацыянальны музэй Ленініяны, у якім былі б сабраны і шэдэўры, і кур'ёзы, рэчы з саломкі й золата, тканыя дываны й зварныя мэталаканструкцыі. Давесьці ўсё да эмацыйнае кульмінацыі. Толькі такім чынам мы зможам зірнуць на гэта ўсё збоку, адстаронена, як на іншыя тэматычныя музэі, накшталт усходняга ці заходнеэўрапейскага мастацтва, пажарнай ці вайсковай гісторыі. Бо як мы растлумачым дзецям, што было тады? Ці паверацьяны бяз прыкладаў? Гэта быў бы рахунак нацыянальнага сумленьня. Бо ўжо сёньня з даведнікаў і каталёгаў старанна вышкрабаецца імя Леніна, як некалі Сталіна. Нібыта мастакі нічога такога й не рабілі. Калі ўсё пойдзе гэткім чынам, то мы зноў займеем правалы ў нацыянальнай памяці.

А яшчэ ўсё гэта варта зьберагчы й паказаць, каб не забылася, хто й што рабіў цягам тых даўжэзных савецкіх дзесяцігодзьдзяў. А хто не рабіў.

# багоў

новую, а культ Бога павінен быў заступіць нейкі новы культ. Ленін на гэтую ролю падыходзіў як найлепш, я ягоная хуткая сьмерць толькі паскорыла гэты працэс. Пабудова маўзалею на Краснай плошчы ў Маскве стала пунктам адліку эры новай рэлігіі. Маўзалей заступіў сабой усе зьнішчаныя і нязьнішчаныя хрысьціянскія сьвятыні. Можа, таму не былі разбураныя цэрквы маскоўскага Крамля, што з культавых будынкаў яны ператварыліся ў помнікі гісторыі і культуры, у іх не адбываўся больш хрысьціянскі культ, у сьвяцілішчах не было больш эўхарыстычнага цела Хрыста. Месцам культу стала Красная плошча, дзе ў новазбудаваным сьвяцілішчы знаходзілася цела новага бога, з уласьцівымі для боства прыкметамі. Ленін быў абвешчаны жывым, а ягоная справа павінна была жыць у вяках. Была створана свая камуністычная тройца, у якую безьвынікова спрабаваў упісацца Сталін. Пачалося стварэньне новай іканаграфіі і гімнаграфіі, старыя рэлігійныя сьвяты замяняліся новымі адпаведнікамі.

Сымбалічнае сутыкненьне беларусаў з новай рэлігіяй адбылося пры будаўніцтве маўзалею. У свой час беларускія майстры будавалі цэрквы маскоўскім царам, цяпер жа іх нашчадкі пабудавалі галоўную сьвятыню культу Леніна. Пачалося маштабнае пасьвячэньне беларускіх гарадоў і мястэчак новаму боству — на цэнтральных плошчах, дзе раней дамінавалі цэрквы ды касьцёлы, пачалі ставіць помнікі Правадыру. Стаяць яны і дагэтуль, часта побач з аднаўленымі хрысьціянскімі храмамі. Ведаючы беларусаў, можна ўпэўнена сказаць, яшчэ доўга будуць стаяць. Так у свой час захоўваліся паганскія капішчы — нават пасьля стагодзьдзяў існаваньня на Беларусі хрысьціянства. Беларусы заўсёды з пашанай ставіліся да боствоў, нават да чужых і зрынутых, таму знос помніка Леніна разглядаецца як акт блюзьнерства. Ідэі ленінізму нікога ўжо не захапляюць, а помнікі яго стваральніку стаяць па ўсім краі, яны ёсьць даўно выразьнікамі ня культу асобы, а талерантнасьці і верацярпімасьці беларусаў.

**Алесь Трафіменка**

# Хто ў нас Ільліч

**АНДРЭЙ РАСІНСКІ**

Яны стаяць у кожным гарадку, але іх ужо не заўважаюць. Імя застаецца ў назвах, але амаль нічога ўжо ня значыць. Са зьнікненьнем даўнейшай дзяржавы пакрысе зьнікае і «заўжды жывое» цела, містычную еднасьць зь якім мусіў дэманстраваць калісьці кожны ляяльны грамадзянін.

«Акцябраты» — кучаравыя «ўнучкі Ільліча» — канулі ў мінулае, піянеры беларускія зьзелянелі і забылі, каму абавязаны радасьцю свайго нараджэньня. Што да камсамольцаў, то тыя пасьля шлюбу з БПСМ сарамліва памянялі бацьку на маладзейшага, хаця і лысага, і ведаць ня ведаюць, хто такі «Ўладзімер Ільліч».

Пра ленінскія прыклады ў Беларусі й гаварыць не выпадае.

У Расеі ж — то Ельцын на бранявік залезе, то Ягор Гайдар з бальшавіцкай прынцыповасьцю пачне нішчыць справы дзеда свайго, то чарговы ўладар пачне закручваць шрубкі ад ЧК. Падыдзе й Жырыноўскі з амаль што ленінскай кепкай.

Ленін — плоць ад плоці расейскіх цароў і расейскіх рабоў. У Беларусі з адмысловымі традыцыямі «згоды й талеранцыі» ён не прыжываецца.

Дзе хоць бы намёкі на беларускіх Ленінных?

> Імя Леніна на вуліцах застаецца, «таму што было так», а не таму што ён рэвалюцыянэр-разбуральнік.

Карціць, вядома, параўнаць першага ўсенароднаабранага, але параўнаньне, нават нягледзячы на паэтычныя высілкі Браніслава Спрынчана, не вытрымлівае крытыкі. Так, адзін з параўнаных хаця й называў інтэлігенцыю «лайном нацыі», быў бунтоўным расейскім шляхціцам. Ён быў здольны пісаць кнігі і — што самае кашмарнае — размаўляў адразу на сямі мовах.

Яшчэ горш пасуе на ролю беларускага Леніна «страшны разбуральнік» савецкай дзяржавы Станіслаў Шушкевіч. Менавіта спробы дамовіцца, паразумецца, пазьбегнуць канфлікту, знайсьці згоду акуратна хавалі СССР. Але потым не абаранілі сьпікера ад адстаўкі. І што, гэта — зьнішчальны ленінскі стыль?

Нагадвае гэты стыль рыторыка Зянона Пазьняка, які здольны глядзець на ворага, «як Ленін на буржуазію». Гэты погляд часам шакуе месьцічаў нечаканымі і глыбокімі прагнозамі, але Зянону бракуе няправільнасьці і анэкдатычнасьці Ільліча.

Усе дыктатары — а Ленін дыктатар — былі ў XX ст. няправільнымі, анэкдатычнымі людзьмі: картавасьць, кепка, дуракі сьмех, які прыцягваў нават набожныя аднапартыйцы. Гэтая анэкдатычнасьць дазваляла кантактаваць з масамі, станавіцца сваім, спакушаць.

Няма ў нас беларускіх Леніных. Ня той стыль для краіны.

Імя Леніна на вуліцах застаецца, «таму што было так», а не таму што ён рэвалюцыянэр-разбуральнік.

Гэта расейскія камуністы гатовы каго хочаш у зямлю закапаць за спробу пахаваць замаўзалеенае цела, а нашы хутчэй самі — па старой партызанскай звычцы — у зямлю закапаюцца.

І надзвычай папэнцыла ўладам, што левыя не прапануюць чытаць сваім прыхільнікам ленінскае «Падзеньне II Інтэрнацыяналу». А то вычытаюць яшчэ, што «рэвалюцыйная сытуацыя — гэта калі вярхі ня могуць, а нізы не жадаюць» і «ніводны ўрад не ўпадзе, пакуль яго ня выпусьцяць».

Але каб такое адбылося ў нас, Леніны не патрэбныя.

# «Ленін», — думае беларус

ВІТАЛЬ ТАРАС

«Дзеці, хто з вас бачыў Леніна — на фатаграфіі, на партрэце, у кіно?» — пытаецца настаўніца ў школьнікаў.

Вовачка цягне руку:

— Я бачыў, учора ў лесе!

— ???!!!.. Ну і як жа ён выглядаў?

— Ну, такі прыгожы, мажны, зь вялізнымі рагамі на галаве…

— Вовачка! Дык можа, гэта быў лось?!

Вовачка (крыху падумаўшы):

— Мабыць, так».

Гэта толькі адзін зь безьлічы анэкдотаў «пра Вовачку». І, бадай, адзіны з анэкдотаў, дзе гэты пэрсанаж савецкага фальклёру, так бы мовіць, сутыкаецца са сваім пратэжэ. Так, менавіта пратэжэ, бо гадоў сорак таму, калі гэтыя анэкдоты ўпершыню пачалі зьяўляцца, пад Вовачкам (ня «новым расейцам» Ваванам — просьба ня блытаць) быў зашыфраваны правадыр рэвалюцыі. Да сапраўднага Леніна Вовачка меў столькі ж дачыненьня, колькі герой сэрыі анэкдотаў «пра Васіля Іванавіча» мае дачыненьня да рэальнага камдыва, які стаў героем міталягічнага фільму «Чапаеў».

У гарадзкога фальклёру свае законы. Сьветлавалосы анёлак Валодзя Ўльянаў, партрэт якога красаваўся на акцябрацкай зорачцы, у анэкдотах ператварыўся ў брутальнага хулігана, які лаецца матам і можа пры выпадку «трахнуць» настаўніцу. Гэты спантанна народжаны вобраз, дарэчы, куды больш адпавядаў сапраўднаму псыхалягічнаму партрэту Леніна, хоць ягоныя славутыя «расстрэльныя» нататкі ў той час яшчэ надзейна захоўваліся ў «спэцсхове».

У 1970-м, калі адзначаўся стогадовы юбілей Леніна, прапаганда «самага чалавечнага чалавека», відаць, настолькі ўжо ўсіх дастала, што эўфэмізмы былі адкінуты і правадыр пачаў зьяўляцца ў анэкдотах пад сваім імем. Тады нарадзіліся фальклёрныя парфума «Пах Леніна», трохспальны ложак «Ленін заўсёды з намі», «ордэн Леніна імя ордэна Леніна» і г.д. А ў гістарычных анэкдотах Ільліч набыў зусім ужо рэальныя абрысы. Напрыклад, у адным зь іх Ленін ласкава гаварыў «хадакам»: «Э-э, баценька, гэта не да мяне — вам да Фэлікса Эдмундавіча трэба».

З таго часу анэкдоты пра Вовачку, якія спачатку мелі характар нейкай фронды, даўно адарваліся ад пачатковага сэнсу, і цяпер наўрад ці хоць адзін чалавек зьвязвае іх зь Леніным. Больш за тое, анэкдоты пра яго выйшлі з моды. Яны ня больш папулярныя ў сучаснай Беларусі, чым, скажам, гістарычныя анэкдоты пра Напалеона альбо Аляксандра Македонскага. Ленін як пэрсанаж адсунуўся кудысьці ўглыб нашае сьвядомасьці, у галіну дзіцячага фальклёру. Адзін журналіст расказваў, як ягоны пяцігадовы сын поўзаў па калідоры на «карачках» і пагрозьліва рычэў, палохаючы ўяўнага ворага: «Я Ле-е-енін! Г-р-р-р!» (Мабыць, хлопчык уяўляў сябе ў той момант кімсьці накшталт цмока.)

З другога боку, пэўны час здавалася, што і пераемнік Леніна Сталін адсунуўся кудысьці ўглыб гісторыі ды ўспрымаецца новым пакаленьнем кімсьці кшталту фараона Рамзэса ІІІ. Абарона Курапатаў, аднак, дзе спачываюць парэшткі тысяч ахвяр сталінскага рэжыму — дзядоў сёньняшніх маладых людзей, паказала, што сталінская эпоха ад нас яшчэ зусім блізкая. Не настолькі блізкая, каб анэкдоты пра Сталіна, як і пра Леніна, былі надта папулярныя, але настолькі блізкая, каб памяць аб ёй трэба было бараніць. (Жаданьне французаў зрабіць мэмарыял памяці напалеонаўскіх жаўнераў на Бярэзіне, напрыклад, не выклікае асаблівых пярэчаньняў беларускіх уладаў, бо гэта, на іх думку, ня тычыцца сучаснай гісторыі ды ідэалёгіі, а вось Курапаты і барацьба за іх вельмі шмат значаць для грамадзкай сьвядомасьці, і таму рэжым імкнецца ўсяляк прынізіць значэньне народнага мэмарыялу.)

Тое, што плошча Незалежнасьці ў Менску дагэтуль мае другую назву, якая ўпрыгожвае станцыю мэтро «Плошча Леніна», як і тое, што на самой плошчы стаіць помнік правадыру і што падобныя помнікі стаяць у сотнях іншых мясьцінах Беларусі, не азначае, быццам сучаснае беларускае кіраўніцтва захоўвае вернасьць ідэям правадыра пралетарскай рэвалюцыі. У гэта ня вераць, мабыць, і стваральнікі падручніка па гэтак званай «дзяржаўнай ідэалёгіі». У каго павернецца язык назваць існуючы сёньня ў Беларусі грамадзкі лад «дыктатурай пралетарыяту», а яе прэзыдэнта, скажам, — марксістам?

Увогуле, так званую ідэйна-філязофскую спадчыну Леніна можна выкарыстаць дзеля абгрунтаваньня ці апраўданьня чаго хочаш. Многія беларускія адраджэнцы новай хвалі могуць прыгадаць, як яны карысталіся цытатамі зь Леніна наконт «расейскага шавінізму» і «нацыяналізму прыгнечаных нацый» дзеля адстойваньня ідэй беларушчыны ў сваіх кнігах і дысэртацыях. З другога боку, прафэсійныя барацьбіты з рэвізіянізмам яшчэ больш ахвотна карысталіся ленінскімі працамі, дзе выкрываўся «буржуазны нацыяналізм» і апартунізм усялякага роду.

У Леніна можна знайсьці цытаты на ўсе выпадкі жыцьця. Кожны, хто чытаў яго працы хоць аднойчы, мог пераканацца, што клясык марксізму зь лёгкасьцю выдаваў чорнае за белае і наадварот — у залежнасьці ад палітычнай сытуацыі й патрэб партыі. Выдатны ангельскі гісторык Тойнбі пісаў пра галоўную супярэчнасьць, якая, на ягоны погляд, адразу кідаецца ў вочы ў Леніна. З аднаго боку, гэта яго жалезны дэтэрмінізм у гісторыі (перамога пралетарскай рэвалюцыі непазьбежная, бо яна дыктуецца законамі клясавай барацьбы), адмаўленьне ролі асобы (гісторыю ствараюць масы). А з другога боку — абсалютнае нежаданьне чакаць, пакуль законы гісторыі самі зробяць сваю справу, нецярплівая, проста-такі шалёная дзейнасьць, скіраваная на падштурхоўваньне рэвалюцыі. Тае самае рэвалюцыі, умовы для якой, паводле ранейшых сьцверджаньняў Ульянава-Леніна, у Расеі ня высьпелі ці высьпелі найменей у параўнаньні з больш прамыслова разьвітымі краінамі Эўропы!

Гістарычных дзеячаў ацэньваюць, як правіла, не паводле іхных слоў, а паводле спраў. Тое, што Ўладзімер Ульянаў з калескага рэгістратара, малаздольнага адваката, які прайграваў адну справу за другой, зрабіўся першай асобай у Расеі з паўнамоцтвамі, якія ня сьніліся й манархам, гаворыць не аб правільнасьці марксісцкага мэтаду (тым болей што Ленін абыходзіўся зь ім, мякка кажучы, вольна), але аб здольнасьцях Леніна як інтрыгана й дыктатара. Бадай, ёсьць яшчэ толькі адзін дыктатар у гісторыі XX стагодзьдзя, якога можна паставіць побач. Гэта Гітлер. Само па сабе спавяданьне ідэй фашызму (калі прызнаць яго філязофіяй) не тлумачыць узьлёту Адольфа Шыкльгрубэра і ягонай фэнамэнальнай папулярнасьці ў масах. Дастакова сказаць, што ў суседняй зь Нямеччынай Італіі фашысцкая дыктатура Мусаліні, пры ўсіх яе эксцэсах, не была настолькі крывавай, як гітлераўская.

Апытаньні, якія праводзяцца ў Інтэрнэце, паказваюць, што часьцей за ўсіх сярод вядомых асобаў мінулага стагодзьдзя ва ўсім сьвеце называюць менавіта Леніна і Гітлера. Справа, відаць, ня ў тым, што абодва яны былі майстрамі палітычнай інтрыгі. (Сталін выглядае эпігонам свайго настаўніка — проста ў яго руках апынуўся сакратарыят партыі, створанай Леніным.) Містыка палягае ў тым, што гэтым двум зусім не падобным адзін да аднаго людзям з аднолькава пасрэднымі, у прынцыпе, здольнасьцямі ўдалося паставіць эўрапейскую цывілізацыю на мяжу зьнікненьня. Вядома, што на рабочым стале Леніна ў крамлёўскім кабінэце стаяла бронзавая выява малпы з чалавечым чэрапам у руцэ. Выдатны сымбаль зьдзічэньня чалавека, вяртаньня яго да першабытнага стану. Аднак насамрэч ня Ленін і ня Гітлер адкінулі чалавецтва на тысячагодзьдзі назад. Гэта само чалавецтва добраахвотна пагадзілася стаць і фактычна сталася на некалькі дзесяцігодзьдзяў плянэтай малпаў. Так што ў аднайменным рамане П'ера Буля няма нічога фантастычнага. Мільёны людзей немагчыма было б абалваніць, калі б яны самі таго не хацелі, калі б імі не кіравалі жывёльныя інстынкты. Вось самы трагічны ўрок, які магло б вынесьці чалавецтва са сваёй гісторыі. Магло б, калі б яно было адзіным арганізмам і мела самастойны розум, а не складалася зь людзей.

Справа ў тым, што чалавецтва — не мурашнік, дзе мурашкі, пазбаўленыя свабоды волі, выконваюць кожная адведзеную ёй ролю ў адпаведнасьці з плянам Усявышняга. Законы разьвіцьця грамадзтва — калі такія насамарэч ёсьць — не вызваляюць чалавека ад непрыемнага абавязку рабіць маральны выбар. Гэта страшэнна, неймаверна цяжкі абавязак, вось чаму людзям так хочацца знайсьці таго, хто будзе вырашаць за іх, што ёсьць дабро, а што зло. І ня важна, хто гэта будзе — Ленін, Гітлер, Мао ці нехта яшчэ.

Але навукова-тэхнічны прагрэс, насуперак меркаваньню антыглябалістаў і «зялёных», меў і станоўчы вынік. Са зьяўленьнем ядзернай зброі, кампутарных тэхналёгій і Інтэрнэту прэтэнзіі якой бы там ні было дыктатуры на сусьветнае панаваньне сталіся мізэрнымі. Сучасныя дыктатары могуць трымаць некаторы час у страху ўласны народ, але ня больш за тое. У гэтым сэнсе Ленін і Сталін сапраўды значаць для дня сёньняшняга ня больш, чым эгіпецкія фараоны.

Маўзалей з мумiяй правадыра сапраўды нагадвае пахавальню фараона. Цікава, што Расейская праваслаўная царква, настолькі непрымірэнная да каталіцызму, зусім спакойна ўспрымае прысутнасьць паганскіх мошчаў побач з галоўнымі царкоўнымі храмамі ў самым цэнтры «Трэцяга Рыму». Хаця Ленін люта ненавідзеў папоў і нават даваў загады зьнішчаць іх пры нагодзе як мага больш, Расейская праваслаўная царква, відаць, даравала ўсе грахі свайму крыўдзіцелю, паколькі галоўны грэх у яе вачох — гэта непаслушэнства ўладзе. Якое насьміханьне з хрысьціянства!.. А зь іншага боку, дарэчы, — якое насьміханьне зь Леніна! Усё гэта з гледзішча эўрапейскае цывілізацыі павінна ўспрымацца як свайго роду атавізм.

Помнікі Леніну на вуліцах сёньняшняй Беларусі выглядаюць ужо не як атавізм, а як атавізьмік. Некаторыя людзі, як вядома, нараджаюцца з хвастом. З дапамогай сучаснай хірургіі хвост лёгка й бязбольна выдаляецца. Аднак можна і прызвычаіцца да таго, што ў цябе ёсьць хвост, і бессаромна насіць яго не ў штанах, а навідавоку.

Як заявіла нядаўна старшыня Цэнтравыбаркаму спадарыня Ярмошына ў адказ на крытыку ў сувязі з масавым датэрмiновым галасаваньнем ды рознымі іншымі экзатычнымі зьявамі накшталт 90-адсоткавай яўкі выбарцаў, у Беларусі ёсьць уласныя традыцыі дэмакратыі. Адна з такіх традыцый, напэўна, палягае ў тым, каб ганарыцца атавізмам.

Вяртаючыся да тэмы савецкіх анэкдотаў, якія згадваліся на пачатку, варта прыгадаць яшчэ адзін — з сэрыі «пра Штырліца». Мабыць, менавіта гэты анэкдот падказаў па нейкай асацыяцыі назву артыкулу.

Штырліц, гулючы па лесе (цікава, што ва ўсіх анэкдотах гаўптштурмбанфюрэр, ён жа выведчык Ісаеў, абсалютна нічым не заняты й бадзяецца абы-дзе), заўважыў дупло ў дрэве й зазірнуў у яго. Там у цэмры сьвяціліся чыесьці вочы.

«Філін», — падумаў Штырліц.

— «Сам ты філін», — падумаў Мюлер.

Цікава, чые гэта вочы глядзяць на нас зь цемры тэлеэкранаў?



Людзі — не мурашкі, пазбаўленыя свабоды волі. Законы разьвіцьця грамадзтва не вызваляюць чалавека ад абавязку рабіць маральны выбар, хоць людзям так хочацца знайсьці таго, хто будзе вырашаць за іх, што ёсьць дабро, а што — зло, — Леніна, Гітлера, Мао.

**На рабочым стале Леніна ў крамлёўскім кабінэце стаяла бронзавая выява малпы з чалавечым чэрапам у руцэ.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Прызнаючы гістарычны дэтэрмінізм, Ленін не жадаў чакаць, пакуль законы гісторыі самі зробяць сваю справу, і даў узоры таго, як трэба рыхтаваць рэвалюцыю.

# Звод клясычнага правапісу гатовы

Працяг са старонкі 1.

**«НН»: Клясычны правапіс вярнуўся ў беларускі друк 15 гадоў таму. Ён прыстасаваўся да сучасных моўных рэаліяў. Але нават нязначныя адрозьненьні між яго варыянтамі, практыкаванымі ў розных выданьнях, блытаюць яго карыстальнікаў. Да якога этапу прасунулася справа кадыфікацыі клясычнага правапісу?**

**Зьміцер Саўка:** Маем праект, вынік нашай дзейнасьці за пяць гадоў. Перад заканчэньнем працы мы зьвярнуліся з анкетаю, якую друкавала таксама «НН». І атрымалі водгукі, якія былі ўлічаны пры падрыхтоўцы праекту. Цяпер мы разаслалі праект на рэцэнзію ў 25 выданьняў і інстытуцыяў, у тым ліку Беларускую асацыяцыю журналістаў, Інстытут мовазнаўства Акадэміі навук, газэты «Звязда», «Наша Ніва», часопісы «Роднае слова», «Arche», «Дзеяслоў», асобным людзям накшталт а.Аляксандра Надсана, Уладзімера Арлова, Аляксея Рагулі й інш. з просьбай даслаць водгукі да 1 лютага.

Па выніках рэцэнзій працоўная група выпрацуе канчатковае рашэньне. Яно будзе рэалізавана ў выданьні, якое выйдзе вялікім накладам. Таксама яно будзе выстаўлена ў Інтэрнэце і адкрыта для карыстаньня. Спадзяемся, што цалкам надрукуюць гэты Звод незалежныя пэрыядычныя выданьні, — «Наша Ніва» і «Наша слова» абяцалі.

**«НН»: Цягам якога часу можна будзе чакаць апублікаваньня?**

**ЗС:** Калі рэцэнзэнты не затрымаюць (мы прадугледжваем, што нехта можа напісаць вельмі шырокі грунтоўны водгук, зь якім нам прыйдзецца доўга разьбірацца), да 1 сакавіка будзе прынята канчатковае рашэньне. Плюс нейкі час на выданьне. Такім чынам, можна лічыць, што кніжка будзе прымеркаваная да 25 Сакавіка.

У выданьні будзе таксама паказьнік слоў, правапіс якіх рэгулюецца Зводам, і адваротны слоўнік, які будзе паказваць правапіс фіналяў. Ён дасьць магчымасьць чалавеку, які не знаходзіць правапісу канкрэтнага слова ў кніжцы, зазірнуць у слоўнік і паглядзець, як пішуцца падобныя словы.

**«НН»: Ці будзе гэты Звод уведзены ў праграму праверкі артаграфіі «Літара»?**

**ЗС:** На ўзроўні падыходаў тое, што мы падалі год таму ў «Літару», і тое, што трапіць у канчатковы Звод, практычна не адрозьніваецца. Зьмяніліся хіба што нейкія ілюстрацыі, напісаньні канкрэтных слоў. Іншая рэч, што людзі, якія працавалі зь «Літарай», ня ўсё ўлічылі з таго, што мы падавалі. Разьбежнасьць не фатальная, але што датычыць правапісу пазычаньняў — заўважная, і прыйдзецца «Літару» падправіць. Я перадаў праект каардынатару «Літары» Сяргею Кручкову, перадаю таксама каардынатару праекту з боку фундатараў — Сяргею Шупу.

**«НН»: Ці пагадзіліся ўжо нейкія выданьні абавязкова прыняць прапанаваны працоўнай групай Звод за нарматыўны?**

**ЗС:** «Наша Ніва» й «Arche», спадзяюся. Зь іншымі выданьнямі мы гэтага не абмяркоўвалі. Але тыя зь іх, хто абгрунтоўваў свой пераход на рэфармаваны правапіс тым, што няма ўнармаванага клясычнага, цяпер пазбавяцца такой адгаворкі. Пагатоў што многія нашы правілы не спэцыфічна «тарашкевіцкія», яны маюць агульнамоўны характар. Асабліва гэта тычыцца правапісу складаных слоў, які вельмі кепска прапісаны ва ўсіх граматыках — як клясычнага, так і рэфармаванага правапісу.

**«НН»: Наколькі вялікая розьніца з рэфармаваным правапісам?**

**ЗС:** Некаторыя нашыя нормы зараз прапануе група акадэміка Падлужнага з Інстытуту мовазнаўства. Напрыклад, правапіс лічэбнікаў «дзявяты» й «дзясяты». У нейкіх выпадках мы пайшлі за прапанаванымі ўдзельнікаў анкетаваньня. Так, было прынята пісаць «ы» ў скарачэньнях накшталт «пэдынстытут», «мэдынстытут», бо спалучэньне «ді» не характэрнае для беларускай мовы, як і спалучэньне «ры». Мы мелі перад сабой і задачу фанэтызацыі, спрашчэньня правапісу. Каб беларуская мова была ня рэбусам, а інструмэнтам, дастаткова простым і зразумелым для карыстальніка.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**ДА ДНЯ ВОЛІ. Зьміцер Саўка абяцае, што ў сакавіку Звод правілаў пойдзе ў друк.**

Вядома, ёсьць пэўны прыцэл на школу, на адукацыю. Мы закладалі тры ўзроўні адаптацыі напісанага. Артаграма — асноўнае правіла, далей заўвага — нейкія выключэньні з гэтага правіла або малаўжывальныя зьявы з моўнай пэрыфэрыі, а далей — зноска, дзе яшчэ больш складанай моваю падаецца камэнтары, заўвагі, абгрунтаваньні, разьлічаныя на больш дасьведчанага карыстальніка. Самі артаграмы мы стараліся фармуляваць максымальна проста. Калі будзе зацікаўленьне з боку адукацыйных устаноў, мы гатовы адаптаваць Звод для адукацыйных патрэб.

**«НН»: Што яшчэ было ўлічана з адказаў на анкету, зьмешчаную ў «НН» і на сайце pravapis.org?**

**ЗС:** Напрыклад, мы ставілі пытаньне, ці ўключаць у альфабэт «дж» і «дз». Традыцыйна яны ўключаюцца, хаця гэта дыграфы (дзьвюхлітарныя абазначэньні). У нас як у лінгвістаў былі сур'ёзныя пярэчаньні. Але народ выказаўся за ўключэньне, бо гэта нейкім чынам вонкава характарызуе беларускую мову, надае тэксту, напісанаму па-беларуску, адметнае аблічча. І мы прыслухаліся да народу.

**«НН»: Правапіс разьлічаны толькі пад кірыліцу?**

**ЗС:** Так, але ўжо наступны крок — лацініца. Там, вядома, будзе розьніца вялікая ў перадачы пазычаньняў, асабліва ўласных іменаў. Далейшы крок — граматыка: ужо ёсьць цэлыя разьдзелы граматыкі. Кожны з нас працаваў над граматыкай паралельна з правапісам. Самая занядбаная галіна — сынтаксіс. Пасьля таго як апублікуем Звод, будзе й такі мікракрок: я прапаную выданьням параўнальную табліцу клясычнага і рэфармаванага правапісу. Чалавеку ня трэба будзе чытаць цэлую брашуру, каб убачыць гэтую розьніцу.

Яшчэ наступны крок — стварэньне на падставе гэтага Зводу артаграфічнага слоўніка, супастаўнага па аб'ёме з артаграфічным слоўнікам пад рэдакцыяй Бірылы. У ім будзе значна большая рэпрэзэнтацыя ўласнабеларускай лексыкі, якая ў слоўніку пад рэдакцыяй Бірылы была істотна абсечана з розных меркаваньняў.

Наш правапіс закранае ня ўсе пытаньні, а носіць кантрастыўны характар — у параўнаньні з рэфармаваным правапісам і расейскай моваю. Мы не закранаем, напрыклад, правапісу вялікай літары й інш. — таго, што не разыходзіцца з рэфармаваным правапісам.

**«НН»: Кантрастыўны характар у дачыненьні да расейскай мовы — неабходнасьць часу?**

**ЗС:** Тарашкевіч складаў свой правапіс кантрастыўна да расейскай і польскай моў, але ў савецкія часы правапісныя артаграмы сталі фармулявацца кантрастыўна да расейскай мовы. Некаторыя нават напісаны так, што апрыёрна вымагаюць веданьня расейскай. Мы захавалі шмат якія традыцыйныя фармулёўкі, традыцыйныя тэрміны. Стараліся не ісьці на нейкія вялікія рэвалюцыі. Мы ставілі перад сабой прынцып «старыны ня рушыць, навіны ня ўводзіць». Там няма ніводнай артаграмы (што датычыць уласнабеларускай лексыкі), якая б не была раскрыта да нас.

**Адам Воршыч**

## ХРОНІКА

Магілёўскі актывіст незарэгістраванай арганізацыі «Зубр» **Максім Дварэцкі** за графіці «Свабоду Марынічу!» 12 студзеня быў асуджаны на трое сутак арышту паводле арт.156 КаАП (дробнае хуліганства). Сьведкі-міліцыянты сьцьвярджалі, што Дварэцкі «мацюкаўся і буяніў». Судзьдзя Тыбленка адмовілася выслухаць сьведкаў з боку Дварэцкага і не задаволіла хадайніцтва ў забесьпячэньні адваката.

12 студзеня былі выкліканыя на пасяджэньне адміністрацыйнай камісіі сябры суполкі КХП-БНФ зь Віцебску **Кастусь Горны** і **Уладзіслаў Токараў**: 28 сьнежня іх затрымалі падчас распаўсюду каляндарыкаў радыё «Свабода». Разгляд справы Горнага перанесьлі на 26 студзеня, бо старшыня камісіі вырашыў, што справа мае «крымінальнае адценьне», і зажадаў прысутнасьці міліцыянтаў. На Токарава ж няправільна аформілі пратакол затрыманьня.

Суд Цэнтральнага раёну Гомелю 18 студзеня разгледзіў адміністрацыйную справу па абвінавачаньні ўласнага карэспандэнта «Народнай волі» **Ірыны Макавецкай** у непавазе да суду і вынес вуснае папярэджаньне.

Супрацоўніца аддзелу адукацыі Гарадзенскага аблвыканкаму Тамара Прадзед 13 студзеня забараніла раздаваць вучням газэты ТБМ **«Наша слова»** і **«Новы час»**, назваўшы іх занадта палітызаванымі.

13 студзеня **Задзіночаньне беларускіх студэнтаў** атрымала рашэньне Вярхоўнага Суду: ён не задаволіў нагляднай скаргі пра адмену рашэньня аб ліквідацыі арганізацыі.

Менскія гарадзкія ўлады забаранілі **РГА «НІСЭПД»** арандаваць памяшканьне ў Міжнародным адукацыйным цэнтры ІВВ для брыфінгу навукоўцаў, іншыя ўладальнікі заляў адмовілі. Памяшканьне дало пасольства Вялікай Брытаніі.

«Міжнародная амністыя» 14 студзеня прызнала **Міхаіла Марыніча** вязьнем сумленьня.

Назіральнікі за прэзыдэнцкімі выбарамі ва Ўкраіне ад незарэгістраванага праваабарончага цэнтру **«Вясна»**, затрыманыя 22 сьнежня ў гатэлі «Беларусь», 14 студзеня падалі скаргу ў пракуратуру Цэнтральнага раёну на незаконныя дзеяньні міліцыі.

17 студзеня з Пажарнага аварыйна-выратавальнага атраду ў Наваполацку «на ўласнае жаданьне» былі звольнены браты **Аляксей** і **Сяргей Жураўлёвы**: падчас выбарчай кампаніі ў парлямэнт яны былі даверанымі асобамі кандыдаткі ад БНФ Леры Сом.

Управа юстыцыі Гомельскага аблвыканкаму 17 студзеня вынесла пісьмовае папярэджаньне **ГА «Беларускі Хельсынскі камітэт»** за парушэньне статуту арганізацыі ў Гомельскай філіі ды за накіраваньне на парлямэнцкія выбары 2004 г. назіральнікамі асоб, якія нібыта не былі на той час сябрамі арганізацыі, чым быў парушаны арт.13 Выбарчага кодэксу.

Міністэрства юстыцыі таксама вынесла папярэджаньне Беларускаму Хельсынскаму камітэту па выніках праверак дзейнасьці Гомельскага і Берасьцейскага аддзяленьняў. Міннюст палічыў парушэньнем тое, што на выбарчыя ўчасткі падчас леташніх выбараў накіроўваліся ў якасьці назіральнікаў асобы, якія нібыта не зьяўляліся на той момант сябрамі аб'яднаньня.

З 1 лютага будзе спынена дзейнасьць **Гомельскай арганізацыі прыватных прадпрымальнікаў Свабоднага прафсаюзу беларускага**: суполка ня мае юрыдычнага адрасу.

**АШ**

## Закон аб мовах патрабуе зьменаў

**Зварот сакратарыяту ГА «Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны» да дэпутатаў і кіраўніцтва палаты прадстаўнікоў нацыянальнага сходу:**

26 студзеня 2005 г. спаўняецца 15 гадоў з дня прыняцьця Вярхоўным Саветам БССР XI скліканьня «Закону аб мовах у БССР», які ўнёс вялікі ўклад у нацыянальнае адраджэньне Беларусі. Свой працяг ён атрымаў у першай Канстытуцыі незалежнай Беларусі, дзе беларуская мова набыла статус дзяржаўнай.

У 1998 годзе ў вышэйзгаданы закон былі ўнесены істотныя зьмены, у выніку якіх гэты закон перастаў адпавядаць дзеючай Канстытуцыі, што і засьведчыў Канстытуцыйны Суд Беларусі сваім Рашэньнем ад 4 сьнежня 2003 году.

ГА «ТБМ імя Ф.Скарыны» зьвяртаецца да дэпутатаў і кіраўніцтва палаты прадстаўнікоў нацыянальнага сходу Беларусі з прапановай у юбілейным 2005 годзе на веснавой сэсіі ўнесьці ў закон папраўкі, якія дазволяць юрыдычна замацаваць дзяржаўны статус беларускай мовы і прывесьці «Закон аб мовах у Рэспубліцы Беларусі» ў адпаведнасьць зь дзеючай Канстытуцыяй.

*Прыняты 12 студзеня 2005 г.*

Запрашаем прыняць удзел у прэс-канфэрэнцыі, прысьвечанай 15-м угодкам Закону аб мовах, якая адбудзецца 26 студзеня на адрасе вул.Румянцава, 13. Пачатак у 16 гадзін.

## Заява Сойму БНФ «Адраджэньне»

Беларуская нацыя і ў вірлівым XXI стагодзьдзі мае свой надзейны арыенцір і грунт пад нагамі. Гэта воля да незалежнасьці й эўрапейскага выбару, выказаная айцамі-заснавальнікамі Беларускае Народнае Рэспублікі ў далёкім 1918 годзе.

Абавязак перад памяцьцю папярэднікаў вымагае ўрачыстага адзначэньня 87-е гадавіны абвяшчэньня ў Менску незалежнасьці Беларусі. Мы вітаем і падзяляем ідэю мастакоў суполкі «Пагоня» ўганараваць галоўнае нацыянальнае сьвята ўзьвіжаньнем Звона Свабоды ў Менску. Партыя БНФ прапануе патрыятычным сілам краіны далучыцца да гэтай ініцыятывы й разам ушанаваць Дзень Незалежнасьці.

Выказваем шкадаваньне, што пэўныя грамадзяне спрабуюць прымеркаваць да сьвятое даты 25 Сакавіка заведама авантурныя палітычныя пляны, якія ўлада можа скарыстаць для дыскрэдытацыі як Дня Незалежнасьці, так і беларускага дэмакратычнага руху.

Заклікаем грамадзян Беларусі адзначыць 25 Сакавіка ў сталіцы й рэгіёнах годна, творча, сьвяточна. Хай Дзень Незалежнасьці кансалідуе беларускае грамадзтва вакол пазытыўных ідэй эўрапейскае дзяржаўнасьці, свабоды, асабістае годнасьці, пашаны да гістарычнае памяці й мовы, вернасьці запаветам продкаў.

Жыве Беларусь!

*15 студзеня 2005 г.*

*Менск*

# На лёдзе

**ГЕРМАН ГЕСЭ**

У тыя часы ўсё бачылася мне іншым. Мне было дванаццаць з паловай гадоў, і я быў пад уладай стракатага і разнастайнага сьвету хлапечых радасьцяў і мараў. І вось тады ў першы раз маёй зьдзіўленай душы адкрыліся затуманеныя далягляды запаветнага і недасяжнага пакуль юнацтва.

Стаяла такая доўгая і халодная зіма, што нават у нашым Шварцвальдзе рэкі на доўгія тыдні ўкрыліся лёдам. Я не магу забыць таго дзіўнага пачуцьця страху і захапленьня, зь якім я ступіў на раку першай марознай раніцай. Рака была вельмі глыбокая, а лёд — такі празрысты, што пад нагамі былі відаць зеленаватая вада, заплеценыя ў фантастычны малюнак водарасьці, а часам трапляліся і цёмныя цені рыбаў.

Большую частку дня я бавіў на лёдзе са сваімі сябрамі. Нашы шчокі заўсёды палалі, а рукі сінелі ад холаду; нашы сэрцы поўніліся цудоўнай і бяздумнай прагай асалодаў і ўцех дзяцінства ды сілкаваліся энэргіяй моцнага і рытмічнага руху канькоў. Мы бегалі навыперадкі, скакалі, гулялі ў даганялкі, і тыя з нас, хто яшчэ насіў старамодныя касьцяныя канькі, якія прывязваліся да ботаў шпагатам, былі далёка ня самымі горшымі канькабежцамі. Але ў аднаго, фабрыкантавага сына, была пара «Галіфаксаў», якія мацаваліся не вяроўкай, а рамянямі, і іх можна было абуць і зьняць за дзьве сэкунды. З той пары і на доўгія гады слова «Галіфакс» стаяла першым у маім сьпісе жаданых падарункаў на Каляды, але мне так і не пашэнціла іх атрымаць. А калі праз дванаццаць год я аднойчы захацеў купіць пару сапраўды якасных і добрых канькоў, у краме маё жаданьне набыць менавіта «Галіфаксы» сустрэлі з усьмешкай і сказалі, што гэта ўстарэлая мадэль і ўжо даўно адна зь ня самых лепшых. У той момант я з болем страціў яшчэ адзін кавалачак веры ў свае дзіцячыя ідэалы.

Больш за ўсё мне падабалася катацца аднаму, часта я не здымаў канькоў, аж пакуль не станавілася зусім цёмна. Я лётаў па лёдзе туды-сюды, мог раптам спыніцца дзе заўгодна або павярнуць на поўнай хуткасьці, а мае віражы зрабілі б гонар любому асу авіяцыі. Многія з маіх сяброў выкарыстоўвалі час на коўзанцы, каб заляцацца да дзяўчат. У мяне дзяўчынкі не было, і пакуль астатнія імкнуліся выглядаць рыцарамі ў вачах дзяўчат, баязьліва і з надзеяй завіхаліся ля іх або сьмела каталіся парамі, я атрымліваў асалоду ад канькоў, лёду і пачуцьця свабоды ў адзіноце. Для «кавалераў» у мяне было толькі спачуваньне і зьдзек. А па словах некаторых са сваіх сяброў я меркаваў аб тым, якія ж, па сутнасьці, сумнеўныя былі іх посьпехі.

І вось ужо пры канцы зімы я пачуў школьную навіну, што нядаўна наш «паўночны жыхар» пацалаваў на катку Эму Маер. У мяне кроў прыліла да галавы ад пачутага. Пацалаваў! Гэта і сапраўды было нешта зусім іншае, чым пустыя размовы і нясьмелыя дотыкі, якія дагэтуль лічыліся найвышэйшай узнагародай «кавалерам». Пацалаваў! Гэта быў водгук іншага недасяжнага сьвету, падобнага да паху забароненых пладоў, і пра яго пакуль толькі нясьмела марылі; нешта таямнічае, паэтычнае і няпэўнае, яно належала цемнавата-саладкаватаму і прывабнаму сьвету, і ніхто з нас не заводзіў размовы аб гэтым, але ўсе здагадваліся аб яго існаваньні — ён быў урыўкамі асьветлены казачнымі гісторыямі каханьня герояў мінулых часоў, пра якіх нам задавалі чытаць у школе. «Паўночны жыхар» быў чатырнаццацігадовы школьнік з Гамбургу, невядома якім ветрам занесены ў нашы мясьціны; ён быў для мяне ідэалам, а яго слава далёка за сьценамі школы не давала мне спакойна спаць. А Эма Маер была, безумоўна, самай прыгожай школьніцай Гербэрзаў — сьветлавалосая, рухомая, ганарлівая і мая аднагодка.

З таго дня я песьціў новыя пляны. Пацалаваць дзяўчыну — гэта пераўзыходзіла ўсе мае былыя мары: і само па сабе, і таму, што гэта, пэўна ж, было строга забаронена школьнымі правіламі. І я хутка зразумеў, што пачэснае рыцарства на коўзанцы — мая адзіная рэальная магчымасьць. Спачатку, наколькі гэта было магчыма, я спрабаваў зрабіць больш прывабным свой выгляд. Я пачаў старанна сачыць за сваёй прычоскай, чысьцінёй адзеньня, насоўваў шапку на лоб. Акрамя гэтага, на катку я пачаў вітацца зь дзяўчынкамі, і мне здавалася, што яны заўважалі нязвыклую зьмену ў маіх паводзінах са зьдзіўленьнем, але не без сымпатыі.

Намнога складаней аказалася вымавіць першыя словы, бо дагэтуль мне яшчэ не прыходзілася «ангажаваць» дзяўчынак. Я спрабаваў падслухаць, як гэта робяць мае сябры. Некаторыя адвешвалі паклон і працягвалі руку, іншыя нешта няўцямна мармыталі, але большасьць карысталася галянтнай фразай: «Ці маю я гонар?..» Такая фармулёўка мне вельмі імпанавала, і я развучваў яе дома, зьвяртаючыся з урачыстымі словамі да печы ў сваім пакоі.

Надышоў дзень нялёгкага першага кроку. Я зьбіраўся запрасіць дзяўчынку яшчэ ўчора, але маладушна вярнуўся дадому, ні разу нават не паспрабаваўшы. Сёньня я цьвёрда вырашыў абавязкова зрабіць тое, чаго так баяўся і так жадаў. Я ішоў на каток, а сэрца маё калацілася, як у злачынца. Мне падалося, што і рукі мае дрыжэлі, калі я абуваў канькі. Потым я рвануўся ў натоўп на коўзанцы і пачаў выпісваць шырокія кругі, спрабуючы захаваць на твары рэшткі звыклай упэўненасьці і спакою. Два разы я хутка праехаўся па доўгім катку, халодны вецер і рух былі мне на карысьць.

І раптам пад мостам на поўнай хуткасьці я на некага наляцеў, і мяне адкінула ўбок. А на лёдзе сядзела прыгажуня Эма, відавочна, ледзь стрымліваючы крык болю, і з дакорам глядзела на мяне. Сьвет закружыўся перад маімі вачыма.

«Дапамажыце мне падняцца», — гукнула яна сяброўкам. Але я, пачырванеўшы, як бурак, зьняў шапку, стаў перад ёй на калені і дапамог ёй падняцца.

Мы стаялі адно насупраць аднаго напужаныя і ня ў сілах вымавіць што-небудзь. Футра, твар і валасы прыгожай дзяўчынкі паралізавалі мяне сваёй блізкасьцю. Я беспасьпяхова прыдумваў прабачэньні, усё яшчэ трымаючы ў руках шапку. Раптам, пакуль мае вочы былі быццам затуманеныя, я мэханічна нізка пакланіўся і зьбянтэжана вымавіў: «Ці маю я гонар?..»

Яна нічога не адказала і ўзяла маю руку сваімі тонкімі пальчыкамі, цяпло якіх я адчуваў нават праз пальчаткі, і мы паехалі. Мне здавалася, што я трапіў у мару. Ад пачуцьця шчасьця, сарамлівасьці, цеплыні, жаданьня і хваляваньня я ледзьве мог дыхаць. Мы каталіся разам амаль 15 хвілін. Потым яна вызваліла свае маленькія ручкі, падзякавала мне і зьнікла яшчэ да таго, як я са спазьненьнем сьцягнуў шапку з галавы і потым доўга стаяў на адным месцы. І толькі пазьней я ўспомніў, што за ўвесь час яна не сказала ні слова.

Лёд растаў, і я ня змог паўтарыць сваю спробу. Гэта было маё першае каханьне. І прайшлі гады, перш чым мая мара зьдзейсьнілася і я пацалаваў дзяўчыну.

**Пераклала Лізавета Космач**





ГЕРМАН ГЕСЭ (1877—1962) — нямецка-швайцарскі пісьменьнік, Нобэлеўскі ляўрэат (1946). Найслаўнейшы яго раман «Гульня шкляных пэрлаў» на беларускую пераклаў Васіль Сёмуха.



**МАРЫЯ БАРАДЗІНА**

## Маленькі сокал

Маё сэрца ў далёкім полі
Пакацілася сонца ў цемрадзь
Мела сьмерць мне праклён зладзіць
А зладзіў маленькі сокал

Мае коні стрыгуць вушамі
Як блюзьнерыла ў скронях горыч
Мая помста чакала часу
Мела сьмерць мне праклён зладзіць

Не ў пару наляцела сьцюжа
І ваўкі чалавечай мовай
На вячэру прасілі шчыра
Ў адну ноч перасох калодзеж

Урасталі ў зямлю дзядзінцы
У касьцях нылі косьці продкаў
І укленчыў нам Бог у душах —
Змоўкла вера ў глухіх балотах

Рудазолатам гасьлі пёркі
Ў сьветлым храме заходу сонца
Усьміхнуліся плачкі; мроіў
Вольны дух аб далёкіх войнах

Хто адное крыві са мною
Галасіў над маёй жалобай
Мела сьмерць мне праклён зладзіць
А зладзіў маленькі сокал

## Чорны хлеб

*На сьмерць Васіля Быкава*

І заплачуць нядродныя людзі, і скажуць:
— Збажына не ўрадзіла, як нехта закляў...
Закацілася Хлебная зорка, і Стражнік
Рэшткі літасьці Божай за пояс схаваў...

І захутаюць дзетак ў дзіравыя коўдры,
Ды ня змогуць іх вырваць з абдоймаў начніц.
І наносяць да раніцы поўныя вёдры
Горкай, бруднай вадзіцы з тутэйшых крыніц.

— Мы ня з тых, хто прасіў сабе ў дар перад сьмерцю
Лусту чорнай, няхай і чужынскай, зямлі,
Не глыталі мы дым ад касьцей чалавечых
І ня бачылі, як арыштанцкія роты ішлі.

Мы заклалі свой дух пад сьмярдзючае срэбра,
З асалодай паўзьлі пад знаёмы бізун,
Пад крукі падстаўлялі схуднелыя рэбры —
Мы прывыклі, як дрэва звыкае да струн.

А калі чорным хлебам засьвеціцца сонца,
То каму нам маліцца, каго нам прасіць
Аб зярнятах на добрых, старэнькіх жаронцах —
Каб дазволілі плакаць, дазволілі жыць?

Май ў апецы сваёй марнатраўнага сына —
Свой народ, што адрынуў бязьлітасны дар.
...Ты ідзеш па нябачнай, па боскай сьцяжыне,
Пад пшанічную лею падставіўшы твар.

## Эпілёг

Безыменная маці
Сьпявае ля цёплай калыскі:
— Над жабрачым блакітам вачэй
Сьмерць лячела ў зязюліны гнёзды...

запісы

# Праца — як наркотык

**ФРАНЦ СІЎКО**

* * *

Каменьчыкі на быстраку — зіхатлівыя, розных адценьняў, ажно пырскаюць фарбамі. А выцягнеш з вады — і тут жа страцяць вабнасьць: куды дзенуцца і стракатасьць тая, і бляск. Як з чалавекам іншым: пагутарыш хвілінудругую — і дастаткова, каб расчаравацца.

* * *

У дзеда з бабаю завядзёнка была: па абедзе — сон паўтары-дзьве гадзіны. І якая б пільная ні чакала праца, а і яна тае заўсёднае сыесты парушыць не магла. З часоў аднаасобніцтва, калі селянін адно сабе належаў, адмысловая звычка.

* * *

Праца, як і шмат іншае, накшталт наркотыку можа стаць для чалавека.

У маленечкай вёсачцы на Браслаўшчыне на галасы нашы кабета з хаты выходзіць. Сунецца памалу: ногі пакрывелі, ня хочуць слухаць гаспадыні.

— Як жывяце, бабуля? Ня сумна адной? — пытаемся.

— Ай, скажаце! Карову трымаю, авечак, сьвіней — не дадуць засумавацъ.

Застыдалася раптам, калена з прыкарэлым гноем даланёю прыкрыла.

Восемдзесят тры старой.

* * *

Цыганка сярэдніх гадоў унаначкі напрасілася. Прыгожая, апранутая густоўна. Як ні ўгаворвалі легчы на канапе — не згадзілася, уладкавалася на падлозе. І акурат мацерыны туфлі новыя, напярэдадні купленыя, у галавах у неспадзяванай начной госьці апынуліся. Маці ўстала ціхенька, прыбрала іх быццам незнарок.

— У мяне гэткага дабра, можа, дваццаць пар, — маладзіца засьмяялася. І дадала: — Бачыце, а на канапе яшчэ спаць прапаноўвалі.

— От трэба ж — так я надобра збіла, — маці сябе назаўтра дакарала.— Ай, надобра!

* * *

Да чалавека знаёмага ў людным месцы памкнуўся, каб загаварыць, глянуў зблізку — ня ён зусім. Голаў павярнуў — дзіва: ён, знаёмы, шыбуе па ходніку на процілеглым баку вуліцы. І назаўтра, упобачкі з тым самым месцам, другое такое, толькі зь іншым чалавекам, здарэньне.

* * *

Сталага веку кабета на плякат «Харе Кришна — пища жизни», што на фасадзе будынку месьціцца, паказвае нездаволена:

— Чёрт-те что, по-украински уже пишут!

Другая на пытаньне, што за група скульптурная на плошчы Перамогі ў цэнтры Віцебску, «Тут Победа была» — адказвае.

«Сталіца» вобласьці. XXI стагодзьдзе.

* * *

Ні сюды ні туды ў сталым узросьце без пачуцьця самадастатковасьці. Стрыжань жа яе — у адукацыі. Маладымі часта ігнаруем яе, не разумеючы, што ў пяцьдзясят гэтаксама хочацца жыць, як і ў дваццаць.

* * *

Хамства, як і куртатасьць розуму, бывае трох кшталтаў: зацукранае, рафінаванае, патэнтаванае.

* * *

Бацька жартаваў: «Як памру — ад магілак яшчэ танчыць зачынайце». А сьмерці надта ж баяўся. Да такой ступені, што, калі памёр стары Данат, у якога кватаравалі, парасчыняў спачатку ўсе дзьверы, а потым, забыўшыся на мяне, немаўля, у зыбцы, выбег з хаты.

Калі бацька сканаў, памыўшы яго і пераапрануўшы, зь сястрою і шваграм па справах хаўтурных у розныя месцы выправіліся. У хаце пляменьніца 15-гадовая засталася. «Не баялася?» — пытаемся, вярнуўшыся. «Во яшчэ, — паціснула плячыма. — Ён жа не ў маім пакоі ляжыць».

* * *

У Адамчыка ў дзёньніках пра слова «зачым» — як кальку з расейскай мовы. А ў нашай мясцовасьці яго ў значэньні «чаму» якраз самыя старыя людзі, што ня зьведалі русіфікацыі, ужываюць. А вось слоў «трэба» ці «бачыць», хоць струною напніся, і блізка не сустрэнеш.

* * *

Разьвітваючыся зь цяперашнім, хоць мізэрную, але сьпелім надзею на вяртаньне да яго ў будучыні. А яно і ня думае вяртацца. І, вымкнуўшыся на новыя прасьцягі, адно і маем шчасьця, што прыгадваць яго ды шкадаваць, што гэтак пасьпешліва і неабачліва пазбыліся.

* * *

Адпаведнасьць слова сэнсу прадмета ці яго прыкмеце ў нашай мове часам агаломшвае нават. У маім куточку між Лявонпалем і Друяй адзін з гатункаў лілёвага бэзу пры пакоях спакон веку юльёвым завецца. Палез у слоўнікі паглядзець, што за колер такі, — нічога не знайшоў. Ды, можа, і да лепшага: хай застанецца так у памяці ды будучым дыялектолягам на ўцеху — *юльёвы.*

* * *

Расейская паэтка падчас літспатканьня ў абласной бібліятэцы:

— Как ваш язык точен! Это ж придумать такое: галіцца! Разве сравнишь с нашим: бриться! Или вот ещё: шлюб! Слюб — слюбиться. А то — брак!

Другая затое падчас гэткае ж імпрэзы:

— Ну, не знаю, как там да что, а диалект ваш — российский.

* * *

Зь пярэдадня рэфэрэндуму 1995-га году выпадак.

Студэнтка, дзяўчо зусім, у паўзе між заняткамі падыходзіць.

— Мы с родителями из России к вам переехали. Что вы будете делать с такими, как мы, если только белорусский останется государственным?

— Вучыць вас будзем.

Рэфэрэндум мінуўся, экзамэн здалі. Зноў дзяўчо тое самае.

— А мы с родителями за ваш язык проголосовали.

— Чаму?

— А чтобы вас поддержать.

* * *

У вёсцы маёй на вясельле не запрашалі, а «прасілі». «Прасатыя» — бацькі з сватам, а лепш за ўсё, калі і самі маладыя, — доўга сядзелі з гаспадарамі ў найлепшым пакоі, абмяркоўвалі, што і як будзе падчас урачыстасьці. Крый Божа было сунуцца да каго з запрашэньнем, хай сабе і за месяц да вясельля, у пятніцу. Большае зьнявагі і прыдумаць было для чалавека нельга. Бо дзень посны: ні выпіць табе, ні зьесьці, ні пагаманіць толкам — от свята!



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

* * *

Раз-пораз гвалт наконт прозьвішчаў на «о». Вось і прыдумаў сабе вэрсію на суцяшэньне: можа, гэта форма клічная. Як «косю», «коню», «хвалько» ці «манько», урэшце. Імя нямецкае, прозьвішча ўкраінскае — так і дзявяцца ўжо да скону жывым увасабленьнем манкуртства заставацца.

* * *

Маці на рак хварэла. Пасьля няўдалае (пра тое не сказалі ёй нічога) апэрацыі ў Бараўлянах 55-годзьдзе выравшылі адзначыць. Памятаю, стаяла ў кухні, гатавала штосьці да стала. Лыжку мне падала: «Памый!» Двума пальцамі тую лыжку ўзяў, бы ад крываўкі ратуючыся, шпурнуў у мядніцу з вадою.

Праз колькі часу — у бацькі тая самая хвароба. Але ўжо страху не было такога перад ёй. Зьмізарнеў, папярэднім досьведам прытуплены.

Пра сваё і наагул ледзь пасьпеў падумаць: прамільгнула — і сплыло. Можа, таму, што пагрозы непасрэднае жыцьцю не ўяўляла?

* * *

Са шпіталю выпісваючыся, квіток непрацаздольнасьці атрымаў. А ў ім дыягназ — нэўрастэнія! Авохці, што на працы падумаюць? Пацягнуўся да дакторкі па параду. А яна з парогу:

— На «нэўроз» прыйшлі выпраўляць?

— Як вы здагадаліся?

— Вельмі проста... Тут такіх, як вы, выпраўлялышчыкаў, — кожны першы.

* * *

Спрыхаду поля, на першым ад сьцежкі слупе, — бусел ці то бусьліха за дазорцу. Праз тры слупы — тры галавы дзяцінныя над гняздом тырчаць. Ледзьве наблізіўся да першага — крэкнуў дазорца, і ўвобміг, выконваючы каманду, зьніклі галовы, пахаваліся. Мэтраў з трыста пракрочыўшы, азірнуўся: няма. А што ж, як загаду не было.

* * *

Па землятрусе на поўначы Афрыкі селянін з аддаленага ад сталіцы рэгіёну з тэлеэкрану на няўвагу ўладаў да гора людзкога наракае: не прыехалі, не пагледзелі, не памаглі адзін нічым.

Сваё, тутэйшае, згадалася. Сяляне памерлай амаль ужо вёсачкі — тры хаты — увесну пшаніцу ды ячмень, з восені непрыбраныя (камбайна калгас ня выдзеліў), на пні паляць. А гэта — палова з шасьцідзесяці сотак, паўгаспадаркі сялянскай — і ўсё на зглум, і быццам трэба так.

— Прыедуць, пагледзяць, памогуць, — вяскоўцы праз сьлёзы жартуюць. — Як выбары пачнуцца.

* * *

Сьветла, баўгарка, узрушаная прымчалася з гораду: «У сутарэньні касьцёлу Сан-Клемэнтэ, што побач з Калізэем — магілка Кірылы ды Мятода, едзьце пагледзіце!» Паехаў. Па-баўгарску надпісы братам-азбукарам на магіле, пасэрбску, па-ўкраінску, па-расейску... Усе адзначыліся, апроч вядома каго — беларусаў.

* * *

Ад XVII стагодзьдзя — усё «отток» у нас нацыянальнае эліты. То ва ўлоньне польскай культуры ды мовы, то расейскай. Сёньня зноў ён, «отток». У выданьнях адно назвы беларускія, у калідорах рэдакцыйных, у тэатрах — спрэс расейшчына. Абставіны зьменяцца — прыток будзе. Цыдулкамі, як уціскалі нас за часам «оттока», наводнім тыя ж выданьні, пакутнікамі за беларушчыну паробімся. Тыя, што ў «оттоку» цяпер, — наперадзе ўсіх пад сьцягам мовы як фундамэнтальнай каштоўнасьці апынуцца.

* * *

Плоць нядужае з гадамі, дух — мізарнее. І асуджай тут Белікава за «футлярнае» жыцьцё. Глянеш іншы раз на сьвет — і так захочацца хоць у які «футарал» схавацца.

* * *

Мова наша бязь мяккага знаку ды падоўжаных зычных — бы сардэчнік, на экстрасыстале хворы (удар — пропуск, удар — пропуск): насеньне, насенне, насене... на сене.

**ФРАНЦ СІЎКО нарадзіўся ў 1953 г. у вёсцы Вята на Мёршчыне. Піша прозу, публіцыстыку. Аўтар кніг «З чым прыйдзеш» (1991), «Апошняе падарожжа ў краіну ліваў» (1997), «Удог» (2001), «Ягня ахвярнае» (1993), кніжкі для дзяцей малодшага школьнага ўзросту «Бялячык» (2003). Жыве і працуе ў Віцебску.**

Пра заганы характару творчых людзей модна стала казаць.
І так, быццам тыя заганы наяўнасьць таленту абавязкова гарантуюць.

СУЧАСНЫЯ САГІ

# Лятучы шыбенік

## СЯРГЕЙ БАЛАХОНАЎ


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Па вайне на савецка-польскай мяжы надаралася ўсякае. Распавядаюць, што аднаго разу два савецкія памежнікі падчас вартаваньня згледзелі павешанага на дрэве мужчыну. Было пад абед, і хлапцы забаяліся, што фармальнасьці, зьвязаныя з трупам, перашкодзяць ім своечасова пад’есьці. Без разваг абодва пастанавілі нябожчыка зьняць, перанесьці на польскі бок і павесіць там на найбліжэйшым дрэве. Неўзабаве свой абход рабілі два польскіх памежнікі. Крочачы ўзбоч таго дрэва, яны заўважылі мерцьвяка, і адзін зь вялікім подзівам крыкнуў: «Ну ты бач! Ён зноў вісіць тутака».

Калі ўспомніць некаторыя чарадзейныя казкі з пасечанымі на кавалкі і зваранымі ў катлах ворагамі галоўнага героя, то гэтая сага зь ейным стаўленьнем да сьмерці ўявіцца проста дзіцячым лепятаньнем на палянцы.

### Жлабяра for ever

Адзін менскі студэнт паехаў у Кітай, каб лепш спасьцігнуць тамтэйшую культуру. Насамрэч усё абмежавалася толькі жаданьнем зрабіць сабе на плячы татуяванку ў выглядзе дракона. Калі майстар зрабіў замоўленае, студэнт зразумеў, што татуяванкі яму недастаткова. Тады ён умалёгаў майстра вытатуяваць яшчэ якую-небудзь кітайскую мудрасьць. Па вяртаньні дадому хлапец стаў хваліцца сваім набыткам перад сябрамі. Тыя выказвалі захапленьне. І толькі адзін, абазнаны ў кітайшчыне, расьсьмяяўся і ўголас пераклаў мудрасьць: «Гэта жлабяра, які ніколі не дае чаявых».

У пляне калізіі сага досыць экзатычная. А тое, што беларускае паспольства слаба знаецца ня столькі ў кітайскай, колькі ў эўрапейскіх мовах, гэта факт. Пра наша жлобства лішні раз казаць не выпадае.

### Манэкен на дарозе

Нейкая шофэрка проці ночы ехала са Жлобіна ў Гомель. На дарозе ля Буда-Кашалёва, проста на асфальце, яна ўбачыла чалавечую фігуру. Цётка тармазнула, скочыла з кабіны і з трымценьнем рушыла туды. На дарозе ляжаў не чалавек, а манэкен. Жанчына адчула няладнае, спалохалася, сіганула назад у кабіну і памчала на пост ДАІ. Даішнік, да якога жанчына зьвярнулася, зірнуў на яе і сказаў: «Вашы плечы перапэцканыя ў кроў». Сталі высьвятляць, і ў кабіне ейнага МАЗа знайшлі ня толькі крывавыя плямы, але й пару фалянгаў пальцаў, якія ўзрушаная цётка адсабачыла камусьці дзьвярыма, прыхапкам іх зачыняючы — невядомы зламысьнік проста не пасьпеў залезьці ў кабіну.

Гісторыя ня гэтулькі жанчынаненавісьніцкая, колькі ксэнафобская ў першасным значэньні панятку «ксэнафобія» (боязь чужынцаў). Тое, што чужынцы (ілгары, ліхадзеі, злыя сілы) выкарыстоўваюць самыя нестандартныя мэтады, каб завабіць у сваё сіло ахвяру, можна ўгледзець і ў традыцыйным фальклёры: ад лісы, што палюе на варон, удаючы зь сябе мярцьвячыну, да агнявых скарбаў, бляскам якіх чэрці надзяць чалавека ў балота.

### Выпадак у супэркраме

У супэркраме ля касы ўтварылася даўгая чарга. Дзіця абычас штурхаў мамчын пакупніцкі вазок у бок пажылога мужчыны, што стаяў наперадзе. Спачатку дзядзька толькі азіраўся на жанчыну й ейнага сыночка. Безвынікова. Тады ён папрасіў матулю спыніць свавольства малога. Яна фанабэрыста адмовілася, заявіўшы, што выхоўвае сына ў новых, антыаўтарытарных, традыцыях. Студэнт-паляшук, які ад пачатку ўсё чуў, дастаў пакунак сыраквашы, раскрыў яго й выліў зьніякавелай фанабэрцы на галаву, прамаўляючы: «І правільна! Мяне акурат гэтак і выхоўвалі!». «Гэты пакунак аплочваю я!» — усхвалявана закрычэў дзядзька, удзячна гледзячы на маладзёна.

Антыаўтарытарнае выхаваньне з Эўропы нясьмела завітала й да нас. Але бацькава папруга і мамчын пляскач па азадку, на жаль, застаюцца ў беларускіх сем’ях найлепшымі спосабамі тлумачэньня правілаў паводзін у грамадзтве і належнага выкананьня дзецьмі іх сацыяльных роляў.


СЯРГЕЙ БАЛАХОНАЎ — літаратар. Аўтар «НН» і «Arche». Жыве ў Гомелі.

## АДАМ ГЛЁБУС



# Сучасьнікі

### 1995. Харыган і Амэрыка

Тэлевізійнік Стыў Харыган здымае пра мяне фільм на замову кампаніі CNN. Мы матляемся па Маскве ў аўтобусіку, наладаваным апаратураю. Я не падабаюся Стыву, а ён не падабаецца мне. На тэлевізіі заўсёды пануе гнятлівая атмасфэра, там ніхто нікому не падабаецца. Амэрыканец і не хавае свайго адмоўнага стаўленьня да маёй пэрсоны, што вызваляе мяне ад штучнай ветлівасьці. «Усе таленавітыя людзі жывуць у Амэрыцы!» — шпурляе Стыў. «Я не жыву ў ЗША, а фільм ты пра мяне здымаеш». — «Калі ты сапраўды таленавіты, дык будзеш жыць у Амэрыцы». — «Табе, Стыў, сягоньня пашанцавала. Ты размаўляеш зь літаратарам, езьдзіш па вялікім горадзе, разважаеш пра Мітчэл і Хемэта, а заўтра цябе з маскоўскага бюро пашлюць на Каўказ, у Чачэнію, да людарэзаў, ты будзеш здымаць пра вайну Поўначы з Поўднем і ўспамінаць, як было добра са мною ў Маскве». — «Усе здольныя людзі жывуць у Амэрыцы». Харыган у гэта верыць, безумоўна. У яго такая форма веры, такая рэлігія. Я не забыўся, як у дзяцінстве чуў падобнае: «Самыя шчасьлівыя дзеці жывуць у СССР!»

*8.07.2004, 23:42*

### 2004. Старая з бананам

«Дзяўчынка на шары», «Дзяўчынка з пэрсыкамі», «Дзяўчынка з голубам»… Такое было. А каб «Старая з бананам»? Не сустракаў падобнага абразá. «Калі хвалююся, ем банан. Дапамагае. А Вы, малады чалавек, што робіце, калі расхвалюецеся?» — яна падыходзіць да мяне на аўтобусным прыпынку. Сівенькая, у ваўнянай кофтачцы колеру марской хвалі, з надкусаным бананам у сухенькай руцэ, падобнай да птушынай лапкі. «Прыпальваю цыгарэту». — «Расхвалявалася і купіла банан. Хвалююся, бо нікому не патрэбная. Спадзявалася, што буду патрэбная дзецям, потым глядзела ўнука, зноўку спадзеючыся на ягоную ўдзячнасьць. Яны ўсе няўдзячныя. Ім нецікава, ці жыву я, ці не жыву… А вы што думаеце пра дзяцей і ўнукаў?» Ад чаканага адказу на безадказнае пытаньне мяне ратуе сотавы тэлефон, а пазьней — аўтобус. Што думаю, што думаю… Думаю, што дзяўчатак з пэрсыкамі мала хвалююць старыя з бананамі.

*9.07.2004, 12:31*

## АЛЯКСАНДАР ВОРВУЛЬ

# Слоўнік скептыка



**Лад сямейны —** гэта калі ёсьць два тэлевізары.

**Лазьня** — месца, дзе можна сустрэць самых гарачых жанчын.

**Ланцуг залаты** — упрыгажэньне тых, каму сьвецяць жалезныя кайданкі.

**Лекцыя** — барацьба голаду са сном.

**Лёс** — каханьне шахцёра і стуардэсы.

**Лібэрал** — чалавек, якога кансэрватары лічаць радыкалам, а радыкалы — кансэрватарам.

**Лінія** — даўжыня без шырыні.

**Лінія простая** — беглая кропка.

**Лісьлівасьць** — майстэрства казаць іншаму тое, што ён сам пра сябе думае.

**Лукашэнка Аляксандар** — самотны бацька савецкіх беларусаў.

**Лыжнік** — малпа, чалавекам якую зрабілі ня кій, а два кійкі.

**Львоў** — сталіца ўкраінцаў.

**Любоў да сваякоў** — пачуцьцё, моц якога проста прапарцыйная адлегласьці паміж імі.

**Люстэрка** — прылада, якая дапамагае жанчыне спазьніцца на спатканьне.

**Лянота** — звычай адпачываць заўчасна.

**Лянота сапраўдная** — гэта калі вам ляніва мыць посуд у пасудамыйнай машыне.

**Лянота спадчынная** — гэта калі ляніва рабіць спадкаемцаў.

**Лятарэя** — падатак на тых, хто дрэнна ведае матэматыку.

**Лятарэя дзяржаўная** — найбольш дакладны спосаб падліку колькасьці аптымістаў.

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Белавеская пушча. Фотаальбом** / Фота Ф.Бробава, П.Кастрама, М.Шарай; Уклад. В.Гардзей; Перакл. з анг. У.Бурлака. — Менск: Літаратура і мастацтва, 2004. — 160 с.: іл. 3000 ас.

**Гардзіенка Н. Беларусы ў Аўстраліі: да гісторыі дыяспары** / Прадмова І.Сурвіллы. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2004. — 468 с. 300 ас. — (Бібліятэка «Бацькаўшчыны»: кн. 3).

Манаграфія распавядае пра гісторыю станаўленьня і дзейнасьць беларускіх асяродкаў у Аўстраліі, асьвятляе розныя аспэкты прысутнасьці беларусаў у жыцьці тамтэйшага грамадзтва, зьмяшчае ўспаміны, вялікі біяграфічны паказьнік, фатаздымкі. Асобныя разьдзелы нададзены ролі жанчын у дыяспары. Цана 6 000.

**Ельскі А. Выбранае** / Уклад. Н.Мазоўкі, У.Казьберука; Пер. з польск. Н.Мазоўкі, У.Казьберука, Г.Кісялёва. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2004. — 469 с.: іл. — (Беларускі кнігазбор, сэрыя 2: гісторыка-літаратурныя помнікі).

У кнізе сабраны ўсе значныя творы зь вялікай гісторыка-літаратурнай спадчыны А.Ельскага, аднаго з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры.

**Мароз У. Менск. Старадаўні і малады** / Маст. В.Мішчанка. — Менск: Міжнародны цэнтар культуры кнігі, 2004. — 160 с.: іл. 3 000 ас.

У кнізе ідзе аповед аб менскіх вуліцах і праспэктах, гістарычны экскурс.

**Долготович Б. Адмиралы земли Беларуской** / Ред. подполковник В.М. Пастухов. — Менск: УП Технопринт, 2004. — 140 с. 500 ас.

Даведачна-энцыкляпэдычны зборнік утрымлівае імёны герояў-маракоў беларускага паходжаньня.

**Лазутка С., Валиконите И., Гудавичюс Э. Первый Литовский Статут (1529).** — Вільня: Marsi Rastai, 2004. — 522 с. 750 ас.

**Федорук А. Старинные усадьбы Берестейщины** / Ред. Т.Мартыненко. — Менск: БелЭн, 2004. — 576 с.: ил. 1 500 экз.

Апісаньне прысядзібнага дойлідства Берасьцейскага краю, гісторыі фармаваньня і асаблівасьці пляніроўкі сядзіб. Цана 41 000.

**Сяргей Лескець**

# Вучыся, нябожа, чэмпіёнам станеш!

Студэнт Аляксандар Сыман пасьпяхова здае «мэдальныя залікі» на сусьветных спаборніцтвах другога ўзроўню. Ці здолее ён у лютым 2006 году ў Турыне пасьпяхова здаць «алімпійскую сэсію»? Артыкул **Зьмітра Казлоўскага**.



**АЛЯКСАНДАР СЫМАН**
**Нарадзіўся 26 ліпеня 1977 году ў Капылі.**
**Жанаты, дзяцей пакуль няма.**
**Рост 178 см, вага 73 кг.**
**Біятлёнам займаецца з 1991 году.**
**Чэмпіён Эўропы-2004, срэбны і бронзавы прызёр Унівэрсіяды-2005.**
**Віцэ-чэмпіён сьвету-2001 у эстафэце.**
**Хобі — аўтамабілі, гісторыя.**

«ПРЕССБОЛ»

Па сканчэньні першае паловы сусьветнае Ўнівэрсіяды, што праходзіць з 12 да 22 студзеня ў аўстрыйскім Інсбруку, толькі 27-гадовы біятляніст Аляксандар Сыман быў адзіным беларусам, што паклаў у скарбонку ўзнагароды — на ягоным ліку срэбны мэдаль у індывідуальнай гонцы на 20 км і бронзавы ў спрынце на 10 км — ягоных улюбёных відах. Тым часам ягоныя старэйшыя калегі па нацыянальнай камандзе — Алег Рыжанкоў, Аляксей Айдараў, Рустам Валіулін, Уладзімер Драчоў — чарговы раз праваліліся на Кубку сьвету, гэтым разам на пятым этапе, што прайшоў у нямецкім Рупольдынгу. Мо прыйшоў час памяняць фронтмэна зборнай — з Драчова ці Рыжанкова на Сымана? Тым больш, што для гэтага ёсьць падставы. У спаборніцтвах «старэйшых» спартоўцаў гэты ледзьве не адзіны ў нашай камандзе біятляніст беларускага паходжаньня меў посьпехі хіба ў эстафэтнай камандзе — ён ніколі ня лідэрам, але і надвор'я не псаваў.

З аднаго боку, Аляксандар — майстар па зборы ўзнагарод на турнірах другога пляну. Апрача сёлетніх «студэнцкіх» мэдалёў, ён выйграваў спрынт чэмпіянату Эўропы-2004 у Раўбічах — як памятаем, наймацнейшыя біятляністы сьвету ў Беларусь не прыехалі. І сёлета Аляксандар зьяўляецца пакуль найлепшым зь беларусаў у заліку Кубку сьвету, трымаючыся на 45-м месцы.

Таму Сыман можа стаць галоўнай мэдальнаю надзеяй у мужчынскім біятлёне на Алімпіядзе-2006 у Італіі (разам з ужо даволі даўна «прыгнаным» з Расеі Валіуліным). Маладым і зялёным яго можна назваць умоўна — хлопец мае 27 гадоў, узрост, калі ўжо трэба думаць пра перамогі большага маштабу. Бо практыка паказвае, што найбольшых посьпехаў за кар'еру біятляністы дасягаюць ва ўзросьце 28—30 гадоў.

Ілюструе гэта табліца найпасьпяховейшых гадоў некаторых самых вядомых біятляністаў сьвету і асноўных посьпехаў нашых спартоўцаў.

Выбіваюцца хіба больш сталы чэмпіён-2003 Рыка Грос і «зялёны» мэдаліст Нагана Аляксей Айдараў.

Будзем спадзявацца, што наступны — алімпійскі — сэзон будзе для Аляксандра больш удалым. Праўда, хлопцу бракуе досьведу выступаў на высокім узроўні, які ён пачаў атрымліваць, седзячы за сьпінамі ў «дарослых дзядзькоў», толькі пачынаючы зь мінулага сэзону. Але той жа самы Б'ёрндален таксама пачынаў з нуля.

| Спартовец/спартоўка | Турнір | Мэдалі (золата — срэбра— бронза) | Узрост падчас турніру |
|---|---|---|---|
| Оле Эйнар Б'ёрндален (Нарвэгія) | АГ-2002 | 4-0-0 | 28 |
| Рафаэль Пуарэ (Францыя) | ЧС-2004 | 3-1-1 | 30 |
| Свэн Фішэр (Нямеччына) | ЧС-1999 | 2-0-1 | 28 |
| Рыка Грос (Нямеччына) | ЧС-2003 | 1-1-1 | 33 |
| Ліў Грэт Пуарэ (Нарвэгія) | ЧС-2004 | 4-0-0 | 29 |
| Ушы Дызль (Нямеччына) | АГ-1998 | 1-1-1 | 28 |
| Аляксей Айдараў | АГ-1998 | 0-0-1 | 23 |
| Алег Рыжанкоў | ЧС-1997 | 1-1-1 | 30 |
| Сьвятлана Парамыгіна | АГ-1994 | 0-1-0 | 29 |

(АГ — Алімпійскія гульні, ЧС — чэмпіянат сьвету.)

## СЬЦІСЛА

### Посьпех Калюжнага і «Авангарду»

У мінулы ўік-энд омскі «Авангард» заваяваў найпрэстыжнейшы хакейны трафэй кантынэнту — Кубак эўрапейскіх чэмпіёнаў. У супэрфінале ў Санкт-Пецярбурзе роўных чэмпіёну Расеі-2004 не было. Спачатку амічы разграмілі славацкую «Дуклу» — 6:1, потым нагадалі швэдам пра Палтаўскую бітву, не пакінуўшы каменя на камені ад швэдзкага «ХВ-71» — 9:0, а ў фінале ва ўпартай барацьбе адолелі фінскі «Кэрпэт» — 2:1. Зрабіў важкі ўнёсак у перамогу беларускі форвард «Авангарду» Аляксей Калюжны: ён закінуў шайбу славакам, а ў фінальным паядынку дзякуючы ягонаму трапнаму кідку за дзевяць хвілін да канца трэцяга пэрыяду матч быў пераведзены ў овэртайм.

### Кароткачасовы ўзьлёт Мірнага

У панядзелак раніцай Асацыяцыя тэнісістаў-прафэсіяналаў распаўсюдзіла першы сёлетні рэйтынг. У чэмпіёнскай гонцы АТР Макс Мірны ўзьляцеў на 19-е месца (быў паводле вынікаў мінулага году на 42-м). Такі рывок адбыўся дзякуючы выхаду беларуса ў паўфінал турніру ў Сыднэі. Праўда, супернікі трапіліся Максу «лядашчыя»: у 1/8 фіналу зьняўся са спаборніцтваў швэд Ёхім Юхансан, а ў 1/4 фіналу паскардзіўся на траўму і зачахліў ракетку амэрыканец Тэйлар Дэнт.

На жаль, Мірны ненадоўга забавіцца сярод дваццаці найлепшых тэнісістаў сьвету. На Адкрытым чэмпіянаце Аўстраліі, што стартаваў у панядзелак у Мэльбурне, беларус у першым крузе саступіў аргентынцу Аўгусьціну Кальеры — 4:6, 7:5, 4:6, 6:4, 4:6. А гэта азначае аўтаматычнае паніжэньне ў рэйтынгу.

### Якая Садружнасьць, такі і Кубак

Датэрмінова скончылі выступленьні на футбольным Кубку чэмпіёнаў краін Садружнасьці Незалежных Дзяржаў футбалісты менскага «Дынама». Яны перамаглі казахстанскі «Кайрат» — 2:1, саступілі эстонскай «Лявадыі» — 0:1 і занялі ў падгрупе другое месца. Толькі першае месца давала выхад у чвэрцьфінал.

Год ад году цікавасьць да турніру падае, менее спонсараў і гледачоў. У мінулыя выходныя матч «Дынама-Менск»—«Кайрат» сабраў на трыбунах найбольшую колькасьць заўзятараў — ажно тысячу чалавек.

### Зьнясіленасьць Алімпіядай

Кіраўнік арганізацыйнага камітэту Алімпіяды-2004 Яна Ангелопулас-Даскалакі выпісана з больніцы. У швайцарскай Лязане яна праходзіла курс працэдур, скіраваных на аднаўленьне ад нэрвовага і фізычнага зьнясіленьня, якія былі выкліканыя цяжкімі нагрузкамі пры арганізацыі гульняў.

### Поўл-пазышн Яна Паўла II

Знакамітая стайня «Фэрары» і сяміразовы чэмпіён сьвету ў клясе «Формула-1» атрымалі аўдыенцыю ў Папы Рымскага. Пантыфік блаславіў «скудэрыю», а спартоўцы падарылі яму паменшаную копію баліда «Формулы-1», заявіўшы, што «Фэрары» даводзіцца змагацца за лепшую стартавую пазыцыю падчас кожнага гран-пры, а Ян Павал II даўно ў сьвеце забраніраваў сабе поўл-пазышн.

**Алег Раявец**



ІНФАРМАТАР

# Каму падаваць дэклярацыю?

Фізычныя асобы, якія атрымалі больш за 4 млн 650 тыс. рублёў даходу цягам 2004 году зь некалькіх крыніц, да 1 сакавіка маюць падаць у падатковыя органы дэкларацыю пра сукупны гадавы даход.

Паводле інфармацыі Міністэрства па падатках і зборах, дэклярацыя таксама падаецца фізычнымі асобамі, што атрымалі даходы з-за мяжы ад фізычных асоб, якія не зьяўляюцца прадпрымальнікамі. А таксама калі фізычная асоба, якая не зьяўляецца індывідуальным прадпрымальнікам, атрымлівала даходы ад здачы ў арэнду, найму жылых і нежылых памяшканьняў іншым фізычным асобам, што не зьяўляюцца прадпрымальнікамі, і памер гэтага даходу перавысіў 500 базавых велічыняў у год (на сёньня базавая велічыня складае 24 тыс. рублёў).

Дэклярацыя таксама падаецца, калі фізычная асоба — індывідуальны прадпрымальнік, у тым ліку прыватны натарыюс. Пры гэтым не ўключаюцца ў абкладаны сукупны гадавы даход і не адлюстроўваюцца ў дэклярацыі даходы ад прадпрымальніцкай дзейнасьці, падаткаабкладаньне якіх ажыцьцяўлялася ў вызначаным для суб’ектаў малога прадпрымальніцтва парадку, даходы ад відаў дзейнасьці, па якіх плаціўся адзіны падатак з індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых фізычных асоб, даходы ад заняткаў ігральным бізнэсам, зь якіх плаціўся падатак на ігральны бізнэс.

Фізычная асоба падае дэклярацыю, калі яна атрымлівала даходы пад залог маёмасьці, уключаючы каштоўныя паперы і ня вернутыя ў вызначаныя тэрміны, а таксама сумы, якія належаць фізычнай асобе ад рэалізацыі такой маёмасьці, калі раней падаходны падатак ня ўтрымліваўся.

Дэкляраваньню таксама падлягаюць сумы, атрыманыя як кампэнсацыя маральнай шкоды, даходы ад выплатнага адчужэньня цягам пяці год больш чым адной кватэры, больш чым аднаго жылога дому, больш чым адной дачы, больш чым аднаго садовага доміку з гаспадарчымі пабудовамі, больш чым аднаго гаражу, больш чым аднаго зямельнага ўчастку, што належалі фізычным асобам на правах уласнасьці, ад выплатнага адчужэньня на працягу аднаго каляндарнага году больш чым аднаго аўтамабіля ці іншага транспартнага сродку.

Дэклярацыя падаецца ў выпадку атрыманьня даходаў ад ажыцьцяўленьня прадпрымальніцкай дзейнасьці ў парушэньне вызначанага парадку, даходаў ад дарэньня ад фізычных асоб, што пастаянна знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі, якія перавышаюць 500 базавых велічыняў у год, а таксама даходаў, атрыманых у выніку дарэньня ад фізычных і юрыдычных асоб за мяжой ці з-за мяжы.

Апроч таго, кошт прызоў у грашовай і натуральнай форме, атрыманых спартсмэнамі непасрэдна на міжнародных спаборніцтвах, даходы ад дыпляматычных, консульскіх і іншых прадстаўніцтваў замежных дзяржаў, калі крыніцай выплаты падаходны падатак ня ўтрымліваўся, таксама ўказваюцца ў дэклярацыі.

У цэлым у адпаведнасьці з Законам Рэспублікі Беларусі «Аб падаходным падатку зь фізычных асоб» аб’ектам падаткаабкладаньня зьяўляецца сукупны даход фізычных асоб у грашовай і натуральнай форме, атрыманы на працягу каляндарнага году грамадзянамі Беларусі і замежнымі грамадзянамі ды асобамі без грамадзянства, якія пастаянна знаходзяцца на тэрыторыі рэспублікі, — ад крыніц у рэспубліцы і за яе межамі, а таксама замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства, якія не адносяцца да тых, што пастаянна знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусі, — ад крыніц у Беларусі.

Па заканчэньні каляндарнага году фізычныя асобы абавязаны не пазьней за 1 сакавіка падаць у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік дэклярацыю пра сукупны гадавы даход за каляндарны год. Для гэтага яны павінны (калі неабходна) зарэгістравацца ў якасьці падаткаплатніка Рэспублікі Беларусі ў падатковым органе.

## Падатковыя інспэкцыі Менску

| Назва | Адрас | Тэлефон |
|---|---|---|
| Дзяржаўны падатковы камітэт | Савецкая, 9 | 222 67 92 |
| Абласная | Сурганава, 28 | 222 45 48 |
| Гарадзкая | пр. Скарыны, 8 | 222 36 86 |
| №1 Фрунзэнскага раёну | Якубоўскага, 54а | 257 76 00 |
| №2 Фрунзэнскага раёну | пр. Пушкіна, 11 | 254 00 52 |
| Заводзкага раёну | Мічурына, 7 | 246 36 82 |
| Кастрычніцкага раёну | Чкалава, 6 | 224 10 44 |
| Ленінскага раёну | Маякоўскага, 83 | 221 56 25 |
| Маскоўскага раёну | пр. Дзяржынскага, 10 | 220 40 53 |
| Партызанскага раёну | Бядулі, 1 | 236 98 44 |
| Першамайскага раёну | Сядых, 12 | 216 05 36 |
| Савецкага раёну | Коласа, 19 | 232 11 73 |
| Цэнтральнага раёну | зав. Камунальны, 3 | 234 11 41 |
| Менскага раёну | Альшэўскага, 8 | 254 43 69 |

| Падатковыя інспэкцыі Берасьця | | |
|---|---|---|
| Абласная | Леніна, 11 | (0162) 231 137 |
| Гарадзкая | пл. Свабоды, 1 | (0162) 237 403 |
| Ленінскага раёну | Леніна, 13 | (0162) 236 196 |
| Маскоўскага раёну | Маскоўская, 273/1 | (0162) 419 490 |
| Берасьцейскага раёну | Харужай, 2 | (0162) 201 585 |

| Падатковыя інспэкцыі Віцебску | | |
|---|---|---|
| Абласная | Гогаля, 8 | (0212) 376 146 |
| Гарадзкая | Афіцэрская, 6 | (02122) 596 55 |
| Кастрычніцкага раёну | Смаленская, 9 | (02122) 458 34 |
| Чыгуначнага раёну | Дзімітрава, 34 | (0212) 374 565 |
| Першамайскага раёну | пр. Маскоўскі, 120 | (0212) 230 964 |
| Віцебскага раёну | Гогаля, 2 | (0212) 364 793 |

| Падатковыя інспэкцыі Гомелю | | |
|---|---|---|
| Абласная | пр. Леніна, 2 | (0232) 536 212 |
| Гарадзкая | Савецкая, 24а | (0232) 533 368 |
| Навабеліцкага раёну | Радзішчава, 3 | (02322) 326 80 |
| Савецкага раёну | Рэчыцкая шаша, 6 | (0232) 440 979 |
| Цэнтральнага раёну | Савецкая, 24 | (0232) 558 205 |
| Чыгуначнага раёну | Рэчыцкая, 1а | (0232) 536 566 |
| Гомельскага раёну | Ільіча, 51а | (02322) 343 53 |

| Падатковыя інспэкцыі Горадні | | |
|---|---|---|
| Абласная | Ажэшкі, 3 | (0152) 723 006 |
| Гарадзкая | Савецкая, 31 | (0152) 723 770 |
| Кастрычніцкага раёну | Цітова, 9 | (01522) 222 36 |
| Ленінскага раёну | Савецкая, 10 | (0152) 723 375 |
| Гарадзенскага раёну | Горкага, 51 | (0152) 967 358 |

| Падатковыя інспэкцыі Магілёва | | |
|---|---|---|
| Абласная | Дом Саветаў (пл. Леніна), | (0222) 326 786 |
| Гарадзкая | Касманаўтаў, 19 | (0222) 255 956 |
| Кастрычніцкага раёну | бульвар Няскораных, 37 | (0222) 413 563 |
| Цэнтральнага раёну | Касманаўтаў, 19 | (0222) 255 311 |
| Ленінскага раёну | Ціміразеўская, 29 | (0222) 233 665 |
| Магілёўскага раёну | Заводзкая, 23а | (0222) 253 484 |




Да 185-х угодкаў з дня народзінаў
славутага кампазытара
СТАНІСЛАВА МАНЮШКІ
Беларуская Музычная Альтэрнатыва
прадстаўляе альбом
«Песьні з-над Нёмна й Дзьвіны »
на вершы Яна Чачота
Замовіць альбом можна праз тэл.:
6490888, 7662425, 4006774, w1979@tut.by
Пытайцеся таксама ў музычных крамах краіны!

КАІСА

# Турнір па хуткіх шахматах

9 студзеня ў менскім шахматным клюбе «Вясьнянка» адбыўся турнір па хуткіх шахматах. За столікі разам з аматарамі сеў тузін такіх малапрыкметных у шахматным сьвеце асоб, як гросмайстар Азараў, міжнародныя майстры — чэмпіён сьвету сярод падлеткаў Сяргей Жыгалка і яго брат Андрэй; чэмпіён Беларусі Андрэй Малюш… На некалькі гадзін «зоркі» акупавалі адзін з пэрыфэрыйных ЖЭСаў, каб высьветліць, хто зь іх хутчэй умее біць па гадзіньніку.

Малым і нетытуляваным шахматыстам давалася фора ў тры-чатыры мінуты. У выніку першым да фінішу прыйшоў Сяргей Жыгалка, другім — Сяргей Азараў, а трэцім — кандыдат у майстры Ўладзімер Куцанкоў. Крыху нечакана, але заканамерна: сп.Куцанкоў адзін з самых пасьпяховых у Беларусі гульцоў у хуткія шахматы, ён выйграе, нават пакідаючы сабе хвіліну супраць пяці хвілін у суперніка. Каб меліся асобныя званьні для хуткіх шахматыстаў, У.Куцанкоў даўно б ужо абмываў майстарскі значок.

Усе ўдзельнікі (і ўдзельніцы) навагодняга бліцтурніру атрымалі неблагія прызы ад адміністрацыі клюбу — ад плястыкавай цацкі да электратостэра. Аднак найлепшым прызам для многіх бязрэйтынгавых шахматыстаў, уключаючы карэспандэнта «НН», была мажлівасьць падужацца за адной дошкай з майстрамі спорту міжнароднае клясы.

**ВР**

### Як бы вы згулялі?

**Л.Школьнікаў — Н.Палівода. Менск, 2005.**
**У туровым эндшпілі чорныя лёгка перамагалі пасьля 1...Тb2. Аднак у цайтнотнай гонцы яны вырашылі адагнаць белую туру ходам 1...Кре5. Што рабіць белым?**



**Адказ:** ахвяраваць туру. Пасьля 2. d6! прахадной пешкі не стрымаць. Зрэшты, белыя ўсё-такі прайгралі праз недахоп часу.

ПАРТЫЯ З ГРОСМАЙСТРАМ



**На ход белых 2. b5 чытачы прапаноўвалі і 2...b6, і 2...c6, і 2...d5, аж да 2...a4?!! Большасьць галасоў аддадзена за натуральнае 2...Kg8-f6. Рэакцыя гросмайстра таксама натуральная: 3. Cc1-b2. Слон выведзены на вялікую дыяганаль, пакуль ён ня надта страшны: пазыцыя чорных застаецца моцнай.**
**Што рабіць далей? Чакаем адказаў да 19-й гадзіны панядзелка (лістуйце на e-mail nn@promedia.by з пазнакай «Каіса»).**



Адказ на японскую крыжаванку, зьмешчаную ў «НН» № 1.

## ТЭАТРЫ

**Купалаўскі тэатар**
**20** (чц), **21** (пт) — «Эрык XIV».
**22** (сб) — «Таполевая завея».
**23** (ндз) — «Паўлінка».
**Малая сцэна**
**20** (чц) — «Дагарэла сьвечачка».
**22** (сб) — «Муж для паэткі».
**23** (ндз) — «С.В.».

**Тэатар беларускай драматургіі**
**20** (чц) — «Жанчыны Бэргмана».
**22** (сб) — «Толькі дурні сумуюць».
**23** (ндз) — «Палёты з анёлам».
**Малая сцэна**
**21** (пт) — «Нязваны госьць».

**Тэатар імя Горкага**
**20** (чц) — «Тата, тата, бедны тата!..».
**21** (пт) — «Сунічная паляна».
**22** (сб) — «Амфітрыён».
**23** (ндз) — «Дэтэктар хлусьні».
**Малая сцэна**
**23** (ндз) — «Рулетка».

**Опэра**
**20** (чц) — «Тоска».
**22** (сб) — «Вясельле Фігара».
**23** (ндз) — «Травіята».

**Музычны тэатар**
**20** (чц) — «Галяктыка каханьня».
**21** (пт) — «Марыца».
**22** (сб) — «Севастопальскі вальс».
**23** (ндз) — «Даратэя».

**Моладзевы тэатар**
**20** (чц) — «Банкрут».
**21** (пт) — «Выспа даброт».
**22** (сб) — «Акадэмія сьмеху».
**23** (ндз) — «Пігмаліён».

**Новы драматычны тэатар**
**20** (чц) — «Зацюканы апостал».

**Тэатар эстрады**
**20** (чц) — «Танцы ў чырвоным».
**21** (пт) — «Эстрадны кактэйль».

**Тэатар-студыя кінаактора**
**22** (сб) — «Заноза».
**23** (ндз) — «Айсэдора. Танец каханьня».

**Цэнтральны Дом афіцэраў**
**22** (сб) — «Кепская сямейка».

**«Хрыстафор»**
**22** (сб) — «Хоць стой, хоць падай!».

## ІМПРЭЗЫ

**EGOізмы**
**20 студзеня** ў Чырвоным касьцёле адбудзецца прэзэнтацыя кнігі Сяргея Абламейкі «EGOізмы». Пачатак а 18-й гадзіне.

**Нямецкі інфармэль**
**Да 20 лютага** ў Музэі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр. Скарыны, 47) працуе выстава «Бэрнард Шульцэ, Эміль Шумахер, Фрэд Цілер: нямецкі інфармэль».

**«Вігілія»**
**Да 28 лютага** ў «М-Галерэі» Інстытуту імя Гётэ (Фрунзэ, 5) працуе выстава «Вігілія».

**Заля камэрнай музыкі**
**20** (чц) — «Інтрада», ансамбль трубачоў.

**Палац культуры МАЗ**
**20** (чц) — Вечар гітарнай музыкі. Выступаюць Уладзімер Дацэнка (Харкаў), Юлія Лонская (Менск).

# Выстава з хатнікамі


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**У Музэі гісторыі беларускай літаратуры, што ў Траецкім перадмесьці (вул.Багдановіча, 15), адчынілася выстава «Хата — мой Сусьвет», прысьвечаная традыцыйнаму побыту беларусаў. Яна спадабаецца малым дзецям: цікава будзе паглядзець пакойчыкі-інсталяцыі з сапраўднымі ложкамі, кашамі, вянкамі цыбулі на сьценах, пашукаць, дзе хаваюцца хатнікі й іншыя дробныя нячысьцікі. Ня маеце часу завітаць у Траецкае бліжэйшымі днямі — не турбуйцеся: выстава будзе экспанавацца цэлы год.**

**На здымку: выставу адчыняе Арсень Ліс. Музэй працуе ўсе дні, апроч панядзелка, ад 9 да 18-й. Квіткі каштуюць 750—1800 руб. За 7 тысяч можна замовіць экскурсію.**

**Палац мастацтваў**
**Да 24 студзеня** працуе выстава нетрадыцыйнай аб'ёмнай вышыўкі Тамары Багданавай «Вера. Надзея. Каханьне».
**Да 31 студзеня** тамсама працуе выстава «Мастакі Маладэчна».

**Фэстываль Далі**
У галерэі Ўнівэрсытэту культуры (Палац Рэспублікі) **да 26 студзеня** працуе выстава, прысьвечаная 100-годзьдзю з дня нараджэньня знакамітага мастака.

**Галерэя «Сьвет фота» (Прытыцкага,10)**
**Да 24 студзеня** працуе выстава Валер'я Федарэнкі (Гомель).

## КЛЮБНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

**Bronx** (288–10–61)
**20** (чц), 22.00 — dj Dust.
**21** (пт), 20.00 — жывая музыка: «Madera Hard Blues», «Fashion show», dj Grizzly.
**22** (сб), 23.00 — dj Top, dj Grizzly.

**Белая вежа** (284–69–22)
**20** (чц). 23.00 — «White Tower Party»: dj Top, dj Grizzly.
**21** (пт), 23.00 — dj Mihel, dj Dee.
**22** (сб), 23.00 — dj Mihel, dj Dee.

**Изюм** (206–66–18)
**20** (чц), 21.30 — «Chill-out Zone»: квартэт «Dolce Vita»; dj Lexa.
**21** (пт), 21.30 — «Barmen show», dj Jerry B, dj Smith.
**22** (сб), 22.00 — «$H_2O$ Party»: dj Lexa, dj Mitya.

**Гудвін** (226–13–06, 626–13–03)
**20** (чц), 20.00 — жывая музыка.
**21** (пт), 21.00 — жывая музыка.
**22** (сб), 21.00 — жывая музыка.

**Бліндаж** (219–00–10)
**20** (чц), 23.00 — dj Egor.
**21** (пт), 22.00 — dj Egor.

**X-Ray** (223–93–55)
**21** (пт), 22.00 — dj-bar.
**22** (сб), 23.00 — дзень нараджэньня «X-Ray»: dj Andy Spence (Organic Audio, UK), dj Arsenti Tchouprina.

## У МЕНСКІХ КІНАТЭАТРАХ

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Аляксандар»***: **21** (пт) 16.50, 20.00; **22, 23** (сб, ндз) 13.40 (іл), 16.50, 20.00.
«Брыджэт Джонс: межы разумнага» (прэм'ера): **21** (пт) 17.00; **22, 23** (сб, ндз) 13.00, 15.00, 17.00.
«Дзяўчына з жамчужнай завушніцай»*** («Кінафармат 4х4»): **21** (пт) 19.00, 21.00.
«5х2»**** («Кінафармат 4х4»): **22** (сб) 19.00, 21.00.
«Паглядзі на мяне»*** («Кінафармат 4х4»): **23** (ндз) 19.00, 21.00.
**«Берасьце»** (272-87-91)
«Лемані Сьнікет: 33 няшчасьці»: **21** (пт) 16.40 (іл), 18.50 (іл); **22, 23** (сб, ндз) 16.40, 18.50.
«Начная варта»: **21** (пт) 21.00; **22, 23** (сб, ндз) 14.00, 21.00.
**«Дружба»** (240-90-13)
«Аляксандар»***: **21, 23** (пт, ндз) 16.00, 20.00; **22** (сб) 16.00 (іл), 20.00.
«Трое ў каноэ»: **21** (пт) 14.00; **23** (ндз) 13.00 (іл).
**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Брыджэт Джонс: межы разумнага» (прэм'ера): **21** (пт) 14.40, 16.40, 18.50, 21.00; **22, 23** (сб, ндз) 14.40 (іл), 16.40, 18.50, 21.00.
**«Масква»** (223-27-10)
«Брыджэт Джонс: межы разумнага» (прэм'ера): **21** (пт) 17.00, 19.00, 21.10; **22, 23** (сб, ндз) 14.00 (іл), 16.30, 18.00, 21.10.
**«Мір»** (284-37-71)
«Аляксандар»***: **21** (пт) 14.20 (іл), 17.30, 20.30; **22, 23** (сб, ндз) 14.20, 17.30, 20.30.
«Паглядзі на мяне»*** («Кінафармат 4х4»): **21** (пт) 16.40, 18.50, 21.00.
«Дзяўчына з жамчужнай завушніцай»*** («Кінафармат 4х4»): **22** (сб) 16.40, 18.50, 21.00.
«2046»*** («Кінафармат 4х4»): **23** (ндз) 16.40, 18.50, 21.00.
**«Перамога»** (223-77-66)
«5х2»**** («Кінафармат 4х4»): **21** (пт) 15.00, 17.00, 19.00, 21.00.
«2046»*** («Кінафармат 4х4»): **22** (сб) 15.00 (іл), 17.00, 19.00, 21.00.
«Дзяўчына з жамчужнай завушніцай»*** («Кінафармат 4х4»): **23** (ндз) 15.00 (іл), 17.00, 19.00, 21.00.
**«Піянер»** (227-64-87)
«Давайце патанцуем»: **21** (пт) 15.00, 17.00, 21.00; **22, 23** (сб, ндз) 17.00, 21.00.
«Наталі»***: **21—23** (пт—ндз) 19.00.
«Прынц і я»: **21** (сб) 12.40; **22, 23** (сб, ндз) 14.30.
**«Цэнтральны»** (220-34-16)
«Аляксандар»***: **21** (пт) 11.00; **22** (сб) 11.00 (іл); **23** (ндз) 11.00 (іл), 14.10.
«2046»*** («Кінафармат 4х4»): **21** (пт) 14.00, 16.20, 18.40, 21.00.
«Паглядзі на мяне»*** («Кінафармат 4х4»): **22** (сб) 14.00, 16.20, 18.40, 21.00.
«5х2»**** («Кінафармат 4х4»): **23** (ндз) 17.20, 19.10, 21.00.

(іл) — ільготны сэанс (зьніжка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

## ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

**Тэатар беларускай драматургіі**
**22** (сб) — «Хрустальны туфлік».
**23** (ндз) — «Айбаліт, Бармалей, пра жывёл і Брадвэй».
**Музычны тэатар**
**22** (сб) — «Айбаліт-2002».

**Кіно**
**«Аўрора»**
«Горад чарадзеяў»: **21** (пт) 14.30; **22, 23** (сб, ндз) 11.40.
**«Берасьце»**
«Нязнайка і Барабас»: **22, 23** (сб, ндз) 12.00.
**«Дружба»**
«Гарэзы»: **21** (пт) 12.00; **22, 23** (сб, ндз) 11.00.
**«Мір»**
«Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончана»: **22, 23** (сб, ндз) 15.00.
**«Піянер»**
«Чароўная выспа»: **21** (пт) 11.00; **22, 23** (сб, ндз) 10.30.
«Агент Кодзі Бэнкс»: **22, 23** (сб, ндз) 12.30.

## КІНО НА DVD

# Паэзія кіно і помсты

Oldboy / «Стары хлопец»
Паўднёвая Карэя, 2003, каляровы, 120 хв (DVD)
**Жанр:** баявік, трансцэндэнтальная драма.
**Адзнака:** 9,5 (з 10).



Леташні канскі кінадыямэнт — крывавы й паэтычны фільм «Олдбой» — зьявіўся ў менскіх крамах на DVD; раней ён дэманстраваўся на экранах у кінафармаце «4х4».

Драматургія карціны надзвычай напружаная. Звычайнага й памяркоўнага чалавека, О Дэ-Су (актор Цой Мін-Сік), скрадаюць і бяз дай прычыны трымаюць у замкнёным пакоі 15 год. Калі герой выходзіць на волю, ён апантаны жаданьнем разабрацца з крыўдзіцелямі. Але паўднёвакарэйскі граф Монтэ-Крыста мусіць зазірнуць у сваю душу і прайсьці — разам з гледачом — праз катарсіс віны й помсты.

Створаны паводле манга-коміксаў Цутвы Гарона, фільм Чхан-Ук Пака зь лёгкасьцю злучае Хічкока і кун-фу, Сафокла й Таранціна, выдраная цьвікадзёрам зубы і клясычную музыку. Але пры гэтым карціна на рэдкасьць цэласная й арганічная. Самыя бульварныя дэталі сьвежыя і ўзвышаныя, самыя крывавыя — і невыносныя — сцэны гіпнатычныя (і цнатлівыя!), як, напрыклад, лёгкі і пекны танец забойцы-мсьціўцы.

Раны на целе — сымбалічная і відовішчная пазнака граху, кінэматаграфічнае, дый умоўнае, увасабленьне помсты: нястрыманы язык — дабраахвотна адрэзаць, нячыстую руку — адсекчы, а ў якасьці вітальнае нечалавечае сілы выступае зажыва зьедзены васьміног.

Інцэст, гіпноз, забыцьцё і помста, лютасьць нянавісьці й харэаграфія сьмерці, каханьне й надзея — гэта кіно пра «старога хлопца», які дачасна сьсівеў і, рахманы, дрэмле ў глыбінях культуры, бязьвінны й чысты, як садыст-немаўля, што пабраўся шлюбам з уласнай дачкой і спадзяецца на дараваньне.

Карціна «Олдбой» выкліча ў гледачоў ці то нястрымнае захапленьне, ці то нястрымную нянавісьць. Але й гэтая нянавісьць кінэматаграфічная.

**Андрэй Расінскі**

ЛЕВЫМ ВОКАМ



# Траўка зелянее, сонейка блішчыць

Глябальнае пацяпленьне ламае ўсталяваны ў 1990–я палітычны каляндар. У ролі палітмэтэаролягa выступае **Лёлік Ушкін.**

За час існаваньня незалежнай Беларусі ў краіне склаўся своеасаблівы палітычны каляндар. Нават два календары, бо ў грамадзтве існуюць дзьве моцныя субкультуры — улада і апазыцыя. Калі ўзяць за прынцып канструкцыю народных календароў — назва месяца паходзіць ад назвы роду дзейнасьці або стану прыроды, — паліткалендары могуць выглядаць наступным чынам.

## Апазыцыйны каляндар

Севярын (колішні люты). Паходзіць ад ініцыятывы Паўла Севярынца кожны год на 14 лютага швэндацца па эўрапейскіх амбасадах і ўручаць амбасадарам «валянцінкі».

Бэнээрык (колішні сакавік). Паходзіць ад даты 25 Сакавіка — гадавіны абвяшчэньня незалежнасьці БНР. Тут няма чаго ўдакладняць.

Шляхетнік (былы красавік). Паходзіць ад назвы галоўнага гіта палітсэзону — «Чарнобыльскі шлях».

Акрэсьцінь (колішні травень). Паходзіць ад практыкі ўладаў арыштаваных падчас 26 красавіка і 1 траўня апазыцыянэраў пасьля суду дастаўляць у турму на Акрэсьціна, дзе тыя сядзяць тыдзень-два. Адсюль і назва месяца.

Басовуль (былы ліпень). Паходзіць ад музычнага фэстывалю «Басовішча» ў Польшчы. Самая прагрэсіўная частка моладзі едзе туды, каб пакаўбасіцца пад дэцыбэлы «Н.Р.Му» і ўжрацца MTV (моцным танным вінам).

Каалічнік (некалі быў кастрычнікам). Паходзіць ад практыкі апазыцыянэраў заключаць ў гэты час году міжпартыйныя кааліцыі.

## Афіцыйны каляндар

Газій (колішні люты). Назва ад дзяжурных разборак з «Газпромам» наконт таго, хто каму вінаваты.

Сэлекторык (былы сакавік). Назва паходзіць ад сэлектарных нарад па пасяўной з гвалзом нумару — публічнай лупцоўкай чыноўнікаў.

Інтэгрык (колішні красавік). Месяц атрымаў назву дзякуючы сьвяту інтэграцыі з Расеяй 2 красавіка.

Адмарозень (былы травень). Паходзіць ад слова «адмарозак» (сынонім слова «апазыцыянэр»). На гэты час прыпадае выбух энэргіі ўсіх незадаволеных рэжымам.

Вызвален (колішні чэрвень). Паходзіць ад пачатку апэрацыі Багратыён, што пачалася ў трэцяй дэкадзе чэрвеня.

Базарань (колішні ліпень). Паходзіць ад мерапрыемства пад назвай «Славянскі базар».

Рэкордзень (былы жнівень). Паходзіць ад практыкі ўстанаўленьня ў гэты час працаўнікамі аграрнага сэктару гінэсаўскіх рэкордаў па хуткасьці збору і аб'ёмах ураджаю.

Манэўрань (ранейшы верасень). Паходзіць ад традыцыйнае вайсковай акцыі.

Рэфэрэндзік (колішні кастрычнік). Названы ў гонар апошняга рэфэрэндуму.

Не выпадкова ў абодвух календарах палітычны год заканчваецца ў пачатку лістапада і стартуе прыблізна напрыканцы лютага. Сапраўды, што палітыку рабіць узімку, калі людзі яшчэ ня выйшлі з алькагольнай матрыцы, а па скрыні ідуць навагодня праграмы? І самае галоўнае — на дварэ дубак! Прадстаўнікам апазыцыі — ні транспаранту разгарнуць, ні харугвы паднесьці. Агентам рэжыму — ні опэра засьлаць, ні апазыцыянэра павінціць.

Дзякуючы глябальнаму пацяпленьню лістапад і тры зімовыя месяцы сталі прыдатнымі для палітактыўнасьці. Дэманстрацыі і акцыі можна праводзіць хоць у самыя лютыя маразы, якія цяпер не зашкальваюць за 5—7 градусаў паводле Цэльсія. Палітыкам застаецца напоўніць часавы вакуўм канкрэтнай справай. За справу!

**Запрашаем у падарожжа**

**30 студзеня** (нядзеля) па маршруце **Менск—Клецак—Радзівілімонты—Янавічы—Страўкава—Грушаўка—Мілавіды—Ястрэмбань—Менск**.
Цана 21 000 рублёў.

Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер)
264-12-38, 776-24-35 (Павал)



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**НАЦЫЯНАЛЬНЫ СПОРТ. Выходнымі ў Міры прайшло фальклёрнае сьвята «Шчодры Вечар». На фоне старажытнага замку разгарнулі свае яткі раённыя і абласныя гандлёвыя арганізацыі; гасьцей забаўлялі масавікі-пацешнікі, пераўвасобленыя ў калядоўшчыкаў і варажбітак; ладзіліся спартовыя спаборніцтвы для дарослых і дзяцей. Сярод апошніх меў вялікую папулярнасьць бег у бульбяных мяхах.**

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**МС.** Ваш артыкул пачынаецца з тэзісу, што ў сытуацыі ў гэтай сфэры эканомікі вінаваты Лукашэнка. Але ж далей Вы адкладаеце публіцыстычнае пяро і даяце спакойны, узважаны аналіз. Калі б Вы пазбыліся прапагандысцкіх штампаў і мэтаў, мы ахвотна друкавалі б такія агляды. Аналітыка з пазыцый нацыянальных інтарэсаў запатрабаваная газэтай.

**Алесю К.** Імпрэсіі ўвогуле хутка старэюць, а Ваша казка-імпрэсія шчэ й спазьнілася.

**Міколу Б. з Дубровы.** Ваш ліст перадалі ў Рэдакцыю «ARCHE».

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Віншую Юр'я і Алінку Фраловых** з нараджэньнем сыночка Яна. Посьпехаў яму, боскай і людзкой радасьці.

**Віншуем Паўлюка і Сямёна** з Днём народзінаў. Чыстага неба, піва і хлеба. Маладыя навукоўцы

### КАНТАКТЫ

**Мянчук** (43/170/54), в/а, нежанаты, шукае беларускамоўную сяброўку. Магчыма стварэньне сям'і. А/с 6, 220012, Менск

**Андрэй Мельнікаў** з радасьцю сустрэне ўсялякую творчую чалавечнасьць у клюбе песьні, прозы і камэдыі «Радзімка». Т.: 0232-54-30-40, 522-91-97; электронныя адрасы: mielnikaw@inbox.ru, mielnik@tut.by

**Андрэй Мельнікаў** дапаможа вандраваць з Гомелю на камфартабэльным аўтобусе. Т.: 0232-54-30-40, 522-91-97; электронныя адрасы: mielnikaw@inbox.ru, mielnik@tut.by

### КНІГІ

**Буду ўдзячны**, калі хто прадасьць 4-ты том «Энцыкляпэдыі гісторыі Беларусі». Т.: 8-029-402-56-78. Аляксей

**Набуду** слоўнік Насовіча, слоўнік Ластоўскага, «Энцыклясэдыю Беларусі», кнігі па гісторыі, архітэктуры, фальклярыстыцы, ткацтве, аранамэнталістыцы, краязнаўстве. Т.: 229-27-89

**Беларускія кнігі** можна знайсьці на штодзённым кірмашы ў к/з «Менск», 10.00—18.00. Т.: 637-38-41

**Штонядзелю** рэдкія беларускія выданьні можна знайсьці на кніжным кірмашы ў Палацы культуры трактарнага заводу (станцыя мэтро «Трактарны завод»), 10.00—14.00

**Прадам ці абмяняю** кнігі па гістарычнай тэматыцы, розныя нумары газэт ды часопісаў. Дапамагу знайсьці патрэбную кнігу. Т.: 753-91-96

**Кніжку Юр'я Станкевіча** «Сатырыкон» з малюнкамі Алеся Пушкіна можна набыць у ТБМ і БНФ

**Штосераду** а 18-й на Румянцава, 13 (пл.Перамогі) зьбіраецца фан-клюб беларускай музыкі. Цікавыя сустрэчы, новыя знаёмствы, навіны, акцыі ў падтрымку айчыннай музыкі, магчымасьць набыць музыку на самых танных коштах і і шмат іншага! Усіх запрашаем!

**Штосуботу** з 11-й да 15-й у ДК МТЗ працуе гандлёва-абменная кропка беларускай музыкі. Прадукцыя па самых танных коштах.

**Шукаем распаўсюднікаў** беларускай музыкі. Зьвяртацца: 649-08-88, 766-24-25. А/с 5, 220085 Менск. w1979@tut.by

Набуду кнігу Б.Брэхта «На шалях праўды і хлусьні» (пер. Л.Баршчэўскага). Т.: 710-97-72

**Цікавіць інфармацыя**, дакумэнты, фота, зьвязаныя з Булак-Балаховічам, «Зялёным дубам», «Чорным катом», беларускай партызанкай, — набуду. E-mail: zmagar@yahoo.com. Т. 8-029-722-46-04

### ПРАЦА

**Пошук працы**: набор, пераклад, выкладаньне, выдавецкія праекты, падрыхтоўка рукапісаў, рэдактура, дызайн, распаўсюд, журналістыка, адміністрацыйная дзейнасьць. Электронны адрас: alesknigi@mail.ru

### ДЗЕ КУПІЦЬ «ARCHE»

**Найтаньней у Менску** — усяго за тры тысячы рублёў — часопіс «Arche» можна набыць у краме УП «Марат» па адрасе вул.Інтэрнацыянальная, 11а.

## НЯ РЭЖЦЕ ГАЗЭТУ!

Увага! Цяпер прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| карэктарка | Настасься Мацяш |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.

12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 3500. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 21.00 19.01.2005.

Замова № 310.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а